WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

7 СНЕЖНЯ 2011 г.
СЕРАДА
№ 233
(27097)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ТЭМП РОСТУ ВУП У БЕЛАРУСІ Ў 2012 ГОДЗЕ ПЛАНУЕЦЦА НА ЎЗРОЎНІ 105,2-105,5 ПРАЦЭНТА

Аб гэтым далажыў Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку 6 снежня прэм'ер-міністр краіны Міхаіл Мясніковіч, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

На пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў будуць разгледжаны канчатковыя праекты прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2012 год, бюджэту і асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі, удакладненых з улікам даручэнняў, дадзеных Прэзідэнтам на нарадзе 22 лістапада.

Так, рост валавога ўнутранага прадукту запланаваны на ўзроўні 105,2-105,5 працэнта. Урад лічыць, што замест запланаваных раней плюс $500 млн сальда знешняга гандлю Беларусі пад сілу крыху палепшыць гэты паказчык. За кошт росту экспарту, на думку ўрада, дадатнае сальда знешняга гандлю ў наступным годзе можа скласці $1,5 млрд, што будзе забяспечваць стабілізацыю на валютным і спажывецкім рынках і ў пэўнай ступені стрымліваць інфляцыйныя працэсы.

Прэзідэнт праінфармаваны таксама аб дасягнутых дамоўленасцях у час візіту прэм'ер-міністра ў М'янму і В'етнам і перагаворах з Казахстанам і Туркменістанам. У час візіту падпісана 15 пагадненняў міжурадавага, міжведамаснага характару, заключана 10 кантрактаў на суму $275 млн.

Аляксандр Лукашэнка даў даручэнні па механізме рэалізацыі дасягнутых дамоўленасцяў, у выніку якіх прадугледжваецца маштабнае ўваходжанне Беларусі на рынак Паўднёва-Усходняй Азіі. Кіраўнік дзяржавы асабліва акцэнтаваў увагу на тым, што неабходна ствараць сумесныя прадпрыемствы, адпаведную прадстаўніцкую інфраструктуру, каб праз капітал уваходзіць на рынак Паўднёва-Усходняй Азіі, не абмяжоўваючыся разавымі і эпізадычнымі пастаўкамі тавараў.

Акрамя таго, на сустрэчы ішла размова аб рабоце па фарміраванні кіруючых органаў АЭП. Цяпер ідзе размеркаванне функцыянальных паўнамоцтваў сярод службовых асоб, якіх плануецца накіраваць для работы ў гэтыя структуры, у тым ліку па квоце Беларусі.

Прэзідэнту таксама даложана аб выніках міжнароднага конкурсу, які праводзіўся па Петрыкаўскім радовішчы калійных солей. Кіраўнік дзяржавы даручыў унесці ў самы бліжэйшы час праект адпаведнага ўказа, каб да мая будучага года ўсе неабходныя дакументы, такія як крэдытнае пагадненне, інвестыцыйны дагавор і іншыя, былі прыняты ў пакеце і ўжо з другога паўгоддзя, а менавіта з мая будучага года пачалася практычная работа.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ДАРУЧЫЎ НАЦБАНКУ ПАДТРЫМЛІВАЦЬ СТАБІЛЬНАСЦЬ СІТУАЦЫІ НА ВАЛЮТНЫМ РЫНКУ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка па выніках рабочай сустрэчы 6 снежня са старшынёй Праўлення Нацыянальнага банка Надзеяй Ермаковай даручыў падтрымліваць стабільнасць сітуацыі на валютным рынку і работу эканомікі. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Кіраўнік Нацбанка далажыла Прэзідэнту аб стане спраў на валютным рынку, ліквіднасці ў банкаўскай сістэме, крэдытаванні эканомікі. «Сітуацыя на валютным рынку сёння спакойная. Насельніцтва прадае валюту. І з улікам таго, што беларускі рубель крыху ўмацоўваецца адносна долара, насельніцтва нават павялічыла продаж», — адзначыла Надзея Ермакова. Так, за перыяд пасля адкрыцця дадатковай сесіі на валютна-фондавай біржы 14 верасня насельніцтва прадало амаль $640 млн. З гэтай сумы банкі рэалізавалі на біржы $550 млн.

У сваю чаргу ўзраслі аб'ёмы абавязковага продажу валюты. Калі да ўвядзення адзінай сесіі штодзень прадавалася амаль $28 млн, то на сёння гэта лічба ў сярэднім складае $40-41 млн.

Апошнім часам у прадпрыемстваў і арганізацый напярэдадні канца года крыху павялічыліся патрэбнасці ў куплі валюты на пагашэнне крэдытаў. Тым не менш, паводле слоў кіраўніка Нацбанка, снежань у плане абстаноўкі на валютным рынку будзе спакойным, ёсць дастатковыя рэсурсы для задавальнення попыту з боку юрыдычных асоб.

Адбылося некаторае паляпшэнне ліквіднасці банкаўскай сістэмы. Нацыянальны банк скарачэнне падтрымку банкаў прыкладна на Br500 млрд.

Адзначаецца прыток у банкі ўкладаў фізічных асоб, як у беларускіх рублях, так і ў замежнай валюце. За лістапад дадаткова прыцягнута Br126 млрд і $60 млн у эквіваленце.

Надзея Ермакова таксама канстатавала, што эканоміка краіны крыху скараціла прыцягненне крэдытаў, што звязана з павышэннем стаўкі рэфінансавання і адпаведна ростам працэнтных ставак па крэдытах. Гэта рабілася Нацыянальным банкам наўмысна для таго, каб знізіць інфляцыйныя чаканні і ўтрымаць рост інфляцыі.

Што датычыцца крэдытавання насельніцтва, то ў краіне прадаўжаецца выдача льготных крэдытаў на будаўніцтва жылля. Толькі за лістапад іх было прадастаўлена Br800 млрд, якіх-небудзь праблем з рэсурсамі няма. Залатавалютныя рэзервы Беларусі ўмацаваліся ў сувязі з паступленнем $2,5 млрд ад продажу пакета акцый ААТ «Белтрансгаз». Нацбанк разлічвае, у тым ліку за кошт атрымання другога траншу ў памеры $440 млн з Антыкрызіснага фонду ЕўрАзЭС, выйсці на неабходныя аб'ёмы ЗВР, якія планаваліся на канец 2011 года.

АМАЛЬ ТРЭЦЬ РЭСПАНДЭНТАЎ АДЗНАЧАЮЦЬ ПАЛЯПШЭННЕ РАБОТЫ СУПРАЦОЎНІКАЎ ДЗЯРЖОРГАНАЎ, ЯКІЯ ВЯДУЦЬ ПРЫЁМ ГРАМАДЗЯН

Амаль трэць рэспандэнтаў (у сярэднім 29,5 працэнта) адзначаюць паляпшэнне ў 2011 годзе работы супрацоўнікаў дзяржаўных органаў, якія вядуць прыём грамадзян. Аб гэтым сведчаць вынікі праведзенага Інфармацыйна-аналітычным цэнтрам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі чарговага этапу сацыялагічнага маніторынгу «Меркаванне насельніцтва Беларусі аб стане работы па дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату», паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Больш як палавіна (у сярэднім 54,5 працэнта) лічаць, што канкрэтныя паказчыкі работы супрацоўнікаў дзяржорганаў (умовы для абслугоўвання насельніцтва, інфармаванне і прадастаўленне кваліфікаванай кансультацыі, прафесіяналізм і кампетэнтнасць, уменне працаваць з людзьмі, аператыўнасць у вырашэнні запытаў грамадзян, рэжым работы дзяржорганаў) практычна не змяніліся.

Аб пагаршэнні сітуацыі па разглядзе зваротаў грамадзян заяўляюць толькі 8 працэнтаў рэспандэнтаў.

Усяго апытаны 1 571 рэспандэнт ва ўзросце ад 18 гадоў і старэйшыя ва ўсіх абласных цэнтрах краіны і Мінску, раённых гарадах і сельскіх населеных пунктах.

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ИП «ХОРОС-ЦЭНТР»

Лот № 1. Машина для сортировки камней ГРОХОТ FINTEC 542, серийный номер 2007 542 463, двигатель № 33418299, вес 28 750 кг, расположенная по адресу: Брестская область, Лунинецкий район, г. Микашевичи, РУПП «Гранит», стоимостью 746 118 720 белорусских рублей с учетом НДС.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/, а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

Торги состоятся 27.12.2011 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Минец И.Н., тел.-факс: 294 93 66, ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк», Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ДЗЕТАК НАКОРМЯЦЬ НА ЎДВАЯ БОЛЬШУЮ СУМУ...

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Як паведамілі журналісту «Звязды» ў Міністэрстве адукацыі, пастановай Савета Міністраў № 1603 ад 26 лістапада 2011 года грашовыя выдаткі на харчаванне выхаванцаў і навучэнцаў устаноў адукацыі павялічыліся амаль удвая.

Нагадаем, што апошні раз сума выдаткаў на харчаванне ва ўстановах адукацыі змянялася сёлета 1 верасня, аднак тое павелічэнне было зусім сімвалічным — у сярэднім на 10 працэнтаў. Для прыкладу, норма харчавання ў дзетсадаўскай групе з працягласцю працоўнага дня 10,5 гадзіны складала тры апошнія месяцы ўсяго 5 930 рублёў і 7220 рублёў — у групе з 12-гадзінным знаходжаннем. Зразумела, што з улікам росту спажывецкіх цэн было даволі праблематычна забяспечыць рацыянальнае і збалансаванае харчаванне дзяцей за гэтыя сумы.

З пачатку бягучага тыдня грашовая норма на харчаванне дзетак у ясельных групах з працягласцю знаходжання там дзяцей 10,5 гадзіны складае 9 010 рублёў, 12 гадзін — 11 740 рублёў. У дзетсадаўскіх групах з працягласцю знаходжання 10,5 гадзіны харчаванне дзяцей будзе ажыццяўляцца з разліку 11 430 рублёў і 14 160 рублёў — у групах з 12-гадзінным знаходжаннем.

Адначасова з павелічэннем грашовых нормаў на харчаванне выхаванцаў дашкольных устаноў прапарцыянальна павялічылася і бацькоўская плата за дзіцячы садок. У Міністэрстве адукацыі падкрэсліваюць, што бацькі аплачваюць харчаванне сваіх дзяцей у дашкольных установах толькі на 40 працэнтаў, а 60 працэнтаў у харчаванні складаюць дзяржаўныя датацыі. Пэўны час таму гучалі прапановы па аптымізацыі ўдзелу бацькоў у аплаце харчавання дзяцей у дашкольных установах з улікам узроўню даходаў сям'і, аднак пакуль што ўсе бацькі ўносяць аднолькавыя сумы.

Трэба дадаць, што грашовыя нормы на харчаванне змяніліся таксама і ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі (пачатковых, базавых, сярэдніх школах, ліцэях, гімназіях і г.д.). У навучальных установах з працягласцю знаходжання 6-8 гадзін (з двухразовым харчаваннем) грашовая норма харчавання для навучэнцаў ва ўзросце ад 6 да 10 гадоў складае цяпер 8 820 рублёў, 11—13 гадоў — 10 050 рублёў, 14—17 гадоў — 10 660 рублёў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Замежныя стажыроўкі дзяржава аплаціць толькі самым перспектыўным студэнтам

Цяпер для таго, каб адправіцца на стажыроўку за мяжу, студэнты беларускіх ВНУ павінны будуць выканаць некалькі важных умоў. Па-першае, мець выдатную паспяховасць — сярэдні бал не ніжэйшы за 8 балаў па дзесяцібальнай шкале. Па-другое, абавязкова валодаць замежнай мовай на дастатковым узроўні для праходжання стажыроўкі. Па-трэцяе — атрымліваць адукацыю на дзённай бюджэтнай форме навучання. Такія патрабаванні змяшчаюцца ў пастанове Савета Міністраў № 1617 «Аб некаторых пытаннях навучання ў арганізацыях замежных дзяржаў» ад 30 лістапада 2011 года.

У галоўным адукацыйным ведамстве падкрэсліваюць, што падрабязны механізм накіравання студэнтаў і аспірантаў на стажыроўкі за мяжу распрацаваны ўпершыню. Адбор ахвотнікаў будзе праводзіцца ў два этапы. На першым этапе адбор будзе ажыццяўляцца саветамі (вучонымі саветамі) устаноў вышэйшай адукацыі, устаноў адукацыі і арганізацый, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы паслявышэйшай адукацыі. На другім этапе падключыцца Міжведамасная камісія па накіраванні на навучанне ў арганізацыях замежных дзяржаў у рамках атрымання вышэйшай і паслявышэйшай адукацыі.

Замежная стажыроўка можа доўжыцца ад некалькіх месяцаў да года, у залежнасці ад спецыяльнасці. Навучанне за мяжой для нашых грамадзян будзе аплачвацца за кошт сродкаў бюджэту.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Парламенцкі дзённік

БЕСПРАЦОЎНЫЯ, АЛЕ НЕ БЯСПРАЎНЫЯ

Папраўкі ў закон аб занятасці насельніцтва прыняты дэпутатамі ў першым чытанні

Узяты курс на рэструктурызацыю і мадэрнізацыю прадпрыемстваў, натуральна, цягне за сабой і аптымізацыю... колькасці супрацоўнікаў. Жыццё пасля страты работы, зразумела, не заканчваецца. Але якім яно будзе, на што мы можам разлічваць у выпадку чаго?

Заканадаўчыя новаўвядзенні, якія прэзентавала **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА**, прадугледжваюць павышэнне памераў стыпендый беспрацоўным, накіраваным на прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі. Памеры выплат вар'іруюцца ад дзвюх да васьмі базавых — у залежнасці ад падстаў звальнення. На максімальную кампенсацыю працаўнік можа разлічваць у выпадку ліквідацыі прадпрыемства, скарачэння.

Усе мы разумеем, што нават верхняя планка стыпендый для беспрацоўных у 8 базавых (280 тыс. рублёў) па цяперашніх цэнах — сума больш чым сціплая. Уцешна, што разумеюць гэта і народныя выбраннікі. «Пражыць на такую стыпендыю месяц вельмі складана», — справядліва заўважае дэпутат **Уладзімір ЗДАНОВІЧ** і пытаецца, ці зменіцца базавая велічыня.

Міністр пацвердзіла, што базавая насамрэч даўно не пераглядалася. Паводле яе інфармацыі, Мінфін зараз разглядае гэта пытанне. «Можа, і варта было б павысіць, — разважае М. Шчоткіна, — але не ўсё так проста: з ёй звязана і арэнда, шмат чаго іншага». Не выключаны другі сцэнар — увядзенне выплат з іншай велічынёй. Як варыянт — з бюджэтам пражыткавага мінімуму.

Падчас прафпадрыхтоўкі беспрацоўныя, паводле заканадаўства, атрымліваюць не толькі стыпендыі, але і права на пэўныя льготы: па аплаце праезду, жылля і некаторыя іншыя. Апроч правоў, прапісваюцца і абавязкі беспрацоўнага. Такі, напрыклад, як самастойны пошук працы, акцэнтуе міністр.

Наймальнікаў, у сваю чаргу, будуць стымуляваць да ўладкавання беспрацоўных. Заахвочваюцца і прэвентыўныя захады. Законапраект дае права органам занятасці цалкам або часткова аплачваць выдаткі наймальнікаў, якія накіроўваюць на прафесійнае навучанне працаўнікоў, што знаходзяцца пад пагрозай звальнення. Асобна прапісана магчымасць атрымаць спецыяльнасць для жанчын, якія даглядалі дзіця да трох гадоў і дагэтуль не працавалі.

Ёсць і нормы, што рэгламентуюць нюансы працаўладкавання за мяжой. Ні для каго з нас не навіна, што некаторыя беларусы зараз лічаць за лепшае падацца на будоўлю ў суседнія краіны. Са з'яўленнем АЭП з новага года магчымасцяў стане яшчэ больш.

Як спыніць адток рабочай сілы і што сабе думае ўрад, цікавіўся дэпутат **Георгій ДАШКЕВІЧ**: «Рост заробкаў налета на ўзроўні 3%, будаўніцтва жылля для малых гарадоў і райцэнтраў — неактуальнае, бо ад'язджаюць тыя, хто якраз яго мае... Якія іншыя захады плануе ўрад?».

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

8 снежня 2011 года ў 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) адбудзецца пасяджэнне сёмай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

БАНКІ ТОЛЬКІ РАЗМЯРКОЎВАЮЦЬ ФІНАНСАВЫЯ ПЛЫНІ

Адказнасць за несвоечасовае фінансаванне будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай ляжыць не на «Беларусбанку».

Пра гэта паведаміла журналістам старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па жыллёвай палітыцы, будаўніцтве, гандлі і прыватызацыі Галіна ПАЛЯНСКАЯ, калі гаварыла пра ролю банка ў рэалізацыі дзяржаўнай праграмы па льготным крэдытаванні жылля. ААТ «ААБ Беларусбанк» даручана ажыццяўляць выплаты, зыходзячы з тых дзяржаўных рэсурсаў, што паступаюць, і на тыя аб'екты жыллёвага будаўніцтва, якія зацверджаны аблвыканкамамі і Мінгарвыканкамам. Такім чынам, банкі толькі размяркоўваюць фінансавыя плыні, якія паступаюць з бюджэту. Аб гэтым сказаў у сваім выступленні 30 лістапада на Нацыянальным сходзе і міністр архітэктуры і будаўніцтва Анатоль Нічкасаў.

«Беларусбанк» працягвае ўдзельнічаць у рэалізацыі дзяржаўнай праграмы па жыллёвым будаўніцтве. Ільготныя крэдыты прадастаўляюцца грамадзянам у межах дзейнага заканадаўства. Сёлета банк выдаў ільготных крэдытаў на суму 6,5 трлн рублёў. Толькі ў лістападзе — 0,7 трлн рублёў. Усе мэтавыя рэсурсы накіраваны банкам на будаўніцтва жылых аб'ектаў у поўным аб'ёме. Па меры паступлення апошняй часткі гадавога аб'ёму, банк пералічыць іх на фінансаванне будаўніцтва аб'ектаў, што будуць уведзены ў эксплуатацыю яшчэ сёлета.

Святлана БАРЫСЕНКА.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ТАРЫФЫ НА ПРАЕЗД У ГРАМАДСКІМ ТРАНСПАРЦЕ МІНСКА ЗАМАРОЖАНЫ

У Мінску кошт праезду ў грамадскім транспарце павышаць да канца года не плануецца. Аб гэтым БЕЛТА паведаміў дырэктар дзяржаўнай установы «Сталічны транспарт і сувязь» Валерый ШКУРАТАЎ.

«Цяпер пытанне аб павышэнні кошту праезду ў камунальным пасажырскім транспарце сталіцы не разглядаецца. Ні транспартнае камунальнае ўнітарнае прадпрыемства «Мінсктранс», ні «Сталічны транспарт і сувязь» не накіроўвалі адпаведных прапаноў у Міністэрства эканомікі. Пакуль тарыфы на праезд у грамадскім транспарце Мінска замарожаны», — сказаў Валерый Шкуратаў.

Паводле яго слоў, да разгляду злабадзённага для ўсіх пытання транспартнікі сталіцы маюць намер вярнуцца ў 2012 годзе.

КІРОЎЦА МАЗа, ГРУЖАНАГА БУДМАТЭРЫЯЛАМІ, СПЯШАЎСЯ ТАК, ШТО «ЗГУБІЎ» БЕТОННУЮ ПЛІТУ

Незвычайнае ДТЗ адбылося раніцай 6 снежня на мінскай кальцавой аўтадарозе. Кіроўца МАЗа, гружанага бетоннымі плітамі, не разлічыў хуткасць, і адна з жалезабетонных канструкцый упала на дарогу і пашкодзіла аўтамабіль, які рухаўся па сустрэчнай паласе.

Старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Заводскага раёна сталіцы Анастасія Крахціна паведаміла, што ў 8.40 раніцы на з'ездзе з кальцавой на Партызанскі праспект кіроўца МАЗа на павароце не разлічыў хуткасць. Адна з бетонных пліт упала з платформы і пашкодзіла аўтамабіль «Опель», якім кіравала жанчына на сустрэчнай паласе. На шчасце, ніхто не пацярпеў. Як высветлілася, груз быў не замацаваны. Падняць пліту на платформу ўдалося толькі з дапамогай аўтакрана. Вядзецца разбор, які высветліць, ці перавышаў кіроўца МАЗа хуткасць і чаму не паклапаціўся аб надзейным замацаванні грузу.

У МІНСКУ ЗДЗЕЙСНЕНЫ РАЗБОЙНЫ НАПАД З ЭЛЕКТРАШОКЕРАМ НА КІРОЎЦУ

У сталіцы на кіроўцу аўтамабіля, які вырашыў падвезці маладога чалавека, здзейснена разбойнае нападзенне.

— 4 снежня 27-гадовы жыхар Мінскага раёна каля 12 гадзін ночы вяртаўся на сваім аўтамабілі ад брата і ехаў па вуліцы Прытыцкага. На ўзбочыне ўбачыў хлопца, які «галасаваў», і вырашыў яго падвезці, — расказвае прэс-афіцэр Партызанскага РУУС сталіцы Ганна Чыж-Літаш. — Малады чалавек паабяцаў добра заплаціць, і кіроўца адвёз яго на вуліцу Карвата, 78. Падчас разліку хлопец працягнуў кіроўцу 100-тысячную купюру, і апошні дастаў кашалёк, каб аддаць 20 тысяч рэшты. У гэты момант пасажыр нечакана ўдарыў яго ў вока электрашокерам.

Нападнік выхапіў кашалёк, дзе знаходзілася каля 300 тысяч рублёў і дакументы, і знік, а кіроўца звярнуўся ў бліжэйшы аддзел па надзвычайных сітуацыях, дзе яму і выклікалі «хуткую». Стан маладога чалавека ацэньваецца як цяжкі: пашкоджаным вокам ён не бачыць.

Заведзена крымінальная справа за разбойнае нападзенне. Міліцыя шукае злачынцу і распаўсюдзіла яго прыкметы. Гэта мужчына еўрапейскай знешнасці, на выгляд 20-25 гадоў, рост 165-170 см, хударлявага целаскладу, валасы цёмна-русыя, доўгія, сабраныя ў пучок за галавой, быў апрануты ў карычневую куртку да пояса, шэрую байку з капюшонам, чорныя штаны і чаравікі. Усіх, хто што-небудзь ведае пра злачынства, міліцыя просіць звяртацца ў Партызанскае РУУС асабіста або па тэлефоне 230 34 34.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ДЭТЭКТЫЎ ХУТКА ЗАКОНЧЫЎСЯ

Днём зазірнуў у краму вёскі Халоднікі Калінкавіцкага раёна вучань 10-га класа. Як расказала старшыня Даманавіцкага сельсавета Ларыса Зайцава, школьнік, які жыве ў Калінкавічах у прыёмнай сям'і, запатрабаваў грошы ў прадавачкі з дапамогай нажа, які схапіў з прылаўка. 38-гадовая жанчына не разгубілася, пхнула падлетка ў грудзі, сама выбегла з крамы, якую звонку паспела зачыніць. Такім чынам міліцыя затрымала малалетняга злодзея, які сам трапіў у пастку.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ВИТЕБСКОЙ ОБЛАСТИ

ОБЪЯВЛЕНИЕ о торгах

Наименование (описание) имущества	Лот № 1. Изолированное помещение с инв. №200/D-125122, расположенное по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, аг. Новка, ул. Центральная, 12а-1, площадью 109,5 кв.м., назначение – помещение многофункциональное, наименование – парикмахерская, мастерская по ремонту обуви, мастерская по ремонту одежды, ритуальные услуги – стоимостью 122 990 400 белорусских рублей (с учетом НДС). Изолированное помещение с инв. №200/D-125126, расположенное по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, аг. Новка, ул. Центральная, 12а-2 площадью 146,0 кв.м, назначение – помещение многофункциональное, наименование – магазин, склады – стоимостью 134 553 600 белорусских рублей (с учетом НДС).
Собственник (владелец) имущества	КУП ОБУ «Витрайбыт» (г. Витебск, ул. Ленинградская, 4, УНП 300064006).
Местонахождение (адрес) имущества	Витебский район, Новкинский с/с, аг. Новка, ул. Центральная, 12А.
Стоимость имущества	Лот № 1 – 257 544 000 белорусских рублей (с учетом НДС).
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Хозяйственный суд Витебской области г. Витебск, ул. «Правды», 32 23 декабря 2011 в 14.00.
Справочная информация	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 324, http:// vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель: Халков Дмитрий Вячеславович, тел. факс (80212) 49 13 42, (8 029) 150 24 10 Старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, не позднее 22.12.2011. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Павіншуйце
Вашых партнёраў
з Новым годам і Калядамі!
Сэрвіс друку
НАВАГОДНІХ
фірменных ПАШТОВАК
InterPrint.by
офіс (017) 298 41 68
МТС (029) 775 57 18
Мабільныя тэлефоны SNAMI® SNAMI.BY
ООО «ТЦ СНАМІ» УНП 100705382

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.12.2011 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	8 560,00	1 чэшская крона	454,52
▼1 еўра	11 420,00	1 польскі злоты	2 565,56
1 латвійскі лат	16 414,19	▼1 расійскі рубель	275,00
1 літоўскі літ	3 316,29	1 украінская грыўня	1 067,27

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	31,1026
10 UAH	38,7798
10000 BYR	36,3348
EUR	41,5842

Агенства ўладальнікаў гранкоў

Парламенцкі дзённік

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Вядома ж, сёння трэба зацікавіць чалавека працаваць тут, — пагаджаецца міністр працы і сацыяльнай абароны.

Аднак да сітуацыі трэба падыходзіць, паводле яе слоў, вельмі ўзважана. Паводле звестак, якімі валодае міністр, за 9 месяцаў летась з краіны выехаў па працоўных дагаворах 4821 чалавек, а сёлета за той жа час — 4565.

Пры гэтым уехала ў Беларусь за такі ж перыяд 2010 года — 4634 чалавекі, 2011-га — 6677 (з іх больш як 400 — гэта кіраўнікі і высокакваліфікаваныя кадры, удакладняе М. Шчоткіна). Але ж давайце глядзець праўдзе ў вочы, хіба ўсе з'язджаюць па працоўных дагаворах?! Верагодна, рэальныя лічбы намалююць нам абсалютна супрацьлеглую карціну...

Але ёсць у міністэрства і іншы аргумент — там, дзе заробкі вышэйшыя, большыя і выдаткі. М.Шчоткіна правяла паралель з Расіяй: «Так, заробкі там вышэйшыя, але і цэны там абсалютна іншыя». Тым часам, у Беларусі, маўляў, таксама ёсць месцы, дзе можна зарабляць. Паводле звестак міністра, на адным сталічным прадпрыемстве, назву якога яна агучваць не стала, сярэдні заробак складае 10 млн рублёў. А сярэдні заробак у 6 млн рублёў дык наогул — цяпер выпадак не адзінкавы. «Заробак, яго пакупніцкая здольнасць, сацпакет — іншых шляхоў утрымаць людзей няма», — рэзюмуе кіраўнік ведамства.

ВЫСОКІЯ ТЭХНАЛОГІІ

Закон аб дзяржаўнай інавацыйнай палітыцы закладзе прававую базу для галіны

Доўгачаканы праект яго паспяхова прайшоў першае чытанне ў ніжняй палаце парламента. Там з'яўляецца паняцце інавацыйных тавараў, што, на думку **Анатоля СІЛЬЧАНКІ, намесніка старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях,** дазволіць зарыентаваць дзяржаўную падтрымку на праекты, эфектыўныя ў камерцыйным плане. У якасці палёгкі прадугледжваецца, што даход ад рэалізацыі інавацыйных тавараў (у аднаведнасці з пералікам, які вызначыць Саўмін) будзе вызваляцца ад падатку на прыбытак. Такі ж бонус атрымаюць і высокатэхналагічныя тавары. Дакумент арыентаваны таксама на развіццё венчурнай дзейнасці (неапрабаваных, звязаных з рызыкай новых праектаў). Праект закона «закладзе прававыя асновы для выхаду беларускай эканомікі на якасна новы ўзровень тэхналагічнага развіцця», перакананы А. Сільчанка.

Дакумент арыентуе на дзяржаўна-прыватнае партнёрства ў інавацыйным сектары. Залучэнне прыватнага капіталу, натуральна, пасадзейнічае больш шырокаму ўкараненню навуковых распрацовак. У першую чаргу дробнага бізнэсу. Паколькі менавіта ён, з прычыны сваёй мабільнасці, можа хутка даводзіць напрацоўкі да таварнага выгляду. Стымуляваць інтарэс бізнэсу да выканання інавацыйных праектаў, якія фінансуюцца з бюджэту, будуць матэрыяльна. Рэзерваваннем сродкаў у памеры не менш 10% ад агульнага аб'ёму фінансавання такіх праектаў. Распрацоўшчыкі разлічваюць, што гэта будзе садзейнічаць прыцягненню малога і сярэдняга прадпрымальніцтва да ўдзелу ў рэалізацыі дзяржаўнай інавацыйнай палітыкі.

Галоўнае месца ў працэсе стварэння інавацый займаюць усё ж навукоўцы, перакананы **дэпутат Мікалай КАЗАК** (які і сам, зазначым, навукоўца: на яго «рахунку» — каля 40 вынаходак). І менавіта ім павінна быць нададзена найвялікшая ўвага ў законапраекце. Узнагароджанне аўтараў, паводле распрацаванага дакумента, складзе 10% гадавога прыбытку, атрыманага ад рэалізацыі інавацыйнай прадукцыі ці паслуг.

У МЕТРО МОЖНА ЕЗДЗІЦЬ СПАКОЙНА?

Дэпутаты таксама падтрымалі ў першым чытанні папраўкі ў некаторыя законы па пытаннях абарачэння зброі і здзяйснення ахоўнай дзейнасці. У выпадку іх прыняцця ў беларускім заканадаўстве з'явіцца паняцце агнястрэльнай траўматычнай зброі. Абарачэнне яе на тэрыторыі краіны будзе абмежавана.

Прапануецца таксама скараціць пералік падстаў, якія забараняюць набыццё зброі, паколькі на сёння ён досыць вялізны, туды ўваходзіць нават курэнне ў грамадскіх месцах. Але ж відавочна, што менавіта гэтае адміністрацыйнае правапарушэнне вялікай грамадскай небяспекі не ўяўляе.

Дазволяць набываць і захоўваць на тэрыторыі краіны грамадзянскую зброю і боепрыпасы таксама і замежным грамадзянам, асобам без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Беларусі. Павышанай небяспекі праваахоўнікі ў гэтым не бачаць. «Да нас прыязджае на пастаяннае месца жыхарства мноства грамадзян з Расіі, Украіны, якія шмат гадоў былі паляўнічымі. Тут яны не мелі права валодаць зброяй. Цяпер мы яго даём. На пенсіі гэта хобі для чалавека. На наш погляд, парушэнняў з іх боку не будзе. Мы атрымліваем іх асабістыя справы, бачым, што гэта за людзі», — патлумачыў **намеснік міністра ўнутраных спраў Яўген ПОЛУДЗЕНЬ**, які прадстаўляў законапраект у Авальнай зале.

Адказваючы на пытанні журналістаў, ён распавёў і пра тое, як рупліва ахоўваецца сталічнае метро. «У свеце метро прызнана самым неабароненым ад тэрарыстычных актаў месцам», — канстатуе намеснік міністра. У беларускім метро пасля тэракта колькасць асабовага складу для аховы станцый павялічана, калі нехта нясе грувасткія рэчы, яго даглядаюць. Утворана ў метро і свая служба аховы. У час пік да аховы метро падключаюцца супрацоўнікі падраздзяленняў міліцыі спецпрызначэння. Працуюць нават супрацоўнікі ў цывільным, як паведаміў Я.Полудзень. Праводзіцца выбарачнае суправаджэнне вагонаў. Аснашчэнне ж метро больш сучаснай сістэмай відэаназірання — гэта пытанне фінансаў, а значыць, і часу...

Ала МАЧАЛАВА.

ГЮНЕШ І ВІННІКАВА ПРАЙШЛІ, ДАРАФЕЕВА І КАЛДУН — НЕ

БТ назвала паўфіналістаў «Еўрафэсту»

Уаўторак сталі вядомыя імёны 15 паўфіналістаў конкурсу «Еўрафэст», якіх выбіралі больш чым з сотні прэтэндэнтаў. Адбор праходзіў у два этапы. У першым артысты спявалі перад журы на сцэне (гл. «Звязду» за 6 снежня), у другім — журы адсочвала ўжо тэлевізійную карцінку выступлення — як спявак умее трымацца перад камерай. Паўфінал пройдзе ў прамым эфіры 21 снежня.

Аляксандра Гайдукі Наталля Балдзіна.

ХТО ПРАЙШОЎ?

У паўфінал трапілі як масцітыя артысты, так і малавядомыя спевакі. Адбор прайшлі **Гюнеш** (сцэнічнае імя GUNESH), гурт **«Litesound», Анастасія Віннікава, Юзары** (сцэнічнае імя UZARI), **Вікторыя Алешка** і заслужаная артыстка Беларусі **Алена Ланская**. Кампанію ім складуць **Аўра, Ганна Благава, ГЕРМАН,** гурты **«Эквокі», The Champions,** дуэт **Аляксандры Гайдук і Наталлі Балдзінай**.

Сярод новых імёнаў — гурты **Thriller, Nuteki, Ян Жэнчак** і гурт **Outerplain**.

Паўфіналісты вызначаны, аднак пасяджэнні журы па банку песень яшчэ не праводзілася. Паводле слоў кіраўніка праекта «Еўрабачанне-2012», **выканаўчага прадзюсара тэлеканала «Беларусь 1» Дзмітрыя Баранава,** апошнія заяўкі яшчэ працягваюць прыходзіць.

Каментуючы выбраных артыстаў, кіраўнік праекта «Еўрафэст» Аляксандр Ціхановіч зазначыў, што Litesound, напрыклад, «маюць сваё гучанне і бездакорную англійскую мову», гурт «Эквокі» быў выбраны найперш за «прафесійную аранжыроўку», а Анастасія Віннікава прайшла дзякуючы фарматнай песні: хоць і «былі пытанні, але журы прагаласавала «за».

ХТО ГЭТЫЯ ЛЮДЗІ?

Ганна Благава — артыстка з колішнім псеўданімам Аніка, працавала ў тэатры Ірыны Дарафеевай. Выступала на конкурсе маладых выканаўцаў «Віцебск-2007» (4 месца). У 2009-м артыстка спрабавала прабіцца на «Новую хвалю», аднак тады на конкурс паехаў Іван Вабішчэвіч (Дзядзя Ваня). Два гады таму Ганна Благава ўжо ўдзельнічала ў «Еўрафэсце», дзе ў дуэце з Юрыем Вашчуком прайшла ў 15 лепшых.

Юзары (сапр. імя Юрый Наўроцкі) — прадстаўнік Беларусі на конкурсе маладых выканаўцаў «Новая хваля-2011» у Юрмале, дзе заняў 10 месца. У маі 2011 года ў складзе бэк-вакала Анастасіі Віннікавай удзельнічаў у «Еўрабачанні-2011» у Дзюсельдорфе.

Алена Ланская — уладальніца Гран-пры на конкурсе маладых выканаўцаў «Славянскі базар-2011». Сёлета ў лістападзе артыстцы было прысуджана званне заслужанай артысткі Беларусі.

Thriller — гурт, арганізаваны кампазітарам Іванам Луцэнкам. Салістка гурта — Алёна Гарбачова, бэк-вакалістка праекта АНТ «Я спяваю» (1 сезон). Разам з Юзары ўваходзіла ў склад бэк-вакалу Анастасіі Віннікавай на «Еўрабачанні-2011» у Дзюсельдорфе.

Аўра — музычны праект кампазітара Яўгена Алейніка, салісткай якога выступае яго жонка Юлія Быкава. Юля — аўтар-песеннік, ёй належыць у т.л. і аўтарства рускамоўнага і беларускамоўнага тэксту песні Анастасіі Віннікавай «I love Belarus», з якой Віннікава прадстаўляла Беларусь на «Еўрабачанні-2011».

Герман — псеўданім артыста і тэлевядучага Дзмітрыя Карпінчыка. Экс-артыст прадзюсарскага цэнтра «Спамаш», у які трапіў дзякуючы перамозе ў конкурсе маладых выканаўцаў тэлеканала СТБ «Зорны дыліжанс». Удзельнічаў у тэлепраектах «Народны артыст» , «Сакрэт поспеху» і латвійскім рэаліці-шоу «HELLO, JURMALA!».

The Champions — праект у складзе артыстаў Nils і Olisa. Паўфіналісты «Еўрафэста-2008».

Nuteki — малады маскоўскі гурт, удзельнікі якога — ураджэнцы Беларусі — раней ігралі ў музбэндзе «K+FA».

Outerplain — малады калектыў, салістам якога з'яўляецца Ян Жэнчак — экс-саліст «Песняроў» пад кіраўніцтвам Леаніда Барткевіча. Былы бэк-вакаліст Пятра Ялфімава, вакаліст гурту «Лявоны».

Алена Ланская.

У склад прафесійнага журы ўвайшлі артысты Аляксей Хлястоў, Іна Афанасьева, Аляксандр Ціхановіч, Анатоль Ярмоленка, Мікалай Скорыкаў, кампазітары Ленід Шырын, Яўген Алейнік, Юрый Вашчук, харэограф Аляксандр Мяжэнны і прадзюсар тэлеканала «Беларусь-1» Дзмітрый Баранаў.

ХТО НЕ ПРАЙШОЎ?

Праз сіта паўфіналу не ўдалося прабіцца заслужанай артыстцы Беларусі Ірыне Дарафеевай, Георгію Калдуну, Іскуі Абалян, спявачцы Venera, сумесnaму праекту Веры Карэтнікавай з гуртам «Тяни-Толкай», Івану Буслаю, гуртам «Дразды», «Вецер у галаве», «No commend Band» і іншым.

— Спрэчкі былі вельмі гарачымі, — расказвае Аляксандр Ціхановіч. — Аднак бачыць у праекце побач з маладымі выканаўцамі і вядомых артыстаў было прыемна. Між іншым, не варта забывацца, што гэта перш за ўсё конкурс песні. Калі Ірына Дарафеева не прайшла — гэта значыць проста тое, што яе песня — не падыходзіць для гэтага конкурсу.

Ілья ЛАПАТО.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Гурт Nuteki.

Анастасія Віннікава.

БЕЛАРУСКІЯ ЎРАЧЫ ЎПЕРШЫНЮ ІМПЛАНТАВАЛІ МАЗГАВЫ ЭЛЕКТРАСТЫМУЛЯТАР

Упершыню ў Беларусі на базе мінскай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі прайшла імплантацыя электрастымулятара ў глыбінныя структуры галаўнога мозга. Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведаміў намеснік дырэктара па навуцы Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неўралогіі і нейрахірургіі Юрый Шанько.

Стымулятар быў усталяваны пацыенту, які пакутуе ад хваробы Паркінсона. Кошт аднаго такога прыбора і камплекта расходных матэрыялаў даходзіць да 25 тыс. еўра. «Да канца года мы маем намер імплантаваць яшчэ дзесяць стымулятараў, а з 2012-га такія аперацыі будуць праводзіцца ўсім, каму яны паказаныя», — адзначыў Юрый Шанько.

Так, устаноўка стымулятараў будзе праводзіцца для лячэння пацыентаў з дыягназам «мышачная дыстанія». У цяперашні час у лісце чакання на ўстаноўку прыбора знаходзяцца каля 100 чалавек. Для грамадзян Беларусі аперацыя будзе бясплатнай. У далейшым беларускія нейрахірургі гатовыя выконваць падобныя ўмяшанні і для пацыентаў з-за мяжы.

Імплантацыя стымулятара займае ў сярэднім ад 2 да 6 гадзін. Даволі шмат часу ідзе на падрыхтоўку пацыента, а таксама праграмаванне, калі на спецыяльным абсталяванні з выключнай дакладнасцю вылічваецца месца, куды неабходна ўсталяваць прыбор. Гэтая аперацыя з разраду стэрэатаксічных, якія ў Беларусі, дарэчы, паспяхова праводзяцца на працягу некалькіх апошніх гадоў. Тым не менш да першай імплантацыі стымулятараў беларускія спецыялісты рыхтаваліся доўга, праходзілі стажыроўку ў венгерскіх, расійскіх і швейцарскіх клініках.

БЕЛТА.

Абзац

Трактар збіў пажылую жанчыну на пешаходным пераходзе ў Мінску. ДТЗ адбылося ўдзень на скрыжаванні вуліц В. Харужай і М. Багдановіча. МТЗ-82 з прычэпам паварочваў направа на зялёны сігнал святлафора і збіў жанчыну 1926 года нараджэння, якая пераходзіла дарогу па пешаходным пераходзе таксама на зялёнае святло. Пацярпелую шпіталізавалі ў рэанімацыю. Медыкі дыягнаставалі ў яе адкрытую чэрапна-мазгавую траўму цяжкай ступені, удар галаўнога мозгу, пералом патылічнай косткі з пераходам на аснову чэрапа, а таксама ўдар жывата.

Поўны абзац

Памежнікі выявілі ў цягніку, што рухаўся з Казахстана ў Расію, мех кантрабандных кошак. Інцыдэнт адбыўся ў Арэнбургзе. Мех ускрываць не сталі з меркаванняў бяспекі — на думку ветэрынара, жывёлкі маглі быць пераносчыкамі разнастайных інфекцый. Мех з кошкамі агледзелі супрацоўнікі Рассельгаснагляду. Па факце былі аформленыя дакументы аб абавязковым ветэрынарным аглядзе грузу, а таксама аб адпраўцы яго назад у Казахстан. Пра лёс кошак пасля вяртання на станцыю адпраўлення нічога не паведамляецца. Няма інфармацыі і пра перавозчыка незвычайнага грузу.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ЗНІЖЭННЕ РЭЙТЫНГАЎ ЕЎРАПЕЙСКІХ КРАІН — ПА ЗАКАЗЕ ЗША?

Учора па інтэрнэце разляцелася навіна аб тым, што міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Standart & Poor's прыняло рашэнне аб пераглядзе з магчымасцю паніжэння доўгатэрміновых рэйтынгаў 15 краін еўразоны. Гэты факт пракаментаваў «Звяздзе» дэкан эканамічнага факультэта БДУ прафесар Міхаіл КАВАЛЁЎ.

— Рэйтынг быццам бы міжнародных рэйтынгавых агенцтваў, якія па сутнасці належаць ЗША, адлюстроўваюць пункт гледжання Злучаных Штатаў, — кажа эксперт. — У канкурэнтнай барацьбе з Еўропай апошнім часам імкліва зніжаюць рэйтынгі еўрапейскіх дзяржаў. Я не думаю, што гэта адэкватна. На мой погляд, сёння самы нізкі рэйтынг павінны мець самі ЗША з дзярждоўгам большым за гадавы ВУП. Але трэба сумленна прызнаць, што і ў еўрапейскіх краін таксама сітуацыя не нашмат лепшая. І мы ўсе павінны дакладна і ясна разумець, што праблемы сучаснага свету ўзніклі праз тое, што насельніцтва развітых краін Еўропы, ЗША хацела жыць лепш, чым зарабляла, чым вырабляла прадуктаў. У асноўным прадукцыю пастаўлялі кітайцы — апраналі, абувалі і нават давалі мабільныя тэлефоны. У рэшце рэшт аказалася, што знешні доўг гэтых краін, у першую чаргу Кітаю і нафтаздабываючым краінам, вельмі значны. Зараз адбываецца істотная карэкцыя поглядаў на тое, хто ёсць хто ў свеце. Чым яна скончыцца, ніводзін палітык, ніводзін эканаміст пакуль сказаць не можа. Хтосьці кажа, што гэта захад еўраатлантычнай і пад'ём азіяцкай цывілізацыі. Некаторыя думаюць інакш. Я не прымаю пункта гледжання ні тых, ні другіх, але хацеў бы звярнуць увагу, што сітуацыя ў свеце зараз архіцяжкая. А што тычыцца рэйтынгавых агенцтваў, то прыйшоў час разбурыць манаполію ЗША на рэйтынгавую інфармацыю. Павінны з'явіцца рэйтынгавыя агенцтвы азіяцкія, краін БРІК (*Бразілія, Расія, Індыя, Кітай* — **Аўт**.), якія незалежна, з розных пунктаў гледжання змогуць асвятліць існуючыя праблемы.

Дарэчы, у лік 15 краін, што паставілі на перагляд, уваходзяць краіны з найвышэйшым рэйтынгам «ААА»: Францыя, Германія, Аўстрыя, Фінляндыя, Нідэрланды і Люксембург. А яшчэ — таксама пасля заявы Standart & Poor's — вырас курс долара да еўра.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

DEUTSCHE BANK НАЗВАЎ ДЗЕСЯЦЬ ГАЛОЎНЫХ ПАГРОЗ СУСВЕТНАЙ ЭКАНОМІЦЫ

Deutsche Bank апублікаваў прагноз развіцця сусветнай эканомікі на 2012 год, у якім назваў дзесяць самых значных рызык для стабільнасці міжнароднай фінансавай сістэмы. У ліку галоўных пагроз аналітыкі банка назвалі выхад Грэцыі з еўразоны, складанасці з рэфінансаваннем даўгоў Італіі і Іспаніі, а таксама зніжэнне рэйтынгу і/ці паўторную рэцэсію ў ЗША.

Аналітыкі банка пішуць, што не вераць у выхад Грэцыі з валютнага саюза. У выпадку, калі гэта ўсё ж адбудзецца, за вяртаннем да драхмы настане крах усяго банкаўскага сектара Грэцыі, а ВУП краіны абваліцца на 30% ці больш.

Сярод іншых пагроз Deutsche Bank вылучае магчымую страту Францыяй максімальнага крэдытнага рэйтынгу, запаволенне тэмпаў росту эканомікі Кітая да 5-6%, скарачэнне крэдытнай нагрузкі еўрапейскіх банкаў, крызіс ліквіднасці на рынку сыравінных тавараў, памяншэнне аб'ёму надзейных актываў і рэзкае павелічэнне пенсійнага дэфіцыту ў ЗША.

У цэлым Deutsche Bank разглядае 2012 год як больш спрыяльны для сусветных рынкаў, чым бягучы. Аналітыкі прадказваюць павелічэнне значнасці юаня ў сусветным гандлі, паступовае паскарэнне росту ў развітых краінах, які будзе суправаджаць больш высокая інфляцыя.

ЗША ПРЫЗНАЛІ ФАКТ СТРАТЫ САКРЭТНАГА БЕСПІЛОТНІКА Ў ІРАНЕ — ТЭГЕРАН РЫХТУЕЦЦА ДА ВАЙНЫ

Іранскія вайскоўцы могуць атрымаць звесткі пра сакрэтныя тэхналогіі амерыканскага беспілотніка, які быў збіты над тэрыторыяй Ірана, паведамляе тэлерадыёкампанія BBC са спасылкай на прадстаўніка Пентагона Джона Кірбі. У Іране тым часам ужо пачалі рыхтавацца да вайны.

Як паведамлялася раней, сакрэтны амерыканскі беспілотнік RQ-170 Sentinel быў збіты паблізу мяжы з Афганістанам. У ЗША настойваюць на тым, што апарат проста згубіўся, а іранскія вайскоўцы сцвярджаюць, што ён быў збіты пасля таго, як парушыў паветраную прастору іх краіны. RQ-170 Sentinel стаў першым амерыканскім беспілотнікам, страчаным над тэрыторыяй Ірана. Хваляванні ў ЗША з нагоды яго далейшага лёсу цалкам відавочныя — апарат створаны з выкарыстаннем тэхналогіі Stealth — радыёлакацыйным сістэмам цяжка вызначыць месцазнаходжанне лятальнага апарата з-за яго формы і выкарыстаных у ім тэхналогій. Звычайна гэтыя беспілотнікі выкарыстоўваюцца толькі ў сакрэтных і небяспечных аперацыях.

У Тэгеране ўжо заявілі, што «Іран не пацерпіць незаконнага пранікнення на сваю тэрыторыю», і на ўсю моц рыхтуюцца да магчымага ўварвання. У прыватнасці, камандуючы іранскім Корпусам вартавых ісламскай рэвалюцыі генерал Махамед Алі Джаафары абвясціў «гатоўнасць нумар 1» да адкрытага нападу з боку знешняга праціўніка, піша NEWSru Israel са спасылкай на брытанскую газету The Telegraph.

Вярхоўны лідар Ірана аятала Алі Хаменеі аддаў загад іранскім узброеным сілам, разведцы і службам бяспекі прыняць усе неабходныя меры для абароны іранскай дзяржавы ад знешніх пагроз, сцвярджае выданне. Гаворка ў першую чаргу ідзе пра сакрэтную перадыслакацыю ракетных баз. Генерал Джаафары распарадзіўся рассяродзіць арсенал балістычных ракет «Шыхаб» па сакрэтных базах па ўсёй краіне, каб ускладніць праціўніку задачу па знішчэнні ракетнага арсенала Ірана. Акрамя таго, ваенна-паветраныя сілы Ірана сфарміравалі «эскадрыллі хуткага рэагавання», якія зараз на вучэннях адпрацоўваюць супрацьдзеянне нападу праціўніка з паветра. Усяго ў арсенале Ірана ёсць некалькі тыпаў балістычных ракет, здольных даляцець да тэрыторыі Ізраіля.

ПЛЁТКІ ПАЛЯПШАЮЦЬ НАСТРОЙ І КАРЫСНЫЯ ДЛЯ ЗДАРОЎЯ?



Такую выснову зрабілі псіхолагі. Эксперты падлічылі: 85% жанчын атрымліваюць задавальненне, выслухваючы падрабязнасці чужога жыцця, а кожнай дзясятай цяжка захоўваць таямніцу, піша The Telegraph.

Прытым абмеркаванне апошніх плётак павялічвае пачуццё адзінства з социумам і адчуванне дабрабыту. Паводле слоў доктара Коліна Гіла, плёткі актывізуюць выпрацоўку гармонаў накшталт сератаніна, змяншаюць ступень стрэсу і трывожнасці.

Да таго ж нярэдка плеткары смяюцца. А гэта пазітыўна адбіваецца на стане здароўя. З пункту гледжання эвалюцыі, плёткі дапамагаюць сабраць карысную інфармацыю пра паводзіны, характары іншых людзей, сцвярджаюць навукоўцы з Гарвардскага ўніверсітэта. Гэта дапамагае нам засцерагчыся ад ненадзейных людзей, жыць у вялікіх групах, зразумець, якія паводзіны адэкватныя для пэўнай групы.

А ў крыві — 1,9 праміле алкаголю...

Калі па выкліку раніцай на пажар прыватнага дома ў вёсцы Пудоўня Дрыбінскага раёна прыбылі падраздзяленні МНС, відавочнага гарэння не назіралася, хоць у жыллі было шчыльнае задымленне. Аднак, па словах суседзяў, унутры дома знаходзіўся гаспадар...

Яго знайшлі на выхадзе з жылля. Рабочы сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва «Домановы», грамадзянін 1962 года нараджэння, пражываў адзін. Суседзямі характарызаваўся здавальняюча. Калі пацярпелага агледзеў урач Пудаўнянскай участковай бальніцы, высветлілася, што стан мужчыны — здавальняючы, у шпіталізацыі ён не мае патрэбы. А вось пасля ў яго крыві было выяўлена 1,9 праміле алкаголю...

Сяргей РАСОЛЬКА.

У кантрактах пра людскасць не пішуць...

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

НЯДАЎНА ў рубрыцы «Гарачы» тэлефон мы закраналі тэму рытарычных пытанняў. На якія быццам бы і адказ можна даць, толькі... Толькі ён, той адказ, ужо загадзя вядомы. Аднак і ўвогуле замоўчваць праблемы, што турбуюць чытачоў, таксама нельга. Памятаеце: вада камень точыць? Калі не атрымліваецца сёння вырашыць па шэрагу прычын нейкае пытанне, гэта не азначае, што з цягам часу гэтага нельга будзе зрабіць, так? Наш чарговы заяўнік з Лідскага раёна закрануў тэму працоўных кантрактаў...

Гаварыў, перажываў, хваляваўся не за сябе — за жонку. Паколькі мы зразумелі, жанчыне хутка павінна споўніцца 55 гадоў. Узрост, прабачце, пенсійны. Прыкладна ў гэты ж час заканчваецца і дзеянне кантракта ў жанчыны. Падаўжаць яго, вынікала са слоў сужэнца, кіраўніцтва прадпрыемства не збіраецца.

— А жаданне ж працаваць — хоць бы яшчэ з год — ёсць. І моц, і веды, і вопыт — усё таксама ёсць. Дык можа, неяк паўплываць на рашэнне начальства, пераканаць яго? Падкажыце, — прасіў чытач.

А што можна падказаць? Работніцу, як удакладніў сам заяўнік, за два месяцы да заканчэння кантракта афіцыйна папярэдзілі, што надалей падаўжаць яго не збіраюцца. Парушэнняў тут ніякіх няма. Тлумачыць прычыны, па якіх наймальнік не хоча гэтага рабіць, ніхто не абавязаны. Рана ці позна любы з нас, хто яшчэ ў працаздольным узросце, можа апынуцца ў такой жа сітуацыі. Вось і выходзіць, калі гаварыць простымі словамі, што зварот — рытарычны.

Вядома, можна пра тое ж самае (канкрэтную сітуацыю з жанчынай) распавесці і больш афіцыйна. Спаслацца на Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 красавіка 2000 года №180 «Аб парадку выкарыстання Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 ліпеня 1999 года №29». «Пры заключэнні кантракта з работнікам, працоўны дагавор з якім быў заключаны на няпэўны тэрмін, падаўжэнні або заключэнні новага кантракта, акрамя выпадкаў... тэрмін яго дзеяння вызначаецца: з работнікам перадпенсійнага ўзросту (жанчыны — 53 гады, мужчыны — 58 гадоў), якія добрасумленна працуюць і не дапускаюць парушэнняў працоўнай і выканаўчай дысцыпліны, — не менш чым да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту (жанчыны — 55 гадоў, мужчыны — 60 гадоў) і атрымання імі права на пенсію па ўзросце». Выходзіць, што жонцы нашага чытача далі магчымасць дапрацаваць да пенсіі. Больш ніхто нікому нічога не вінен. Згодна з нарматыўнымі дакументамі. Але падчас размовы не пакідала ўражанне, што мужчына, хвалюючыся за жонку, меў на ўвазе не столькі іх.

Ён неаднойчы спрабаваў перавесці гутарку ў рэчышча людскіх узаемаадносін. Фактычна разважаў сам з сабой. Так, гаварыў, самы вялікі начальнік не можа ведаць усіх падначаленых, тут не паспрачаешся. Папрасіў даць на работніка характарыстыку ў начальнікаў меншага рангу. Жанчына звярнулася да калегі з просьбай засведчыць яе прафесіяналізм, стаўленне да справы перад кіраўніцтвам. А той адмовіўся зрабіць гэта, гледзячы апошняму ў вочы... Дык што можна зрабіць, як паўплываць на сітуацыю, нібы вяртаўся да пачатку гутаркі чытач, чакаў парады... Праблема ў тым, што нюансы людскіх узаемаадносін не прапісаны нідзе. Прынамсі, у кантракце такіх слоў няма, калі не лічыць агульных фраз пра добрасумленнасць выканання работнікам працы, выканання правілаў унутранага распарадку, беражлівага стаўлення да маёмасці... Няма нічога пра тое, што калега павінен падтрымаць, замовіць слоўца... А што адкажаш на кінутае, маўляў, кіраўніцтва месца вызваляе для «свайго» работніка? Нават калі гэта і так (а любы кіраўнік сапраўды імкнецца мець побач з сабой сваіх людзей — сваіх па ўспрыняцці свету, памкненнях, калі хочаце, амбіцыях), большасць з нас успрымаюць гэта праз прызму зноў жа асабістага — паколькі з'яўляюцца зацікаўленымі бакамі ў канфлікце. Лагічна, што на змену работніку ва ўзросце прыйдзе маладзейшы. А вопыт, веды практычна ўжо колішняга, чаму б іх надалей не выкарыстоўваць дзеля агульнай справы — і прадпрыемства, і работніка?!. Слушнае пытанне. Толькі зноў жа не ў кампетэнцыі рэдакцыі, якая магла б даць канкрэтную параду са спасылкай на заканадаўства. Хіба толькі... Хіба толькі паспрабаваць звярнуцца ў прафсаюзную арганізацыю па месцы працы. Магчыма, яна стане для кіраўніцтва тым дарадцам, які здолее перакананць падоўжыць з патрэбным спецыялістам кантракт?..

P.S. ***Галоўнай крыўдай, як падалося, у людзей было адно — усведамленне: такога раней не было. Сапраўды, не было. Мы жылі, працавалі і не думалі, што кантракты будуць напрамую звязаныя з людскасцю.***

Сяргей РАСОЛЬКА.

«НЯПРОСТЫЯ АДНОСІНЫ»

Выстава работ мастака Васіля Зянько пад такой назвай адкрылася ў галерэі «Акадэмія» пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. У гэтым праекце, дарэчы, чацвёртым за год, аўтар звяртаецца да тэмы ўнутранага свету чалавека праз вобразы жывёл і птушак.

— Чалавек часцей за ўсё ўтойвае матывы сваіх учынкаў, у адрозненне ад жывёл, якія вельмі натуральныя ў сваіх жаданнях і дзеяннях, — распавядае пра свой праект аўтар.

Васіль Зянько — удзельнік міжнародных, рэспубліканскіх і гарадскіх мастацкіх выстаў. Яго работы можна пабачыць у Музеі сучаснага рускага мастацтва ў ЗША, а таксама ў асабістых калекцыях Нарвегіі, Германіі, Амерыкі, Турцыі, Расіі. Ужо зараз у Васіля Зянько ёсць прапановы зрабіць у 2012 годзе тры выставы ў Арменіі.

Наведаць экспазіцыю можна да 12 снежня.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Мастак Васіль Зянько, куратар праекта Наталля Сяліцкая і Васіль Зянько-старэйшы на адкрыцці выставы (злева направа).

МОЖА, РЭКТАРАЎ ПАСЯЛІЦЬ У ІНТЭРНАТЫ?

СУПРАЦОЎНІКАМІ Камітэта дзяржкантролю па Віцебскай вобласці быў выкрыты шэраг парушэнняў па пытаннях стану жыллёва-бытавых умоў пражывання ў інтэрнатах Віцебска.

Тут спыніўся час?

Як тады ўстанавілі кантралёры, ні службай міністэрства па надзвычайных сітуацыях, ні санітарнай-эпідэміялагічнай службай не праводзіцца праверка гатоўнасці будынкаў інтэрнатаў да навучальнага года. У выніку, выкрыты парушэнні правілаў пажарнай бяспекі, тэхнікі бяспекі. У некаторых інтэрнатах на момант праверкі не было элементарнага парадку і чысціні.

Напрыклад, у размешчаным у цэнтры горада інтэрнаце Віцебскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа (у якім навучаюцца швейнаму майстэрству — **А.П.**), што па вуліцы Камсамольская, жыццё, як заўважылі кантралёры, як быццам спынілася ў мінулым стагоддзі. Будынак 1960 года пабудовы даўно без капрамонту. Вокны ў ім прагнілі і не адчыняліся. На сценах — расколіны з-за прасадкі падмурка. Прагнілі канструкцыі даху, куты пакояў верхняга паверха зацякаюць. Што яшчэ здзівіла кантралёраў — хол для адпачынку (з тэлевізарам) чамусьці быў адгароджаны ад жыхароў металічнай рашоткай. Між рамамі вокнаў таксама ўстаўлены маналітныя рашоткі, якія не адчыняліся, а гэта парушэнне правілаў пажарнай бяспекі.

Быў адзначаны шэраг і іншых парушэнняў правілаў пажарнай бяспекі і санітарных нормаў. У прыватнасці, як убачылі кантралёры, ртутныя свяцільні выкарыстоўваюцца без ахоўных плафонаў; электраправодка праведзена адкрытым спосабам, а па-над праводкай наклеены шпалеры; падлогі ў кухнях і санвузлах са збітай плітkай, а ў пакоях падлогі абшарпаныя. Уборка санвузлоў і ракавін на момант праверкі не была праведзена, у многіх пакоях быў беспарадак. Не добраўпарадкаваная і тэрыторыя вакол інтэрната: адсутнічаюць кветнікі, лаўкі і вулічнае асвятленне. Памяшканні для душавых, мыцця і сушкі бялізны размешчаны ў падвале, які знаходзіцца ў неналежным стане. А памяшканне для сушкі асабістай бялізны навучэнцаў — без вокнаў, без вентыляцыі...

Каледж, дарэчы, мае яшчэ адзін інтэрнат па вуліцы Карла Маркса, які на трэць пустуе. Ён таксама не быў падрыхтаваны да навучальнага года. Там атрыманая яшчэ ў жніўні мэбля складзіравана ў холах і па пакоях. У холах таксама складзіраваны матрацы, падушкі, абсталяванне пральні. Касметычны рамонт пятага паверха не скончаны, а пакоі другога паверха занятыя мэбляй для класаў і не выкарыстоўваюцца.

А што адказныя асобы?

Як высветлілі кантралёры, у інтэрнатах адсутнічалі прыкметы вядзення выхаваўчай і грамадскай работы. У іх склалася ўражанне, што кіраўніцтва ўстановы і ўпраўлення адукацыі аблвыканкама асабіста не займаюцца праблемамі інтэрнатаў, часам перакладаюць іх рашэнне на работнікаў, якія не маюць адпаведнай падрыхтоўкі і падтрымкі, не забяспечваюць кантроль за сваімі даручэннямі. Цікава, што для ліквідацыі асобных заўваг кіраўніцтву каледжа спатрэбіўся ўсяго адзін дзень. Напрыклад, тут жа былі прыбраныя рашоткі, вывезены хлам і наведзены парадак у пакоях. А калі штодня кантраляваць сітуацыю ў інтэрнатах, то і жыццё навучэнцаў будзе больш камфортным і змястоўным. Ці не так?

Паміж ложкамі — 15 сантыметраў!

Дарэчы, пры праверцы ўмоў пражывання ў інтэрнатах было ўстаноўлена грубае парушэнне нарматываў жылой плошчы з разліку на аднаго навучэнца. У прыватнасці, калі пад выглядам наяўнасці свабодных месцаў пакоі прадастаўляюцца для пражывання людзям з іншых арганізацый. Напрыклад, у інтэрнаце Віцебскага дзяржаўнага політэхнічнага прафесійнага ліцэя, што на праспекце Чарняхоўскага, навучэнцы займаюць толькі два паверхі з васьмі, прызначаных для пражывання.

Гэта так званы «блочны» інтэрнат, дзе ў кожным блоку ёсць санвузел і душ. На васьмі паверхах 207 пакояў. На першым паверсе — сталовая, умовы для навучэнцаў цалкам здавальняючыя. Але навучэнцаў (іх 201 чалавек) размясцілі ў 53 пакоях: па пяць чалавек у трохмесны нумар. У выніку, уявіце сабе, адлегласць паміж ложкамі ўсяго па 15 сантыметраў, няма пакоя для самападрыхтоўкі. На паверх усяго адна пліта і адзін маленькі халадзільнік.

Узнікае заканамернае пытанне: чаму за кошт сродкаў, выдзеленых на ўтрыманне ўстановы адукацыі, утрымліваецца фактычна жыллёвы фонд, а дзеці жывуць на кватэрах? Толькі паводле папярэдняй інфармацыі, звыш пяцідзесяці навучэнцаў здымаюць кватэры. І гэта тады як у інтэрнаце пражываюць работнікі самых розных арганізацый: РУП «Белтэлекам», ТАА «Альянспласт», ААТ «Жылбуд», «Сантэхбуд» і іншых.

Асобы, вінаватыя ў парушэнні правілаў прадастаўлення жылых памяшканняў у інтэрнатах, панясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

ЛОТ 1	
Наименование объекта	**Краткая характеристика**
Здание автостанции «Острино»	Здание специализированное автомобильного транспорта инв. №422/С-3776, литер Е1/к, 1977 г.п., общая площадь здания 313,4 кв.м, объем здания с подвалом 1485 м.куб., фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия ж/б плиты, крыша рулонная совмещенная, полы дощатые, цементные, отопление – чугунные радиаторы, электроснабжение – скрытая электропроводка. Сарай Литер 2, 1977 г.п., площадь застройки 62 кв.м, объем 186 м.куб., фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытия – ж/б плиты, крыша рулонная совмещенная, полы бетонные, электроснабжение скрытая электропроводка. Проезжая часть с дорожным бордюром – асфальтобетонное покрытие площадью 4595,4 кв.м, бетонный бордюр длиною 441,6 м. Пешеходная часть с тротуарным бордюром – тротуарная плитка(бетон) площадью 275,6 кв.м, бетонный бордюр длиною 206,6 м. Зеленые насаждения (28 ед.)
Начальная цена продажи	36 444 803 белорусских рубля с учетом НДС
Сумма задатка	3 644 480 белорусских рублей
Местонахождение объекта	Гродненская обл., Щучинский р-н, г.п. Острино, ул. Гродненская, 49
Земельный участок	кадастровый № 425856600002000070, общая площадь земельного участка – 0,7343 га, назначение – содержание и обслуживание зданий и строений автостанции
Продавец	Филиал «Автомобильный парк №12 г. Щучин» ОАО «Гроднооблавтотранс» г. Щучин, ул. Советская, 41
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41 98 32, 41 98 34
Условия аукциона	Аукцион без условий
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/сч для перечисления задатка	р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225.

Аукцион состоится 19 декабря 2011 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3 каб. 209

К участию в аукционе допускаются юридические лица,физические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – нотариально заверенная доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Информация о первом аукционе была опубликована в газете «Звязда» от 11.03.2011 г. № 45(26909)

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3 с 8.30 до 17.30

Последний день приема заявлений – 16 декабря 2011 г. до 15.00

Телефон для справок: 41 98 32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», подробная информация: www.ino.by

ДНІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА Ў ЯЛЦЭ

Уражанні ўдзельніка

З вялікай шчырасцю, эмацыянальнай насычанасцю і непасрэднасцю прайшлі 2 і 3 снежня ў Ялце дні, прысвечаныя 120-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Іх агульны дэвіз — «Паэт красы, святла, любові». Гэта сталася сапраўдным святам не толькі для беларускіх суполак Крыма, але і для ўсіх прыхільнікаў таленту нашага класіка. Хіба ж не пра такую ўвагу і павагу да свайго слыннага земляка сведчыць хоць бы той факт, што для ўдзелу ў канцэрце на ўрачыстым вечары «Разам ляцець да зорак», прысвечаным юбілею паэта, які адбыўся ў клубе Чарнаморскага флоту «Ялта», сабралася шмат мастацкіх калектываў беларускіх суполак, многія з якіх прыехалі за сотні кіламетраў — з Севастопаля, Запарожжа, Феадосіі і іншых мясцін. Варта згадаць, што лепшыя з іх адзначаны прэміяй імя Максіма Багдановіча, якая заснавана ў Крыме. А як спявалі — у гледачоў ажно далоні балелі ад воплескаў. Сапраўды, такую зацікаўленасць і шчырасць сёняшнім прагматычным днём сустрэнеш не часта.

Памятных падзей у Ялце адбылося нямала. Адной з галоўных стала адкрыццё ў гісторыка-літаратурным музеі спецыяльнай выстаўкі «Геній зямлі беларускай» з фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску. На яе прэзентацыі пытанняў да дырэктара музея М. Багдановіча Таццяны Шэляговіч было шмат, як нямала было іх і падчас іншых сустрэч і мерапрыемстваў. Дарэчы, крыху раней тут адкрылася выстаўка «У вянок Максіму» мясцовых мастакоў і народных майстроў Крыма.

Непасрэднай і зацікаўленай адбылася сустрэча гасцей з Беларусі, якія прыехалі на святкаванне юбілею беларускага паэта, — Таццяны Шэляговіч, старшыні Беларускага фонду культуры Уладзіміра Гілепа і аўтара гэтых радкоў са студэнтамі-філолагамі Крымскага гуманітарнага ўніверсітэта і яго рэктарам Аляксандрам Глузманам. Да гасцей актыўна далучыўся супрацоўнік Пасольства Беларусі ва Украіне Аляксей Ястрабаў.

Трэба было бачыць, якім майстэрствам вызначаліся працы навучэнцаў Ялцінскай дзіцячай мастацкай школы на выставе «Маладыя гады — маладыя жаданні», прысвечанай юбілею М.Багдановіча. Адметна, што кожны твор меў своеасаблівы эпіграф з твораў паэта. Гасцям з Мінска не хацелася нават адыходзіць ад гэтых прац вельмі-вельмі юных украінскіх мастакоў. І нездарма Таццяна Шэляговіч падтрымала ідэю правядзення выставы гэтых прац у Мінску.

Каляровыя афішы ў горадзе, розгалас пра тое, як святкуецца юбілей беларускага паэта, прыводзілі на кожнае мерапрыемства шмат удзельнікаў, і не толькі нашых землякоў. Шмат неабыякавых людзей прыняло ўдзел у мітынгу на Старых гарадскіх могілках Ялты, дзе вось ужо 94 гады спачывае Максім Багдановіч. Шмат хто гаварыў пра значэнне творчасці паэта для сённяшніх чытачоў, гучалі словы прызнання ў любові да нашага класіка, чыталіся яго вершы. І да слёз было шчымліва, калі падчас аднаго з выступленняў да магілы паэта ціхенька падышоў шэры коцік і пачаў церціся каля ног прысутных, зазіраў ім у вочы — быццам слухаў іхнія словы. А кожны падумаў: няўжо пасланец ад Максіма Кніжніка, душа якога стала дбайным анёлам-ахоўнікам роднай зямелькі? Варта згадаць, што падобнае адбылося колькі гадоў таму, падчас наведвання магілы групай беларускіх пісьменнікаў.

Была і яшчэ адна цікавая навіна. Пра яе паведаміла рэдактар часопіса «Крым-Беларусь» Дзіна Шаўчэнка. Літаральна перад гэтымі днямі з Ялцінскага Нікіцкага батанічнага сада прыйшла вестка, што яго кіраўніцтва прыняло рашэнне адзін з новых гатункаў цюльпана, які мае колер васількa, назваць імем Максіма Багдановіча. Букеты кветак ляглі да памятнай дошкі на будынку клуба, на месцы якога некалі стаяў дом, у якім правёў свае апошнія дні наш Максім Кніжнік, да дошкі на вуліцы імя Максіма Багдановіча, у якім ён жыў у 1909 годзе, да помніка паэту на тэрыторыі санаторыя «Беларусь» у Місхоры.

Старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп прэзентаваў у Ялце новае арыгінальнае выданне твораў Максіма Багдановіча, толькі што выпушчанае ў свет фондам культуры. Гэта багата ілюстраваны мастаком Юрыем Хілько трохтомнік, у кожны том якога ўвайшло ўсяго па адным вершы паэта і яго пераклады на 9 замежных моў. А вершы гэтыя — «Слуцкія ткачыхі», «Пагоня» і «Раманс (***Зорка Венера ўзышла над зямлёю...)». Украінскім студэнтам і навучэнцам, беларускім суполкам былі перададзены бібліятэчкі твораў Максіма Багдановіча, літаратура аб ім.

Шмат чаго цікавага было за два дні на сваце. На кожным мерапрыемстве ў выкананні юных чытачоў і пасівелых ветэранаў, мясцовых паэтаў пранікнёна гучалі вершы Максіма, творы, прысвечаныя яму, хвалюючыя выступленні. Гучалі па-беларуску, па-руску, па-ўкраінску. І нікому ні разу не спатрэбіўся перакладчык: тое, што прапушчана праз сэрца, зразумела кожнаму. Былі і ўзнагароды самым актыўным з 30-тысячнай беларускай дыяспары ў Крыме — ад Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, ад Музея М. Багдановіча ў Мінску, ад Пасольства Беларусі ва Украіне. Сярод адзначаных быў і намеснік старшыні Саюза беларусаў Крыма Віталь Бартохаў — выдатны арганізатар, таленавіты спявак і чытальнік твораў М.Багдановіча (склалася ўражанне, што ён ведае на памяць усё, напісанае паэтам). І мы, госці свята, і яго калегі па беларускіх суполках, і іншыя ўдзельнікі мерапрыемстваў былі адзінадушныя: без Віталя Бартохава такое свята, з такім эмацыйным напалам і ў такім маштабе не адбылося б.

Таццяна Шэляговіч як бы падсумавала настрой усіх нас: «Усё, што адбылося за гэтыя два дні ў Ялце, варта светлай памяці і таленту Максіма Багдановіча». І гэта праўда.

А святкаванне юбілею Максіма Багдановіча ва Украіне прадоўжыцца — неўзабаве ў Кіеве адкрыецца перасоўная выстаўка «Геній зямлі беларускай» з фондаў Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску.

Анатоль БУТЭВІЧ. Фота аўтара.

«Багдановіч-120»

Паэт, якога мы не ведалі

УБЛІЖЭЙШЫ ЧАС у выдавецтве «Літаратура і мастацтва» выйдзе кніга «Максім Багдановіч: вядомы і невядомы». Малады крытык і літаратуразнаўца Ціхан Чарнякевіч паклапаціўся, каб у кнігу ўвайшлі сапраўды каштоўныя, раней невядомыя і амаль не публікаваныя факты жыцця і творчасці нашага Максіма. «Звязда» пацікавілася ў аўтара кнігі пра невядомага Максіма Багдановіча: што ж сапраўды невядомага можна будзе прачытаць у новым выданні?

— Можна сказаць, што ў крытыцы я паступова дрэйфую да навукі, а ў навуцы прыкладаю ўсе намаганні, каб выбрацца з цянётаў бягучкі-крытыкі, — распавядае малады літаратуразнаўца. — Я заўжды захапляўся асобай Максіма Багдановіча, яго творчасцю. Напэўна, ён, ды яшчэ Міхась Стральцоў, для мяне — абсалютныя арыенціры ў літаратуры, якія на працягу доўгага часу не змяняюцца. Чытаць іх можна бясконца. Па-мойму, гэта людзі, якія за сваё жыццё не напісалі ніводнага пасрэднага твора. Напрыклад, тыя чарнавікі, што засталіся ад Максіма Адамавіча, вядома, не ўсе бездакорныя, але і яны знаходзяцца ў гармоніі з яго сістэмным светасузіраннем і творчым метадам.

Зборнік літаратуразнаўчых і архіўных матэрыялаў «Максім Багдановіч: вядомы і невядомы» стаў, па сутнасці, пэўным працягам дысертацыі Ціхана Чарнякевіча, якая прысвечана літаратурнай навуцы 1920-х гг. (Аляксандр Вазнясенскі, Аляксандр Яўлахаў, Іван Замоцін і інш.). У будучай кнізе аўтар стараўся спалучыць гэтыя два свае захапленні: творчасць Багдановіча і тэорыю літаратуры пачатку мінулага стагоддзя.

— Я стараўся зрабіць кнігу пра Багдановіча як мага больш свежай па матэрыяле. У выніку атрымалася прыкладна 75% неапублікаваных рэчаў і чвэрць тэкстаў, якія не рэпублікоўваліся ўжо гадоў 70-80 (даваенная крытыка), — распавядае Ціхан Чарнякевіч. — Праца з архіўнымі тэкстамі і публікацыямі 1920-х патрабуе добрай падрыхтоўкі. Я і дагэтуль не ўпэўнены, ці ўсе моўныя асаблівасці атрымалася перадаць. Там вельмі шмат нюансаў. Напрыклад, возьмем кніжку Аляксандра Вазнясенскага «Паэтыка Максіма Багдановіча», якая ўвайшла ў зборнік. Сам аўтар дрэнна валодаў мовай, і я мяркую, што існаваў рускамоўны арыгінал, з якога перакладаў публікатар даследавання — Вацлаў Ластоўскі. Можаце сабе ўявіць, колькі літаратуразнаўчых тэрмінаў выдумаў перакладчык! Аўтар прадмовы да зборніка, кваліфікаваны філолаг і выдатны багдановічазнаўца Юры Пацюпа напісаў для кнігі адмысловы гласарый: па сутнасці, пераклаў даваенную лексіку на сучасную беларускую мову.

Як распавядае літаратуразнаўца, некаторыя артыкулы знайсці было вельмі цяжка. Напрыклад, кароткі артыкул Яўхіма Карскага пераслаў з Санкт-Пецярбурга Дзмітрый Вінаходаў, даследчык творчасці Яна Баршчэўскага, бо адпаведнага нумара выдання, дзе гэта было апублікавана, у Беларусі, на жаль, няма. Нешта так і не атрымалася знайсці наогул. Так адбылося з адным артыкулам Уладзіслава Дзяржынскага ў часопісе «Вольны сцяг». Бо поўнай падшыўкі гэтага выдання ў Беларусі таксама няма.

— З архіўных рэчаў у кнізе выйдуць рускамоўная дысертацыя пра Максіма Багдановіча аўтарства Рыгора Жалязняка (найбольш аб'ёмны тэкст), лісты Зоські Верас да Алеся Бачылы і Ніны Ватацы, лісты Дзіядора Дзябольскага да Юльяна Пшыркова і многае іншае, — інтрыгуе аўтар зборніка.

Найбольш часу ў падрыхтоўцы даволі ўнікальнай кнігі, як ні дзіўна, адняў набор тэкстаў. Бо ўсё друкавалася з арыгінальных аўтографаў і машынапісаў. Аўтар кнігі судакнуўся з тэкстамі, напісанымі самім Багдановічам, яго сучаснікамі і паслядоўнікамі. А мы цяпер зможам судакнуцца з Багдановічам, якога яшчэ не ведалі.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

Здарэнне

ЭЛЕКТРАШЧЫТЫ ЗАГАРЭЛІСЯ НА ЧАТЫРОХ ПАВЕРХАХ АДРАЗУ

Бліжэй да абеду ў цэнтр аператыўнага ўпраўлення пры Мінскім гарадскім упраўленні МНС паступіў трывожны сігнал ад жыльцоў дома па вуліцы Ясеніна: пажар у размеркавальных шчытках на лесвічных пляцоўках з першага па чацвёрты паверхі дзевяціпавярхоўкі!

Першы разлік пажарных-выратавальнікаў быў на месцы выкліку праз пяць хвілін. Спецыялісты ўбачылі, што адбылося ўзгаранне ізаляцыі электраправодкі ў размеркавальных электрашчытах і корабах у міжпавярховай прасторы з першага па чацвёрты паверхі. Работнікі МНС, выкарыстоўваючы газадымахоўныя маскі, выратавалі з кватэры (у жыллі было моцнае задымленне) на шостым паверсе 29-гадовую жанчыну разам з двухгадовым дзіцем. Ужо без выкарыстання спецыяльных сродкаў выратаваня з дома было эвакуявана яшчэ 8 чалавек — іх вывелі па лесвіцы. Мяркуецца, што прычына пажару — кароткае замыканне электраправодкі. Яна пашкоджаная, пад'езд на момант падрыхтоўкі публікацыі, паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС, быў цалкам адключаны ад электразабеспячэння. Праводзіліся работы па яго аднаўленні, іх меркавалася скончыць да 21 гадзіны вечара.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Администрация Первомайского района г. Минска

приглашает жителей города в период с **17 по 31 декабря 2011 года**

принять участие в общественном обсуждении по вопросу планируемого строительства многоквартирного жилого дома в микрорайоне Уручье-1 по ул. Руссиянова.

Ознакомиться с экспозицией можно с **17 по 31 декабря 2011 года** в помещении КУП «ЖЭУ-96» Первомайского района г. Минска по адресу: ул. Никифорова, д. 12, ежедневно **с 8.00 до 20.00**, без обеда и выходных.

Письменные замечания и предложения дополнительно можно направлять по адресу: пер. К.Чорного, 5, каб. 306 (тел. 280-21-49, 280-02-21) или на электронный адрес: perv.stroi@minsk.gov.by до 11 января 2012 года.

Администрация Первомайского района г. Минска

ООО «ДИНАСИСТЕЙТ» информирует юридических и физических лиц о **строительстве объекта:** «Многоквартирные жилые дома, не относящиеся к жилым домам повышенной комфортности, с помещениями административно-общественного назначения, выносом временной автостоянки УП «Гаражи, автостоянки и парковки» на пересечении ул. Крупской и Малинина с многоярусной гараж-стоянкой по ул. Крупской».

ЗАСТРОЙЩИК – ООО «ДИНАСИСТЕЙТ» зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 28.09.2000 г. № 1097, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100984486. **Адрес застройщика**: 220039, г. Минск, ул. Воронянского, д. 7а, 1 этаж, каб. 55, тел. 224-74-29. Режим работы: понедельник-пятница: с 09.00 до 17.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Застройщиком осуществлено строительство жилых домов по адресу: г. Минск, ул. Крупской, д. 19, д. 21 (2008-2009 гг.).

Объект состоит из домов КПД №№ 9, 10, 11, 12 по генплану на пересечении улиц Малинина и Крупской в г. Минске, инженерных сетей, а также многоярусной гараж-стоянки по ул. Крупской. Первым этапом предусмотрено строительство жилых домов 9, 10, 11, 12 по генплану и инженерных сетей. Дома запроектированы с техническим подпольем и теплым чердаком, предусмотрено центральное отопление и электроплиты на кухне. Благоустройство дворовой территории: детская игровая площадка, места для отдыха взрослых, малые архитектурные формы.

Жилой дом № 9 по генплану на 90 квартир состоит из одной 10-этажной секции серии КПД М111-90, БС-41 и одной 10-этажной секции серии КПД М464-10-У1-01.

Жилой дом № 10 по генплану на 99 квартир состоит из одной 10-этажной секции серии КПД М111-90, БС-41 и одной 10-этажной секции серии КПД М464-10-У1-04-2-Ад с административным помещением на первом этаже площадью 50,99 м².

Жилой дом № 11 по генплану состоит из одной 19-этажной 132-квартирной секции серии КПД М111-90 с помещением товарищества собственников на первом этаже площадью 35,17 м².

Жилой дом № 12 по генплану состоит из одной 19-этажной 132-квартирной секции серии КПД М111-90 с административным помещением на первом этаже площадью 35,17 м².

Цель проекта строительства – исполнение решения Мингорисполкома «Об изъятии и предоставлении земельного участка и разрешении строительства» № 2254 от 04 августа 2011 г.

Начало строительства объекта:
– третий квартал 2011 года.

Окончание строительства объекта:
– четвертый квартал 2013 г.

Общая площадь квартир объекта:
– 26 304,34 м² (453 квартиры).

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, вентшахты, коридоры, крыши, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых домов и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

Для заключения договоров долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предоставляются:

В жилых домах № 10 и № 12 по генплану:

две трехкомнатных квартиры общей площадью от 72,43 м² до 81,96 м² – цена 1 м² общей площади 7 450 000 рублей;

пятнадцать двухкомнатных квартир общей площадью от 57,29 м² до 60,84 м² – цена 1 м² общей площади 7 550 000 рублей;

пятнадцать однокомнатных квартир общей площадью от 39,71 м² до 48,70 м² – цена 1 м² общей площади 7 750 000 рублей.

Условия оплаты стоимости объекта долевого строительства: 70 % – не позднее 7 (семи) календарных дней со дня заключения договора долевого строительства; оплата оставшейся суммы – до 15.01.2012 г. Цена 1 м² объекта долевого строительства – фиксированная на дату опубликования проектной декларации.

Квартиры передаются дольщикам без чистовой внутренней отделки.

Условия ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: по согласованию с Застройщиком.

Застройщик имеет следующие разрешительные документы:

- разрешение на проведение проектно-изыскательских работ – Акт выбора земельного участка от 30.04.2009 г.;

- решение Минского городского исполнительного комитета от 04 августа 2011 г. № 2254 о разрешении строительства объекта;

- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков общей площадью 1,8345 га на пересечении улиц Малинина и Крупской в г. Минске и возникновения права пользования на него, право собственности на земельные участки – Республика Беларусь, земельные участки имеют ограничения прав в использовании земель – водоохранная зона водных объектов г. Минска:

временного пользования № 500000000002007647, площадью 1.4095 га;

постоянного пользования № 500000000002007646, площадью 0.0094 га;

постоянного пользования № 500000000002007645, площадью 0.0083 га;

постоянного пользования № 500000000002007642, площадью 0.1101 га;

постоянного пользования № 500000000002007644, площадью 0.1203 га;

постоянного пользования № 500000000002007641, площадью 0.0898 га;

постоянного пользования № 500000000002007643, площадью 0.0871 га;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 22.08.2011 г. № 582-15/11;

- договор строительного подряда № 1/11-С от 19 августа 2011 г. с ОАО «МАПИД»;

- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на проведение строительно-монтажных работ от 25 августа 2011 г. № 2-201Ж-015/11.

Информацию об объекте долевого строительства, планировках квартир и условиях заключения договоров можно получить на сайте www.dinas.by или по тел. 8 (017) 2339603.

Предложение действительно до 31.12.2011 г.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ объекта долевого строительства

КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Коралл» (продавец)

извещает о проведении 23 декабря 2011 года открытого аукциона по продаже имущества в 11-00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	***Капитальное строение (здание кислородно-компрессорной станции) площадью 3903,6 кв.м инв.№350/С-44942***	г. Гомель, ул. Лепешинского, 7	1 612 682 000	161 000 000
2	***Капитальное строение (здание станции холодильной) площадью 2682,9 кв.м инв. № 350/С-50046***	г. Гомель, ул. Лепешинского, 7	1 663 818 000	166 000 000
3	***Капитальное строение (здание столовой на 550 мест) площадью 3297,3 кв.м инв. №350/С-49975***	г. Гомель, ул. Лепешинского, 7	2 397 600 000	239 000 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Коралл».

Имущество расположено по адресу: 246000, г. Гомель, ул. Лепешинского, 7. **Шаг аукциона -5 %.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет продавца (ОАО «КОРАЛЛ») №3012111889019 в Региональной Дирекции №300 ОАО « БПС-Сбербанк» , УНП 400051785, МФО 153001369 **по 21 декабря 2011 года включительно.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель в рабочие дни с 09-00 до 13-00 и с 14-00 до 17-00 от даты опубликования настоящего извещения **по 21 декабря 2011 включительно.**

К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

При подаче заявления в адрес организатора аукциона представляются: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица и их подлинники. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.10.2011 г.

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74-17-34, 74-89-64 и на сайте gomeloblreklama.by

ЗАПАВЕДНЫ НАПЕЎ

ПУШЧА — наш агульны нацыянальны сімвал. Але яна ў кожнага свая. Бо ў любога, хто хоць аднойчы пабываў у лесе, поўным дзівосаў, ён назаўсёды застаецца ў памяці, свядомасці, уяўленні. Калі ты здолеў адчуць душою гармонію міру ўсяго жывога, то ў пушчу захочацца вяртацца зноў і зноў, дыхаць яе паветрам, слухаць яе вясновае шматгалоссе і зімовую гучную цішыню. Пра спрадвечны лясны аплот напісана і сказана многа, ды ніхто да гэтай пары, здаецца, не намаляваў словам лепш за Караткевіча самабытны куток нашай краіны, «дзе можна застацца сам-насам з аленямі і зубрамі, з аксамітнымі грабамі і векавымі дубамі, з сумленнем, з чалавечнасцю, з усёй гэтай добрай і адвечнай беларускай зямлёй». Далей у слыннага аўтара чытаем: « Гэта не толькі неацэнны скарб усіх на свеце людзей. Галоўнае тое, што мы звязаны з чатырохногімі і пёрыстымі братамі нашымі адзінай повяззю еднасці ўсяго жывога на зямлі. Таму задача і гонар чалавека не забіваць, а бараніць і карміць. Ён зараз і робіць гэта, сапраўдны чалавек»... Вялікі наш пісьменнік толькі марыў, каб Белавежская пушча стала нечым накшталт нацыянальнага парку. А сёння яна гэты статус мае, таксама мае шмат адзнак міжнароднага ўзроўню. Ужо амаль два дзесяцігоддзі ўчастак высокаўзроставага лесу ўключаны ў спіс Сусветнай спадчыны чалавецтва. Зараз вядзецца работа па наданні міжнароднага прызнання пушчы не толькі як прыроднага унікуму, але і як аб'екта высокай эстэтыкі, крыніцы натхнення паэтаў, мастакоў, прадмету гонару ўсяго народа. Шкада, што не дажыў да гэтага часу аўтар «Зямлі пад белымі крыламі». Відавочна, што і міжнародныя эксперты, і нашы навукоўцы ідуць тым шляхам, які напрарочыў Уладзімір Караткевіч яшчэ ў 1971 годзе. Бо пушча — не проста лес. Аб гэтым мы гаворым з новым генеральным дырэктарам нацыянальнага парку Аляксандрам БУРЫМ.

«Я палюбіў гэты лес»

Аляксандр Васільевіч прызначаны на новую пасаду 4 красавіка гэтага года. А літаральна нядаўна чарговы раз сустракаўся са спецыялістамі з Савета Еўропы па пытаннях прадаўжэння тэрміну дзеяння Еўрапейскага дыплома для Белавежскай пушчы. Мы папрасілі расказаць пра гэта больш падрабязна.

— Не так даўно прыязджалі эксперты, а цяпер яны час ад часу па тэлефоне ўдакладняюць асобныя звесткі, задаюць пытанні, сувязь падтрымліваем пастаянна. Спачатку ў іх узніклі прэтэнзіі наконт рэзідэнцыі Дзеда Мароза. Але мне ўдалося іх пераканаць, што гэты аб'ект, акрамя іншых, мае вялікае выхаваўчае значэнне. Дзеці знаёмяцца са светам пушчы, бачаць тут звяроў, сустракаюцца з незнаёмай і багатай расліннасцю. Акрамя таго, экскурсія па памесці нясе ў сабе элемент экалагічнай адукацыі. Экскурсавод расказвае не толькі пра казачныя дзівосы ды жывую навагоднюю ёлку, самую высокую ў Еўропе, але і пра лясныя клопаты валадара-Мароза: як ён зімой кантралюе, каб травы і іншыя расліны не замярзалі, а жывёлам дапамагае пракарміцца, як сочыць, каб рыбы пад лёдам не задыхнуліся. А вясной птушак сустракае ды ціхія месцы для гнёздаў паказвае, летам назірае, каб усяму жывому вільгаці хапала. Словам, наш Дзед мае выражаную экалагічную арыентацыю. Апошняе вельмі важна ў справе выхавання.

У размове з экспертамі я прывёў прыклад таго, што паўплывала на мой жыццёвы выбар. Мой дзед быў лесніком, я хадзіў з ім на працу, дапамагаў збіраць шышкі, садзіць лес. І ў чацвёртым класе ў сачыненні напісаў, што хачу быць лесніком. Так яно і сталася

Генеральны дырэктар Аляксандр БУРЫ.

— Ну і якім быў шлях да ажыццяўлення дзіцячай мары?

— Гэты шлях вызначыў усё жыццё. Маладым спецыялістам з дыпломам Мінскага тэхналагічнага інстытута ў 1989 годзе я прыйшоў працаваць у Клецкі лясгас. Можна сказаць, па ўласнай ініцыятыве пачаў працоўную дзейнасць з майстра лесу. Так, з сякерай і пілой праца цяжкая, але для любога спецыяліста вельмі карысная. Кажу гэта з вышыні сённяшняга вопыту. Па-першае, прайшоўшы этапы лясной работы з самага нізу, любы кіраўнік будзе ўсведамляць цяжкасці і цаніць працаўніка, які ў сцюжу і спёку знаходзіцца пад адкрытым небам, а па-другое, такога кіраўніка ніхто не зможа падмануць у нюансах нормы выпрацоўкі, іншых асабліваснасцях. Кіраўнік павінен умець гаварыць з рабочым на адной мове. А гэтага можна дасягнуць толькі ўласным досведам.

І вось праз два гады мяне прызначылі ляснічым Навінкаўскага лясніцтва, па тым часе цікавага прадпрыемства з базісным гадавальнікам, са сваім пчальнікам, з добрым тэхнічным аснашчэннем. Пазней я быў пераведзены ў Нясвіжскае лясніцтва, потым стаў галоўным ляснічым Клецкага лясгаса. У 2005 годзе я атрымаў прызначэнне на пасаду дырэктара дзяржаўнага лясного прадпрыемства «Краснасельскае» на тэрыторыі Мінскага, Вілейскага і Лагойскага раёнаў. Гэта быў вельмі складаны ўчастак працы. Там часта мяняліся кіраўнікі. Можаце ўявіць, які быў мікраклімат у калектыве. Але разам з калектывам за пяць з паловай гадоў мы здолелі аздаравіць і маральны, і экалагічны клімат. Справы пайшлі лепш, сфарміраваўся кадравы касцяк прадпрыемства, падцягнулі тэхнічную базу, пабудавалі новы цэх, наладзілі супрацоўніцтва з суседнімі лясгасамі. І вось на пачатку гэтага года паступіла прапанова ўзначаліць Нацыянальны парк.

І хаця гэта найперш вялікая адказнасць і даволі складаны ўчастак працы, на маю згоду паўплываў адгалосак дзіцячых і юнацкіх мараў. Нават у студэнцкія гады тыя з нас, хто асабліва свядома выбіраў прафесію, марылі працаваць у Белавежскай пушчы. (Аўтарамі заўважана, што пазыўныя мабільнага тэлефона дырэктара — вядомая мелодыя песні Пахмутавай «Запаведны напеў».)

— Вядома ж, вы раней бывалі ў пушчы. А знаёмства з ёй у якасці дырэктара здзівіла, парадавала, расчаравала?

— Дарэчы, я не так часта бываў тут раней. А цяпер... я проста палюбіў гэты лес. Гэта не проста растлумачыць, але лес нібы прыадкрыў мне зашыфраваны код яго разумення і адчування. Потым у працэсе стасункаў і камунікацый я палюбіў гэтых людзей. Яны — працаўнікі, патрыёты сваіх мясцін. Яны адрозніваюцца ад жыхароў Беларусі ў другіх рэгіёнах тым, што больш самадастатковыя, маюць сваю думку. Іх трэба слухаць, трэба разумець.

Зараз адно з пытанняў бліжэйшага парадку дня — папоўніць калектыў спецыялістамі. Будзем запрашаць некалькі выпускнікоў профільнага ўніверсітэта. Маем намер расціць свае кадры. У Камянюцкай школе ёсць экалагічны клас. Гэтых дзяцей мы лічым патэнцыяльным кадравым рэзервам. Працэсу навучання спрыяем і матэрыяльна, і аказваем навуковую дапамогу. Працягваючы і пашыраючы шматгаліновую навуковую дзейнасць, мяркуем развіваць супрацоўніцтва з суседнімі краінамі, можа нават стварацьсваю навуковую школу. Пушча не проста лес. Яна заслугоўвае вывучэння, якасць якога будзе ісці ў нагу з часам і ні ў якім разе не адставаць.

— Зараз вы, Аляксандр Васільевіч, адчуваеце сябе больш эколагам ці ўсё ж гаспадарнікам?

— Для таго, каб гаспадарыць правільна ў нашых умовах, трэба грунтоўна абапірацца на навуку, а каб развіваць навуку, патрэбны сродкі. Гэтыя аспекты пакуль з'яўляюцца неразрыўнымі. У пушчы працуе 1330 чалавек, якія павінны своечасова атрымліваць зарплату, ёсць шэраг іншых абавязковых фінансавых праграм. Але гаспадарчая дзейнасць уяўляе сабой не толькі прамысловую вытворчасць, якую мы, дарэчы, маем намер скарачаць, але найперш турыстычны бізнэс. Экалагічная асвета і турызм уяўляюцца будучыняй не толькі нашага, але і ўсіх нацыянальных паркаў.

А навука тут была заўсёды на першым месцы. Навукоўцы вядуць зараз вялікую селекцыйную работу. Генетыка гэтага лесу цікавая не толькі для навукоўцаў і лесаводаў рэспублікі, яна выклікае цікавасць і за межамі краіны. Гэта ўнікальны лясны масіў, які развіваўся тысячагоддзямі без уплыву чалавека. Мы маем рэдкую магчымасць збіраць насенне дрэў, якія выраслі да пачатку шкоднага антрапагеннага ўплыву цывілізацыі. Зараз, па сутнасці, заканчваецца будаўніцтва гадавальніка, дзе будуць вырошчвацца саджанцы нашчадкаў пушчанскіх дрэў. З гэтага матэрыялу стане магчыма ўзнаўляць пашкоджаныя ўчасткі лесу, яго ахвотна купляць лясгасы краіны ды і замежныя партнёры.

Вялікія перспектывы для развіцця навукі адкрываюцца з пашырэннем трансгранічнага супрацоўніцтва.

— Як паўплывае на жыццё пушчы новая аб'язная дарога?

— Гэта дарога, відавочна, не проста асфальтавае палатно. Гэта аб'ект вялікай сацыяльнай значнасці, і не толькі для Нацыянальнага парку. Дарога ахапіла ўчасткі, якія былі пазбаўлены камунікацый: дзе-нідзе па прычыне забалочанасці, а ў іншых месцах не было дарог паміж раёнамі. Цяпер людзі могуць спакойна праязджаць, вырашаць свае гаспадарчыя праблемы. А мы атрымалі магчымасць рэзка паменшыць тэхнагенную нагрузку на пушчу. Раней жа, вы разумееце, ахвотных праехаць напрасткі было хоць адбаўляй, усе прасіліся, прыдумвалі ўважлівыя прычыны, важкія абгрунтаванні. А цяпер гэтыя праблемы адпалі: едзь да самага Гродна па новай роўнай трасе.

Новая дарога — крок да будучыні пушчы. У Камянюках узводзіць больш гасцініц ды кемпінгаў не выпадае. А тыя, што маем, асабліва перад святамі, у сезон не могуць задаволіць попыту. Па перыметры ж пушчы ўздоўж дарогі адкрываюцца неабмежаваныя магчымасці для зацікаўленых людзей па ўзвядзенні турыстычнай інфраструктуры.

— Тэндэнцыі да павелічэння патоку турыстаў праглядаюцца?

— І дарога можа іх павялічыць у шмат разоў. Мой польскі калега гаворыць, што практычна 100% турыстаў, якія наведваюць іхні нацыянальны парк, цікавяцца нашым паркам. І стрымлівае многіх з іх толькі складаная візавая працэдура. А калі з цягам часу гэтыя праблемы ўдасца вырашыць, да нас столькі людзей паедзе! Бо ў свядомасці замежнага чалавека нішто так не асацыюецца з Беларуссю, як Белавежская пушча. Мы можам паказаць наведніку месца на распрацаваць прынцыпова розныя экалагічныя маршруты і сцяжыны. Так, пачынаючы знаёмства з Камянюкаў, турыст убачыць адзін бок флоры і фаўны лесу, у Пружанскім раёне — свае асаблівасці, а ў Свіслацкім — свае. Не выключана, што, пабываўшы ў адным месцы, свядомы турыст захоча ў другое. І дарога з яе інфраструктурай дасць такую магчымасць. Прыкладам можа служыць турыстычная вёска Клятное ў Пружанскім раёне.

Там ёсць цудоўная база адпачынку і пражывання і ёсць разумменне гаспадара, што прывабіць сапраўднага турыста яму дапаможа толькі пушча. Таму разам з нашымі спецыялістамі прадпрыемства ўзводзіць унікальную экалагічную сцяжыну, якая пройдзе праз багністае балота. У балоце, што называецца «Дзікое», жыве цэлы шэраг «чырвонакніжнікаў». Рэдкіх птушак, расліны можна ўбачыць на шляху, які пракладваецца. А зрабіць бяспечную для чалавека дарожку можна толькі з дапамогай паляў. Сем кіламетраў ужо пракладзена, чакаем марозікаў, інакш у балота проста не ўлезеш. Вакол сцяжыны ўзводзяцца вышкі, каб зручней было назіраць за флорай і фаўнай «Дзікога». Сцяжына абяцае стаць сапраўднай турыстычнай «разыначкай».

Амаль палову стагоддзя прысвяціў пушчы егер Уладзімір СІДАРУК.

Спадзяёмся, што прыток турыстаў разбудзіць прыватную ініцыятыву мясцовых жыхароў. У суседніх польскіх вёсках кожная хата — альбо малая прыватная гасцініца, альбо міні-бар, невялічкая крама. Сваіх мы таксама падахвочваем на тое, каб займаліся народнымі рамёствамі, прычым на ўзроўні майстар-класаў. Замежнаму наведніку будзе цікава, як у нас, напрыклад, валяюць валёнкі, пякуць пірагі альбо дамашні хлеб у печы, як гатуюць адмысловую яечню ці робяць настойку. І калі госць зможа не толькі пакаштаваць, але і сам спрычыніцца да працэсу прыгатавання, у яго з'явіцца цікавасць, а ў месцічаў магчымасць зарабіць капейку.

Для навукі межаў няма

Гутарку пра развіццё навуковай галіны Нацыянальнага парку мы працягваем з намеснікам дырэктара па навукова-даследчай працы Васілём АРНОЛЬБІКАМ.

— Мы распрацоўваем навуковыя асновы захавання біялагічнай разнастайнасці прыродных комплексаў Белавежскай пушчы, — пачаў расповед Васіль Міхайлавіч. — Навуковыя даследаванні вядуцца па васьмі раздзелах і ахопліваюць асноўныя віды флоры і фаўны вячыстага лесу. Напомню чытачам, што працягласць пушчы з поўначы на поўдзень складае 60 кіламетраў, а з захаду на ўсход — ад 10 да 50 кіламетраў. Яе плошча — 152,2 тысячы гектараў. Гэта ўнікальная лабараторыя для вывучэння біялагічнай разнастайнасці. Геаграфічнае становішча, кліматычныя і глебава-гідралагічныя ўмовы забяспечылі багацце і разнастайнасць флоры. На гэтай параўнальна невялікай тэрыторыі расце больш за тысячу відаў раслін, столькі ж відаў грыбоў, каля 550 відаў імхоў і лішайнікаў.

Тут прадстаўлена ўся разнастайнасць лясоў Беларусі. У пушчы захаваўся ўчастак практычна некранутых першабытных лясоў Еўропы з надзвычай багатай расліннасцю і жывёльным светам. Сярэдні ўзрост лясоў складае больш чым 100 гадоў, максімальны — 200-300 гадоў, а асобныя дрэвы дажываюць да 500-600 гадоў. Сапраўдны скарб парку — мохавыя і травяныя балоты на плошчы ў многія тысячы гектараў. Яны рэгулююць газавы склад атмасферы і гідралагічны рэжым і адыгрываюць важную ролю ў падтрыманні стабільнасці экасістэм і захаванні біяразнастайнасці не толькі раслінная, але і жывёльнага свету.

У пушчы жыве больш за 10 тысяч прадстаўнікоў фаўны. Свет млекакормячых прадстаўлены 59 відамі. Гэтая колькасць магла б быць нашмат большай, аднак асобныя віды на працягу стагоддзяў былі знішчаны. Ужо стараннямі чалавека некаторыя віды пазней адноўлены. І найпершы з іх — зубр. Як вядома, апошні прадстаўнік гэтага віду быў забіты ў 1919 годзе. Потым быў доўгі шлях адраджэння зубрынага статку. І цяпер іх у лесе 415. Вывучэннем папуляцыі зубра і праблемамі яго захавання займаецца кандыдат біялагічных навук Аляксей Буневіч. У нас ужо ёсць сур'ёзныя напрацоўкі па генетыцы віду. Апошнім часам актыўна вядзём навуковыя пошукі разам з польскімі калегамі. Апублікавана 27 сумесных навуковых прац. Пушчу мы з суседзямі разглядаем як адзіны лясны масіў.

У навуковым аддзеле старшы навуковы супрацоўнік Дзмітрый БЯРНАЦКІ, навуковы супрацоўнік Жанна ПЕТРЫКАВА і намеснік генеральнага дырэктара па навуковай працы Васіль АРНОЛЬБІК.

Старшы навуковы супрацоўнік, кандыдат біялагічных навук Аляксей БУНЕВІЧ.

— Работа па падрыхтоўцы новай намінацыі для ўключэння ў спісы сусветнай спадчыны таксама вядзецца разам?

— Гаворка ідзе аб уключэнні ў спісы агульнай часткі пушчы. Таму, зразумела, што і рыхтаваць дакументы трэба разам. Гэта была не наша ідэя, не суседзяў-палякаў. Ідэю падказалі прадстаўнікі Міжнароднага саюза аховы прыроды. Яны распрацавалі цэлы шэраг рэкамендацый, выкананне якіх дазволіць намініраваць векавы лес на прэтэндэнты ў спісы найпрыгажэйшай спадчыны чалавецтва. Эксперты ўказалі нам таксама на магчымасць намінацыі яшчэ па двух крытэрыях — выключна высокай біялагічнай разнастайнасці і значэнні для эвалюцыі відаў і экасістэм. Спецыялісты названай уплывовай структуры лічаць, што пушча вартая на міжнародным узроўні большага статусу, чым мае. Мы з гэтым згодны, таму і ўзяліся за працу разам з суседзямі.



Электронны «экскурсавод».



Экскурсавод музея Святлана БОГДАН.

Зараз тэрыторыя Сусветнай спадчыны пашыраецца да 70 тысяч гектараў на нашай частцы пушчы і да 60 тысяч на польскай. Для параўнання — раней было каля дзесяці тысяч гектараў агульнай плошчы. Ужо правялі чатыры агульныя нарады з польскім бокам па пытаннях выпрацоўкі комплексу мерапрыемстваў, якія паспрыяюць захаванню каштоўнасці пушчы. Будзе выпрацавана структура сумеснага кіравання гэтай тэрыторыяй. І недзе да пачатку лютага мы павінны здаць новае намінацыйнае дасье ў камітэт Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Зацвердзіць названы камітэт статус з улікам новых крытэрыяў ці не, у спісе Сусветнай спадчыны пушча будзе знаходзіцца заўсёды. Прыняцце новай намінацыі дазволіла б узмацніць значэнне ўнікальнага прыроднага аб'екта для ўсяго чалавецтва. І ў любым выпадку праведзеная работа не прападзе, яна паслужыць карысці абодвух нашых нацыянальных паркаў.

— Відаць, гэта не адзіны прыклад міжнароднага супрацоўніцтва навукоўцаў пушчы...

— Далёка не. Апошнім часам у нас узніклі плённыя адносіны з германскім нацыянальным паркам «Даліна Ніжняга Одэра». Гэта адзіны нацыянальны парк, прыродная тэрыторыя якога характарызуе рачныя даліны. Узнікла праграма супрацоўніцтва, якая ахоплівае нацыянальныя паркі трох краін: Польшчы, Беларусі і Германіі. Сама прырода, здаецца, падказала гэту ідэю. Нямецкі парк з'яўляецца трансграничным і пераходзіць на польскую тэрыторыю, ну а пушча для нас з палякамі таксама адна. Асноўнымі кірункамі сумеснай работы мы вызначылі: павышэнне стандартаў кіравання еўрапейскімі ахоўнымі тэрыторыямі, абмен вопытам у галіне аховы і маніторынгу навакольнага асяроддзя, турызму, навуковых даследаванняў, адукацыі студэнтаў і іншае.

— Што маецца на ўвазе пад праектам адукацыі студэнтаў?

— Так званая «летняя акадэмія». Такім чынам назвалі нашы партнёры праграму летняй практыкі студэнтаў трох краін. Запланавана стварыць агульны студэнцкі атрад прыкладна па 10 чалавек ад кожнай краіны, у які ўвойдуць студэнты профільных навучальных устаноў са сваімі выкладчыкамі. Па чарзе кожная краіна прадастаўляе навуковую базу свайго парку для правядзення даследаванняў. Практычнае навучанне студэнтаў пройдзе па чарзе: адно лета — у Беларусі, наступнае — у Польшчы, затым — у Германіі. Прадугледжаны таксама магчымасці для даследчай працы магістрантаў і аспірантам, а таксама сумесных даследаванняў для сталых навуковых супрацоўнікаў.

— Ці ёсць агульныя праекты на шляху развіцця турызму?

— Літаральна нядаўна ўзнік план распрацоўкі маркетынгавай канцэпцыі трансграничнага турызму. Мы спрабуем стварыць нейкі ўніверсальны турыстычны прадукт. Ну, напрыклад, турыст з Бельгіі прыехаў у нямецкі парк знаёміцца са славутасцямі, асаблівасцямі прыроды, а яму ненавязліва ў агульным пакеце прапануюецца рэкламны прадукт нашага і польскага паркаў. Парк «Даліна Ніжняга Одэра» унікальны выключнай разнастайнасцю птушак. Там адначасова збіраецца да 50 тысяч жураўлёў, да 200 тысяч гусей. Там ёсць усе ўмовы для назірання за птушкамі. Мы гатовы расказаць пра гэта нашым турыстам, а суседзі раскажуць пра асаблівасці нашых лясоў, пра нашага волата зубра і разнастайнасць жывёльнага і раслінага свету. Так шляхам узаемнай рэкламы можна дапамагаць адно аднаму ажыццяўляць турыстычны бізнэс.

Чым прывабіць турыста?

Адказ на пытанне ведае Валянціна Сяргеева, дырэктар турыстычна-гандлёвага комплексу нацыянальнага парку. Валянціна Мікалаеўна кіруе гасцінічнай гаспадаркай, грамадскім харчаваннем, гандлёвымі пунктамі. І ўсё гэта павінна працаваць бездакорна, каб не выклікаць нараканняў патрабавальнага кліента. Адно з галоўных падраздзяленняў названай службы — турыстычны аддзел. Спецыялісты па турызме мусяць не толькі ўзяць заяўку, прывеціць патэнцыйнага наведніка, але і данесці да яго думку аб прыгажосці, унікальнасці незвычайнага прыроднага аб'екта, каб узнікла жаданне бліжэй з ім пазнаёміцца.

Часцей за ўсё знаёмства з пушчай пачынаецца з музея прыроды. Варта сказаць, што да 600-гадовага юбілею запаведнага рэжыму, які адзначалі два гады таму, у Камянюках узвялі новы будынак. Тут размясціўся эколага-асветніцкі цэнтр з музеем прыроды. Арыгінальны дом са шкла і бетону звонку нагадвае невялікі палац. Але галоўнае — унутры. А там — шыкоўны музей з вялізнымі дыярамамі. Пры стварэнні яго канцэпцыі ставілі мэту дасягнуць максімальнага падабенства, так бы мовіць, з натурай. Таму, знаёмячыся з экспазіцыяй, наведнік мае магчымасць акунуцца ў чароўны свет лясных гукаў, прычым у розныя поры года. Вядома, вясновы хор птушак нікога не пакіне абыякавым, але не менш захапляльныя і зімовыя гукі лесу. Можна пачуць рог старадаўніх паляўнічых... І нават убачыць іх у выглядзе манекенаў. У новых дыярамах знайшлося месца старадаўнім пчалярам, князям і шляхце, розным людзям, што ў розныя часы асвойвалі нетры вялікага лесу.

У адной з залаў абавязкова залюбуешся макетам белага палаца неверагоднай прыгажосці. Гэта царскі паляўнічы палац, які быў узведзены ў 1894 годзе ў горадзе Беловеж (цяпер гэта польскі бок пушчы). У тым палацы было ажно 133 пакоі. І кожны меў назву: пакойчык ранішняй зары; дубовы, кляновы, аздобленыя адпаведнай драўнінай; паштовы пакой быў абклеены спрэс маркамі, гульнявы — картамі. Апартаменты імператрыцы архітэктар зрабіў у выглядзе гнязда ластаўкі. Гэтая прыгажосць засталася толькі на здымках сучаснікаў ды на макетах — да нашага часу палац не захаваўся.

У музеі абавязкова раскажуць, як прастора вакол Белавежскай пушчы ў старажытнасці ператваралася ў бяскрайняе мора. У лясным масіве, які ўзвышаўся, як востраў, жывёла ратавалася ад вады. Зараз аб тых часах нагадваюць старадаўнія пахаванні. А першыя згадкі пра лясы, што знаходзіліся ў раёне сучаснай пушчы, можна знайсці нават у «бацькі гісторыі» Герадота (V ст. да н.э.), пазней у Плінія і Тацыта. Гэтыя мясціны згадваюцца ў вядомым Іпацьеўскім летапісе 983 года. Само ж словазлучэнне «Белавежская пушча» ўпершыню з'явілася ў польскіх і літоўскіх граматах 1409 года і з таго часу трывала ўвайшло ва ўжытак.

Пра багатую на падзеі гісторыю векавога лесу, пра легендарныя царскія паляванні ў самым пачатку XX стагоддзя напісаў фундаментальную працу Георгій Карцаў. Гэты букіністычны рарытэт быў перавыдадзены параўнальна нядаўна па ініцыятыве нястомнага рупліўца на шляху папулярызацыі гісторыі пушчы Вячаслава Семакова. Вячаслаў Васільевіч, дарэчы, напісаў некалькі кніг, у якіх узнавіў многія гістарычныя, палітычныя, амаль дэтэктыўныя падзеі, сведкамі якіх стаў на працягу стагоддзяў гэты лес.

На жаль, палітыка, царскія забавы і прыхамаці далёка не заўсёды служылі на карысць пушчы. У музеі вам абавязкова раскажуць, якую мядзведжую паслугу аказала пушчы Кацярына II, калі дазволіла паляванне на ўсіх звяроў, акрамя зубра. Колькасць звяроў тады значна скарацілася, а мядзведзі і бабры былі цалкам вынішчаны.

Навуковыя супрацоўнікі паведамяць вам, як ганаравацца яны арланам-белахвостам, што пасяліўся тут параўнальна нядаўна. Гэтая птушка з размахам крылаў у два з паловай метры ахоўваецца ва ўсім свеце. У пушчы гняздуюцца ўжо тры пары. А побач мірна суіснуе жоўтагаловы каралёк вагой усяго ў пяць грамаў.

Фота Алега ШЫЛАВА.

Разам з беларускімі Дзядулем Марозам, Матуляй-Зімой і ўнучкай Снягуркай расійскага Дзеда Мароза з днём народзінаў прыехалі павіншаваць украінскі Святы Мікола, фінскі Ёлапукі, нямецкі Санта Клаус і Дзяды Марозы іншых краін.

У пераднавагодні час прыбавілася працы ў турыстычным аддзеле. А гэта паказчык папулярнасці пушчы, упэўнены начальнік аддзела Аксана БАГАЛЕЙША і вядучы спецыяліст Таццяна ЗАЙЦАВА.

Частка жыццё звяроў і птушак уяўляе сабой проста захапляльныя гісторыі. Не кожны далёкі ад лясной тэмы чалавек ведае, што ў зубрыным статку пануе матрыярхат. Суродзічаў водзіць вопытная зубрыца. А нараджаць дзіцяня яна сыходзіць далёка ўглыб лесу. І ўсё таму, што зубр — дрэнны бацька. Можа прыціснуць і затаптаць малое. Затое матуля корміць зубраня малаком амаль два гады.

Фантастычнымі, на першы погляд, якасцямі валодаюць многія птушкі. Барадатая няясыць можа варочаць галавой на 270 градусаў. Гэта адразу і ўявіць цяжка: галава круціцца, як цацачны шарык. А маленькі крапіўнік — хто б мог падумаць? — з першых мнагажэнцаў у свеце. Увесну ён шукае сабе некалькі сяброўак, але паводзіць сябе не як легкадумны донжуаністы кавалер, а з поўнай адказнасцю — кожнай будуе гняздо.

У захапляльнае падарожжа па тайнах царства звяроў і птушак вас паклічуць не толькі супрацоўнікі музея. Спецыялісты турыстычнага аддзела прапануюць пешыя, веласіпедныя, аўтамаршруты, дзе цікаўны наведнік зможа ўбачыць многае на свае вочы. Як расказала начальнік гэтага аддзела Аксана Багалейша, асаблівай папулярнасцю ў турыстаў карыстаецца 16-кіламетровы веласіпедны маршрут «Звярыны пераход». На працягу падарожжа вам сустрэнецца 200-гадовая прыгажуня-елка вышынёй больш за 40 метраў, праўда, не самая старая са сваіх суродзічаў. Непадалёку больш за 250 гадоў растуць дзве сасны з шырокай меднай карой. Тая прыгажосць і сіла, якімі надзяліла гігантаў прырода, заварожвае. Праз колькі кіламетраў веласіпедыст сустрэне параўнальна малады дуб, яму толькі трохі за 300 (у пушчы ёсць дубы, якім па 700 гадоў). Па дарозе трапляюцца нізіннае балотца і лясная сажалка, а таксама месца, дзе была вузкакалейка.

Падчас Першай сусветнай вайны немцы ўзяліся за прамысловае асваенне пушчы. За 18 месяцаў палонныя французскія і рускія салдаты праклалі 325 кіламетраў вузкіх чыгуначных каляін. Па пуцях увесь час хадзілі маленькія паравозы і цягнулі бярвенне з запаведнага лесу. Да вясны 1918 года акупанты вывезлі 4,5 мільёна кубаметраў драўніны. Такога здзеку пушча не цярпела за паўтысячы папярэдніх гадоў. Сёння на месцы некаторых вузкакалеек пракладзены асфальтавыя дарогі.

На адной з дарог ёсць звяроны пераход. Сакрэт папулярнасці просты: дарога пракладзена ў лагчыне з крутымі схіламі. Звяры адшукалі зручны спуск і карыстаюцца ім. Кожны дзень тут з'яўляецца мноства новых слядоў казулі, дзіка, аленя. Ранкам і ўвечары цалкам верагодна ўбачыць дзікіх насельнікаў лесу.

У пешаходны маршрут даўжынёй усяго каля шасці кіламетраў Аксана Багалейша запрашае сапраўдных гурманаў назірання. Гэтую экалагічную сцяжыну назвалі «Азёрным пярсцёнкам». Яна праходзіць сярод сасновых, яловых і чорнаальховых лясоў, якія чаргуюцца з адкрытымі ўчасткамі поймы ракі Правая Лясная, балотцамі, невялікімі палянамі і закінутымі садамі. Упрыгажэннем маршруту служаць невялікія штучныя азёры, створаныя ў 70-х гадах мінулага стагоддзя для падтрымання гідралагічнага рэжыму тэрыторыі. Яны чыстыя, а цёмны колер вады гаворыць за тое, што на дне торф. Па дарозе сустрэнецца сапраўдны ўнікум прыроды — 200-гадовы ядловец. Ён славіцца тым, што ачышчае навакольнае асяроддзе ад хваробатворных бактэрый.

Вясной не адарвеш вока ад белага дывана ветраніцы дубраўнай, сіняй фіялкі, пяшчотнага сну. А летам кветкі і травы аж буяюць на лугах і балотах.

На маршруце можна пачаставацца чарніцамі, малінамі, бліжэй да восені сустракаюцца розныя грыбы. На возеры Плянта-1 абсталявана месца для адпачынку на радасць аматарам пакупацца і пазагараць. Цягам сцяжыны сустракаюцца лаўкі, дзе можна пасядзець, паслухаць спевы птушак, шолах лістоты, адцягнуцца ад штодзённага тлуму і пабыць самнасам з прыродай.

Для тых, хто шануе велічнасць і загадкавасць цара дрэў, прапануецца маршрут «Запаведная дуброва». Тут вы ўбачыце звычайны дуб, скальны дуб, а яшчэ прыродны фенамен — дрэва-«трайнік» скальнага дуба. Ствол гэтага дрэва раздзелены на тры ствалы. Але не толькі дубы заварожаць аматара прыроды. Так званыя «каўняровыя» сосны вы дакладна больш нідзе не ўбачыце. Ствол такога дрэва ўпрыгожваюць шматлікія «каўняры» з уздыбленай кары. Вучоныя да гэтай пары не могуць вызначыць прыроду з'явы. А яно сабе расце і пачувае сябе добра.

Хто прыехаў у пушчу, вядома ж, захоча паглядзець на славутую Царскую паляну, авеяную чуткамі і легендамі. Так і называецца веласіпедны маршрут працягласцю 10 кіламетраў. Гэтая паляна ў гушчары лесу ўзнікла як мінімум некалькі стагоддзяў таму. Да нашых дзён дайшло некалькі варыянтаў яе назвы: «гасцявая», «каралеўская», «царская». Паводле некаторых звестак, тут учыніў паляўнічы пір кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Потым паляна ператварылася ў месца банкетаў і паказальных выкладаў паляўнічых трафеяў для іншых вяльможаў і венцаносных гасцей. У XX стагоддзі традыцыю падтрымалі генеральныя сакратары і іншыя прадстаўнікі партыйна-савецкай эліты. У нашы дні на паляне праводзяцца святы і масавыя мерапрыемствы.

На маршруце сустракаецца дуб-пустэльнік, дуб чырвоны, які атрымаў назву за колер асенняй лістоты, а таксама бяроза з «галавой зубра». Вялікія нарасты на дрэвах называюць капамі. Творчасць прыроды не мае межаў: дзіўнасць формы капа часам ператварае яго ў казачныя творы. Нараст на бярозе, пра якую ідзе гаворка, быў заўважаны каля 20 гадоў таму. На ствале сядзіць сапраўдная галава старога мацёрага зубра. Лепшае месца для фотаздымка на памяць.

Турыстычны аддзел мае прапановы на цэлы шэраг маршрутаў. І калі летам вандроўнікам выдаюць напракат веласіпеды, то ўзімку мяркуецца наладзіць пракат лыж і санак. А яшчэ зімой асабліва папулярны і любімы ўсёй дзятвой маршрут — у рэзідэнцыю Дзеда Мароза.

600-гадовы дуб-волат — сведка тых далёкіх часоў, калі тут палявалі князі ВКЛ, польскія каралі, рускія імператары...

Таццяна ВАСІЛЮК цікава раскажа пра сядзібу Дзядулі Мароза, пра кожны куточак пушчы.

Адзін з залаў рэстарана.

У такіх прасторных утульных пакоях гасцінічнага комплексу змогуць адпачыць турысты.

Спартыўны комплекс з басейнам.

У рэзідэнцыю Дзеда Мароза

У госці да Дзеда Мароза і яго ўнучкі Снягуркі едуць галоўным чынам дзеці, і не толькі з нашай краіны. У спісе, які старанна вядзе дзядуля, госці амаль з сотні краін свету. Едуць, бо маёнтак яго — сапраўдная казка, асабліва зімой, у пераднавагоднія дні. Калі ж зіма паленавалася як след заснежыць рэзідэнцыю, у век тэхнічнага прагрэсу гэта — не праблема. У дзеда ёсць спецыяльная тэхніка, якая па камандзе надзьме снегу колькі хочаш. А на белым фоне дамкі-церамкі ззяюць рознакаляровым святлом, казачныя героі сустракаюцца ледзь не на кожным кроку тутэйшага падарожніка.

Работа ж галоўнага беларускага Дзеда Мароза — сустрэць і прывеціць гасцей. У школьнікаў ён абавязкова распытае, як вучацца, якім спортам займаюцца, якія гурткі наведваюць. Дарослым трэба пажадаць шчасця і дабрабыту. Госці бываюць розныя ў сядзібе. А яшчэ яны пішуць лісты. У вялікіх куфрах дзедавай скарбніцы захоўваюцца лісты, на сценах вісяць малюнкі, на паліцах складзены падарункі, якія даслалі дзеці. Усе малыя аўтары лістоў, якія напісалі дакладны зваротны адрас, атрымліваюць адказы і віншаванні казачнага Дзеда.

Работнікі казачнага царства паведамілі, што ў гэтым сезоне праграма наведвання рэзідэнцыі змянілася. Цяпер гасцей будуць сустракаць не толькі казачныя, але і анімацыйныя героі, будзе шмат новых забаўлянак і сюрпрызаў. Над гэтым папрацавалі спецыялісты. Падрабязнасці пакуль не раскрываюцца. Таму варта наведаць сядзібу і ўсё ўбачыць.

Лясная фея — пераднавагодняя памочніца Дзеда Мароза.

УНП 200056212

Святлана ЯСКЕВІЧ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ і з архіва прадпрыемства.

«Прамая лінія» газеты «Звязда» і радыёстанцыі «Мір»

ЛЕПШЫЯ ІМУНАМАДУЛЯТАРЫ — ВІЛЬГОТНАЕ ПАВЕТРА І КВАШАНАЯ КАПУСТА

На пытанні слухачоў і чытачоў адказала дацэнт кафедры інфекцыйных хвароб і дзіцячых інфекцый Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук, урач вышэйшай катэгорыі Алена КІШКУРНО.

(Працяг. Пачатак у нумары за 6 снежня.)

☎— Мінская вобласць, Ірына. Што можна сказаць аб такім прэпараце, як ІРС-19? Праўда, чамусьці ён знік з аптэчнай сеткі...

— Прэпарат ІРС-19 — добры, ужываць яго можна. Трэба толькі мець на ўвазе, што бясконца павышаць імунітэт нельга. Іншымі словамі, нармальны імунітэт не павысіш. Павышэнне датычыцца толькі тых сітуацый, калі ён зніжаны. Існуюць неспецыфічныя прэпараты, якія павышаюць супраціўляльнасць арганізма ў такіх сітуацыях. ІРС — якраз той прэпарат, які спрыяе выпрацоўцы абарончай слізі ў слізістай поласці носа.

Рот і насаглотка з'яўляюцца першым і самым важным бар'ерам на шляху спынення інфекцыі. Калі ў нас вільготнасць паветра складае 30-40 працэнтаў, наша слізістая перасыхае, абарончая слізь не выпрацоўваецца. Вось чаму зараз акцэнт робіцца на выкарыстанні прэпаратаў, якія ўвільгатняюць слізістую насавых хадоў. Ёсць і спецыяльнае абсталяванне, якое дапамагае рэгуляваць вільготнасць паветра падчас ацяпляльнага сезона.

Па якой прычыне ў аптэках адсутнічае ІРС-19, я не ведаю, але раю падумаць аб тым, што асноўным застаецца дасягненне ў памяшканнях вільготнасці не менш як 50 працэнтаў. Раю таксама ўвільгатняць слізістую носа з дапамогай шэрагу іншых прэпаратаў падобнага дзеяння.

— А як доўга трэба піць імунамадулятары накшталт арпетолу?

— Тыя, што прадаюцца без рэцэпта, як мінімум, не прынясуць ніякай шкоды. Яны, сапраўды, павышаюць здольнасць клетак процістаяць вірусам. Але прымаць іх працягла і нават вельмі працягла трэба людзям з сапраўды аслабленым імунітэтам, астатнім — толькі тады, калі ёсць праблема, а значыць, пэўным курсам. Не абавязкова самому спрабаваць зразумець, ці ёсць у вас праблема з імунітэтам. Важна, што ў чалавека з нармальнай імуннай сістэмай грып праходзіць за 5 дзён. Калі ж гэтага не адбылося, урач сам будзе вырашаць, што перашкодзіла ў канкрэтным выпадку выздаравець за такі час.

☎— Орша, Кацярына Аркадзьеўна. Я пенсіянерка, не працую. Дзеці з унукамі жывуць асобна. Наколькі я разумею, шансаў падхапіць грып у мяне не многа. Тым больш, я і не памятаю, калі ў мяне было такое захворванне. Хранічныя хваробы, вядома, ёсць — артэрыяльная гіпертэнзія, некалькі гадоў таму перанесла інфаркт міякарда. Мяне цікавіць, ці правільна я раблю, што не прышчэпліваюся?

— Існуюць паказанні да абавязковай вакцынацыі. Акрамя людзей з хранічнай паталогіяй і зніжаным імунітэтам, туды ўваходзяць і людзі пенсійнага ўзросту. Грып сам па сабе можа правакаваць інфаркт міякарда, паколькі гэты вірус адмоўна ўздзейнічае на сасуды міякарда. Такім чынам, я б асабіста раіла вам прышчэплівацца. Не трэба баяцца гэтага працэсу. Усё роўна вы ходзіце ў магазін, кантактуеце з сябрамі, сваякамі. Рызыка захоўваецца.

☎— Магілёўская вобласць, Алена Віктараўна. Чытала, што вірусныя рэспіраторныя інфекцыі праходзяць літаральна за тыдзень. Калі ж гэтага не адбылося, значыць, далучылася бактэрыяльная інфекцыя. У такім выпадку прызначаюць антыбіётыкі. Аднак некаторым дзецям антыбіётыкі прызначаюць значна раней. У якіх выпадках гэта робіцца? Як наогул не дапусціць далучэння бактэрыяльнага ўскладнення?

— Любую вірусную інфекцыю, як і грып, трэба вылежаць. Неабходна даць сабе адпачынак як мінімум на 3-5 дзён. Для грыпу гэта адназначна 5 дзён. Калі ж не вылежаў, значыць, чакай ускладненняў і, жартоўна кажучы, не здзіўляйся, што памёр. Мы можам не вытрымліваць ніякія рэкамендацыі ўрачоў, але мы павінны ўсведамляць ступень небяспекі.

Грып выклікае мацнейшае зніжэнне імунітэту, і таму цесным чынам ён звязаны з ускладненнямі. У тым ліку з далучэннем бактэрыяльнай інфекцыі. У яе з'яўляецца больш шанцаў, каб праявіць сябе. Для кожнага ўзросту існуе свой час, які неабходна «адтэмпературыць». Для малых дзяцей — да 3 дзён, для дарослых — да 5. Калі ж ліхаманкавы стан зацягваецца, доктар павінен высветліць, з чым гэта звязана. Адна справа, калі хвароба мае цяжкую форму, і іншая — калі далучылася захворванне бактэрыяльнага паходжання, калі патрабуецца спецыяльнае лячэнне антыбіётыкамі. Без доктара ў такіх выпадках адназначна не абысціся.

☎— Мінск, Вольга. Зараз вельмі актыўна прапагандуюцца і рэкламуюцца так званыя імунамадулятары. Каму іх трэба прымаць? У якой колькасці? Калі пачынаць?

— Нягледзячы на рэкламу, усе таблеткі прапісвае доктар з улікам вашай хранічнай паталогіі, станам імунітэту. Таму гаварыць аб самастойным прыёме гэтых сродкаў немагчыма. У лепшым выпадку вы проста выкінеце грошы на вецер. Наогул кожны ўрач ведае, што рызыка ад любога лячэння не павінна быць вышэй за само захворванне.

А самалячэнне — заўсёды рызыка. Рэкамендаваць усім і кожнаму можна, напэўна, яблыкі, лімоны, і тое ў абмежаванай колькасці... Прымяненне імунамадулятараў нават з прафілактычнай мэтай павінен распісаць урач. Калі прапісаную схему не вытрымліваць, гэта адпаведна таму, каб прыкласці таблеткі да галавы. Правілы тут жорсткія. За мяжой такіх прэпаратаў адзінкі, і іх прызначаюць толькі ў пэўных сітуацыях, а не для шырокага выкарыстання ў час узнясення эпідэміі.

☎— Мінская вобласць, Ангеліна. Раскажыце, калі ласка, як правільна лячыць насмарк і кашаль? Што б вы рэкамендавалі з народных сродкаў?

— Тут мае значэнне ўзрост. У малога дзіцяці заўсёды пры насмарку ёсць небяспека запалення вуха і развіцця бранхіту. Таму вам трэба кантактаваць з педыятрам, каб той прызначыў спецыяльныя кроплі, якія будуць хутчэй купіраваць і вылечваць насмарк. У дарослага насмарк можна лячыць з дапамогай прамывання носу салянным растворам — ён павінен быць вельмі ашчадным, капаць трэба 2-3 разы ў дзень. Варта праводзіць і дэзынтаксікацыю, каб дапамагаць арганізму пазбаўляцца ад таксінаў. Журавіны, брусніцы добра стымулююць мочааддзяленне.

Адыходу макроты будзе спрыяць цёплае малако з содай, чорная рэдзька з мёдам, проста цёплы чай. Трахея знаходзіцца блізка да страваводу, і таму будзе станоўчы эфект. Акрамя таго, такім лячэннем нікому нельга нашкодзіць. Прэпараты ж ад кашлю прызначае толькі доктар, паколькі яны валодаюць розным дзеяннем і не ўсе будуць працаваць у першыя суткі. Ёсць цукровыя сіропы для дзяцей, якія нібыта цалкам бяспечныя і могуць набывацца без рэцэпта. Але нават па іх прымяненні трэба кансультавацца з доктарам, паколькі адна трава — трыпутнік — валодае супрацьзапаленчым дзеяннем, другая — чабор — можа выклікаць рвоту і г.д.

☎— Віцебск, Алена. Дзяўчынцы 4 гады. Урачы мяркуюць, што ў яе вузкія насавыя праходы, адэноіды 1-2 ступені, алергічныя рэакцыі. 5-6 разоў на год (і працягла) хварэе на рыносінусіты, трахеіты, фарынгіты, бранхіты. Тэрапія: прамыванні салінам, фізіятэрапія, інгаляцыі з дыяксідзінам, бератэкам, шчолачныя. Прымяняліся складаныя кроплі, парлазін, фліксаназэ, антыбіётыкі. Зняць ацёк слізістай пакуль не ўдаецца. Лякам у раённай бальніцы... Што нам рабіць?

— Вам неабходна прыехаць на кансультацыю ў прафесарска-кансультатыўны цэнтр Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, які размяшчаецца на базе Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння ў Мінску. Тэлефон рэгістратуры: 8 (017) 265 06 25. Неабходна параіцца з урачом-інфекцыяністам або педыятрам. Вазьміце, калі ласка, выпіску аб вашых ранейшых даследаваннях і прыязджайце з дзіцем.

Святлана БАРЫСЕНКА.
(Працяг будзе.)

ШЫШКА ЗВЫЧАЙНАЯ, ЗАТОЕ НАСЕННЕ — ЗАЛАТОЕ

Арганізацыі Мінлясгаса распачалі нарыхтоўку лесанасеннай сыравіны. Ужо сабрана 35 тон шышак звычайнай сасны, 97,2 тоны — еўрапейскай елкі, 25,6 тоны — жалудоў чарэшчатага дуба, паведаміла рэдакцыі прэс-сакратар міністэрства Ружэна НАВІЦКАЯ.

Адметна, што сёлета значна лепшы ўраджай атрыманы ад еўрапейскай елкі, якая добра пладаносіць з пяцігадовым цыклам. Летась лясгасы краіны здолелі нарыхтаваць толькі некалькі тон шышак гэтай каштоўнай хваёвай пароды. А зараз толькі на Віцебшчыне, да прыкладу, сабрана ўжо 47 тон. А ўвогуле, для стварэння чатырохгадовага запасу лесанасеннага матэрыялу еўрапейскай елкі — да наступнага ўраджайнага піку — лясгасы павінны нарыхтаваць каля 2 тысяч тон насення гэтай пароды. Гэтага будзе дастаткова для правядзення запланаваных аб'ёмаў лесааднаўлення і лесаразвядзення. З кожнай тоны шышак насенне складае ўсяго 1-1,3 працэнта ў залежнасці ад якасці таго насення.

Што датычыцца насення звычайнай сасны, дык тут сітуацыя стабільная: штогод лясгасы нарыхтоўваюць каля 4 тон насення гэтай пароды. Гэтых аб'ёмаў хапае, каб праводзіць лесааднаўленчыя работы ўнутры краіны, ды яшчэ і частку экспартаваць, чым не ўпускаюць магчымасць скарыстацца некаторыя гаспадаркі.

Ураджай жалудоў дуба, дадалі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі, таксама сёлета чакаецца неблагім.

Сяргей РАСОЛЬКА.

УРАЧЫ Ў ЧЭРГАХ... ДА ПАЦЫЕНТАЎ

На Віцебшчыне праводзіцца комплексная дыспансэрызацыя насельніцтва. Яе асаблівасць заключаецца ў тым, што медыкі ў складзе брыгад прыязджаюць на прадпрыемствы і самі «выстройваюцца ў чэргі», каб агледзіць пацыентаў. Так было нядаўна ў Оршы, дзе людзі ў белых халатах даследавалі стан здароўя работнікаў каля дваццаці прадпрыемстваў, арганізацый. У гэтым медыкам дапамагалі «вузкія спецыялісты» з Віцебска, а таксама навукоўцы і выкладчыкі Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

Паралельна вывучаліся ўмовы працы на прадпрыемствах, кіраўнікі якіх атрымалі канкрэтныя рэкамендацыі: што трэба зрабіць, каб іх работнікі менш хварэлі.

Аршаншчына стала першай

Як паведаміў «Звяздзе» **начальнік упраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама, прафесар Юрый ДЗЯРКАЧ**, губернатарам Віцебшчыны былі дадзены адпаведныя даручэнні па правядзенні дыспансэрызацыі. Усяго былі абследаваны больш за дзве тысячы чалавек. Па выніках дыспансэрызацыі, на лячэнне было накіравана больш за 600 чалавек — і не толькі ў Оршу, але і ў абласныя ўстановы аховы здароўя. Акрамя таго, у некаторых работнікаў была выяўлена на ранніх стадыях анкалагічная паталогія. Як вядома, своечасовае лячэнне гарантуе добры вынік.

Праца па дыспансэрызацыі працаздольнага насельніцтва будзе прадоўжана па ўсёй вобласці. Ужо зараз ідзе маніторынг у Полацку, Наваполацку, у Глыбоцкім і Шаркоўшчынскім раёнах і іншых. Галоўная мэта дыспансэрызацыі — зрабіць даступнай якасную медыцыну, «прышчапіць» грамадзянам прыхільнасць да наведвання медыкаў і лячэння. І гэта не разавая кампанія — такая работа будзе праводзіцца пастаянна.

Пасля агляду эканамічна актыўнага насельніцтва будзе праводзіцца работа па абследаванні стану здароўя грамадзян пажылога ўзросту, асабліва тых, хто пражывае ў глыбінцы.

Каб не баяліся ўрачоў

Сярэднестатыстычны грамадзянін не мае звычкі хадзіць да ўрача і часта звяртаецца па дапамогу, калі ўжо не можа трываць болю. У выніку фіксуюцца запушчаныя выпадкі захворванняў. Таму медыкі і пайшлі ў народ самі.

Як расказаў **Уладзімір ПЛЫТКЕВІЧ, галоўны ўрач установы аховы здароўя «Аршанская цэнтральная паліклініка»**, сярод медыкаў, якія бралі ўдзел у складзе выязных брыгад, былі тэрапеўты, хірургі, стаматолагі, гінеколагі, псіхолагі і гігіеністы. Былі ўключаны ў брыгады і нарколагі. Урачы спланавалі сваю работу так, каб работнікам прадпрыемстваў было зручна прыйсці да іх для агляду. Улічваліся зменнасць працы людзей і графік работы. Медыкі дамагліся ўзаемаразумення з кіраўнікамі прадпрыемстваў, каб яны маглі даць людзям час «прабегчыся па ўрачах».

Дарэчы, падлічана, што «працоўныя страты» ў Оршы склалі больш за 337 тысяч дзён, а дзяржаўныя выдаткі па выплаце дапамог у сувязі з захворваннем дасягнулі 16,6 мільярда рублёў. А колькі прамысловасць страціла з-за нявырабленай прадукцыі? Цікавыя лічбы былі атрыманы па выніках праведзенага маніторынгу. Аказваецца, сярод работнікаў прадпрыемстваў здаровых толькі 29 працэнтаў. Практычна здаровых жанчын — 25,7 працэнта. А здаровых мужчын — работнікаў прадпрыемстваў — 24,3 працэнта. Таксама цікава, што жанчыны больш ахвотна ішлі на агляд: абследаваны 96,8 працэнта, мужчын — 86 працэнтаў.

Здаровым — прэміі

Ужо зроблена і будзе рабіцца многае, каб стварыць нармальныя ўмовы для работнікаў. У прыватнасці, на прадпрыемстве «Світанак» палепшылі ўзровень асветленасці сарака працоўных месцаў швачак. Правялі капітальны рамонт санітарных вузлоў. Устанавілі ў вытворчых цэхах новыя вокны і 400 настольных вентылятараў. Выдзелена дзесяць пуцёвак для аздараўлення і санаторна-курортнага лячэння. У выніку работніцы хварэюць значна радзей, чым летась.

На авіярамонтным заводзе прыведзены ў належны стан вытворчыя памяшканні. Часовая непрацаздольнасць на гэтым прадпрыемстве таксама зніжаецца. Дарэчы, на двух пералічаных прадпрыемствах, як высветлілася, працуе найменшая колькасць здаровых людзей.

На Аршанскім хлебазаводзе — філіяле РУВП «Віцебскхлебпрам» — работнікам, якія ў гэтым маюць патрэбу, выдзяляюць па 60 тысяч рублёў на агульнаўмацавальнае лячэнне. На мясакансервавым камбінаце прыведзены ў парадак цэхі.

На льнокамбінаце вядзецца мадэрнізацыя і замена вентыляцыйнай сістэмы, прымаюцца іншыя меры, каб людзі працавалі ў нармальных умовах. Работніцам выдадзены 25 пуцёвак на лячэнне ў санаторыях. 60 працэнтаў кошту наведвання басейна аплачвае прафкам. Па 200 тысяч рублёў могуць атрымаць тыя, хто не хварэе — не маюць на працягу года бальнічных лістоў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Орша — Віцебск.

Памяць

ЗАСТАВАЦЦА ЧАЛАВЕКАМ! У ЛЮБЫХ АБСТАВІНАХ

Чаму нас вучыць ахвярапрынашэнне Максіміліяна Марыі Кольбэ?

Гродзенскі дзяржаўны музей гісторыі рэлігіі запрашае на выставу, прысвечаную 70-годдзю пакутніцкай смерці святара, манаха — францысканца Максіміліяна Марыі Кольбэ, апекуна Гродзенскай рымска-каталіцкай дыяцэзіі, які ў 1920-гады жыў і працаваў у гарадзе над Нёманам. У 1941 годзе ён, каб выратаваць зусім незнаёмага чалавека, бацьку сям'і, пайшоў на смерць у канцлагеры Асвенцім.

Намеснік дырэктара музея, аўтар выставы «Захаваўшы жыццё...» Ігар Ганчарук бачыць яе мэту найперш у маральным прыкладзе для нашых сучаснікаў:

— У нас зараз бурлівае стагоддзе, калі шмат хто замыкаецца ў сабе, на ўласных праблемах. Азірніцеся вакол, праявіце больш клопатаў аб блізкіх людзях, тых, каму патрабуецца дапамога! Менавіта гэтаму вучыць подзвіг Максіміліяна Марыі Кольбэ, бо хіба ж можа быць большай любоў да чалавека, чым жаданне аддаць за яго выратаванне сваё жыццё? Вось у чым этычны сэнс выставы.

Пабудаваць выставу Ігару Ганчаруку дапамог экспанатамі айцец — францысканец, ксёндз Юзаф Макарчык — пробашч гродзенскага касцёла Маці Божай Анёльскай. Менавіта ў парафіі пры гэтым храме служыў душапастырам Максіміліян Марыя Кольбэ з верасня 1922-га па лістапад 1927 года.

Сённяшні касцёл быў асвечаны ў 1744 годзе, прычым ён ніколі не зачыняўся, і таму захавалася шмат гістарычных рэліквій. Напрыклад, на выставе прадстаўлены ўнікальныя рукапісныя кнігі — рэестр урачыстых набажэнстваў у гэтым касцёле ў XVIII стагоддзі і статут францысканцаў канца XVIII — пачатку XIX стагоддзя. Можна таксама ўбачыць традыцыйнае адзенне манаха — францысканца, літургічную тканіну. А аднымі з самых каштоўных экспанатаў з'яўляюцца, пэўна, епархіяльныя кнігі з аўтографамі Кольбэ і яго знакамітага сучасніка, ксяндза Мельхіёра Фардона, якога яшчэ пры жыцці называлі ў Гродне анёлам, бо ён дапамагаў усім людзям, нягледзячы на іх веру і нацыянальнасць. Гэта ён падчас германскай акупацыі ў 1915 годзе выратаваў ад расстрэлу гродзенскую пажарную каманду...

Але вернемся да асобы Максіміліяна Марыі Кольбэ. На выставе прадстаўлены яго рукапісы з запісам ... тэхнічных вынаходніцтваў. З чаго б гэта? Аказваецца, тлумачыць Ігар Ганчарук, падчас вучобы ў міжнароднай францысканскай семінарыі ў Рыме Кольбэ вельмі зацікавіўся фізікаматэматычнымі дысцыплінамі і нават працаваў над праектам касмічнага карабля, які мог даляцець да іншых планет. Але, вядома ж, перамагло ў ім манаскае пакліканне.

Гродзенскі перыяд жыцця Кольбэ на выставе адлюстраваны фатаграфіямі яго келлі, працы за пісьмовым сталом, а таксама абраза з выявай Маці Божай Беззаганнай (над друкарскім станком), культ якой прапагандуюць францысканцы. Гэты абраз (на здымку) адрэстаўраваў гродзенскі майстар Уладзімір Кіслы, і цяпер яго можна бачыць на выставе ў музеі гісторыі рэлігіі. Як і нумары часопіса «Рыцар Беззаганнай», і іншай літаратуры для вернікаў, якая выдавалася Максіміліянам Марыя Кольбэ падчас яго працы ў Гродне. Дарэчы, гэты часопіс выдаваўся і на беларускай мове, а таксама на польскай, харвацкай, партугальскай, іспанскай, японскай ...

Пасля Гродна шлях Кольбэ ляжаў у Варшаву — непадалёк ад горада ён заклаў буйнейшы ў каталіцкім свеце манастыр Непакалянаў, а затым распачаў місіянерскую працу ў Японіі. Другую сусветную вайну ён сустрэў кіраўніком манаскай супольнасці Непакалянава.

— Для нацыстаў асоба святара, які нёс святло любові да блізкага чалавека, ставіўся да людзей з пункту гледжання хрысціянскай маралі, была больш небяспечнай, чым узброены вораг. Вось чаму яны вырашылі знішчыць яго, — лічыць Ігар Ганчарук.

У канцлагеры Асвенцім Максіміліян Марыя Кольбэ і праявіў сапраўдны гераізм. Каб выратаваць, здавалася б, зусім чужога чалавека, бацьку сям'і Францішка Гаёўнічака, святар пайшоў замест яго на галодную смерць у лагерным бункеры. І быў дабіты фашыстамі ін'екцыяй фенолу.

Самае неверагоднае, сапраўдны цуд, што ахвяра Кольбэ была прынята, зазначае Антоніа Сікары ў сваёй кнізе «Партрэты святых». Лагерфюрэр згадзіўся на ахвярапрынашэнне, якое было выклікана чалавечнасцю, дабрынёй і спагадай — менавіта тым, супраць чаго змагаўся нацызм. Гітлеравец мог паслаць на смерць абодвух — Гаёўнічака і святара, але не зрабіў гэтага. І смерць Кольбэ стала не ўступкай сіле, а вышэйшым праяўленнем хрысціянскай любові.

...10 кастрычніка 1982 года з нагоды кананізацыі Максіміліяна Марыі Кольбэ на плошчы святога Пятра ў Рыме сабралася каля 200 тысяч чалавек. Сярод удзельнікаў свята быў і той самы Францішак Гаёўнічак. З жонкай, дзецьмі і ўнукамі.

— Наша выстава — як памяць аб усіх святарах розных канфесій, якія пацярпелі ў гады Другой сусветнай вайны, — кажа Ігар Ганчарук.

Ды і не толькі аб святарах. Наведаўшы гэтую выставу, нельга не ўзгадаць і подзвіг яшчэ аднаго выдатнага чалавека, які жыў у Гродне, — заснавальніка заапарка Яна Каханоўскага. У 1942 годзе партызаны забілі нямецкага афіцэра, паранілі паліцэйскага, і гітлераўцы ўзялі ў заложнікі 100 жыхароў, у асноўным прадстаўнікоў гарадской інтэлігенцыі. Кожнага чацвёртага з іх павінны былі расстраляць, і Каханоўскі, не трапіўшы ў лік гэтых ахвяр, атрымаў магчымасць выйсці на волю. Але ён прапанаваў сябе ў лік прыгавораных да смерці замест дырэктара пачатковай школы, бацькі шасцярых дзяцей Юзафа Вэвюрскага. Нямецкі афіцэр даў Яну Каханоўскаму 10 хвілін на роздум, але той свайго рашэння не змяніў. І быў расстраляны разам з іншымі заложнікамі на тэрыторыі форта ў Навумавічах.

Навечна, як і Максіміліян Марыя Кольбэ, пакінуўшы нам прыклад, што нават у самых цяжкіх жыццёвых абставінах можна заставацца сапраўдным чалавекам — чулым і мужным.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

по продаже недвижимого имущества, находящегося в республиканской собственности, и права заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания, которые составляют единый предмет аукциона

Организатор аукциона: Фонд «Минскоблгосимущество», г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел.: (8017) 500 47 10, (8017) 224 39 76, (8017) 228 60 13.
Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Чкалова, 5.

Дата и время проведения аукциона: 22 декабря 2011 г. в 9.30

Текущий (расчетный) счет для внесения задатка для участия в аукционе: № 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, УНП 100128686, получатель платежа – фонд «Минскоблгосимущество». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе.

Недвижимое имущество и право заключения договора аренды земельного участка. **Капитальное строение** (инв. № 615/С-16113) – одноэтажное **здание столовой** общей площадью 26,0 кв.м, 1970 года постройки, стены бревенчатые, обшиты досками, чердачные перекрытия – деревянные балки, дощатые, обшиты ДВП. Объект расположен на земельном участке площадью 0,0046 га по адресу: Минская обл., г. Червень, ул. Ленинская, д. 49. Срок аренды земельного участка – 50 лет. **Условия использования земельного участка:** возможно изменение в установленном порядке целевого назначения земельного участка и использование земельного участка для целей, определенных Червенским районным исполнительным комитетом. **Подробное извещение** о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» за 1 ноября 2011 г. № 208.

Начальная цена предмета аукциона: 5 729 671 рубль (в т.ч. объект – 5 452 441 рубль, право заключения договора аренды земельного участка – 277 230 рублей). **Размер задатка: 500 000** рублей.

Продавец: Белорусский производственно-торговый концерн лесной, деревообрабатывающей и целлюлозно-бумажной промышленности (г. Минск, ул. К. Маркса, 16, тел. (8017) 2274483), имущество находится в безвозмездном пользовании открытого акционерного общества «Червенский леспромхоз» (Минская обл., г. Червень, ул. Советская, 47, тел.: (801714) 55579, 55240, 55450). **Арендодатель земельного участка:** Червенский районный исполнительный комитет (Минская обл., г. Червень, пл. Свободы, 1, тел. (801714) 55186).

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 310, 312.**

Последний день подачи заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **21 декабря 2011 г. до 12.00. Задаток** для участия в аукционе перечисляется с даты публикации данного извещения **по 21 декабря 2011 г.** включительно.

Информация о предмете аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома **www.minsk-region.gov.by** на странице фонда «Минскоблгосимущество».

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Фонд «Минскоблгосимущество» вправе отказаться от проведения аукционов (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому объекту, выставляемому на аукцион.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: 1. Подписать протокол о результатах аукциона. 2. В течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения исполнительными комитетами), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков. 3. После совершения действий, названных в пункте 2, в течение двух рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

Жилой комплекс со встроенными административными и торговыми помещениями, гаражом-стоянкой по ул. Сторожевская в г. Минске

Застройщик: Общество с ограниченной ответственностью «ТРАЙПЛ», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 17 февраля 2000 г. № 192 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100017108.

Адрес: Республика Беларусь, 220003, г. Минск, пр-т Победителей, д.51, корп.2, пом.15.

Режим работы: понедельник – пятница: с 9.00 до 18.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

ООО «ТРАЙПЛ» имеет большой опыт работы в строительстве, является заказчиком по проектированию и строительству объектов различного назначения, в том числе жилых домов. Функции заказчика осуществляются собственным управлением капитального строительства.

В 2007 году организацией в качестве застройщика (заказчика) введено в эксплуатацию два жилых дома по ул. Радужная, 17, г. Минск (общая площадь 7376,7 м², общее количество квартир: 126) и по ул. Радужная, 19, г. Минск (общая площадь 6581,5 м², общее количество квартир: 96). В 2009 году введен в эксплуатацию жилой дом по ул.Маяковского, 100, г.Минск (общая площадь 14 563 м², общее количество квартир: 220).

Информация о проекте строительства.

Жилой комплекс со встроенными административными и торговыми помещениями, гаражом стоянкой расположен в районе ул. Сторожевской в г. Минске. Строительство данного комплекса является третьим этапом, завершающим формирование жилой застройки вдоль р. Свислочь по ул. Сторожевской.

Границами участка являются с юга и юго-запада ул. Сторожевская, с севера – ул. архитектора Заборского, с востока и юго-востока – дворовая территория существующих жилых домов по ул. М. Богдановича и ул. Сторожевская.

Комплекс решен как продолжение существующего 12-этажного многосекционного жилого дома с частичным повышением застройки, с учетом встроенных объектов до 25 этажей, с террасным падением при приближении к предместью до 7 этажей, с образованием на перепадах многочисленных пентхаусов, раскрытых на р. Свислочь.

Состав помещений: жилая часть – 235 квартир, высота этажа – 3,3 м (в чистоте – 3,0 м), кухни – в общем пространстве с гостиными; встроенные помещения (магазины, кафе, офисные помещения, фитнес-центр, салон красоты) всего – 3276,7 м²; гараж-стоянка на 321 машино-место размещена в 3-х уровнях. Жилая часть объекта, офисы, магазины, стоянки комплексно увязаны между собой с решением инженерной инфраструктуры жизнеобеспечения, за счет технического подполья под большей частью здания.

Жилая часть состоит из восьми разноэтажных секций. Большинство квартир, условно свободной планировки, раскрыты на р. Свислочь, часть квартир на Оперный театр, сквер им. Янки Купалы.

Конструктивная схема здания – монолитный железобетонный каркас с монолитными перекрытиями, диафрагмами жесткости. Фундаменты – монолитная железобетонная плита; армирование вязаной арматурой. Наружные ограждающие конструкции – из ячеистых блоков. Конструкции заполнения окон и витражей – алюминиевые (профиль SHUKO), с двухкамерными стеклопакетами, лоджии – алюминиевые (профиль SHUKO), с одинарным остеклением. Кровля плоская, на отдельных участках скатная из современных кровельных материалов. На отдельных участках плоская кровля эксплуатируемая. Фасады – наружная отделка здания с главного фасада вентилируемая из керамогранита, дворовой фасад – штукатурка по сетке с последующей покраской фасадной краской на основе силиконовых смол.

Отделка жилых помещений не выполняется, за исключением черновой: стены – штукатурка, полы – выравнивающая цементно-песчаная стяжка, потолки – перетирка. Отделка встроенных нежилых помещений, мест общего пользования и благоустройство придомовой территории выполняется согласно проектной документации. Жилой дом будет оборудован всеми современными системами инженерных коммуникаций, включая установку базовой системы «Умный дом».

По проектной документации получены положительные заключения:

- РУП «Главгосстройэкспертиза» от 06.10.2008г. № 2334-5/08;
- Государственной экологической экспертизы от 14.07.08г. № 248;
- Комитета архитектуры и градостроительства от 13.06.08г. № 06-13/102 Ц.

Разрешение на производство строительно-монтажных работ инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г.Минску от 01.12.10г. № 2-209Ж-003/09.

Земельный участок площадью 1,8885 га для строительства и обслуживания жилого дома со встроенной гараж-стоянкой предоставлен ООО «ТРАЙПЛ» во временное пользование сроком до 1 марта 2012 года (решение Мингорисполкома № 3140 от 30.12.2008г). Этим же решением разрешено строительство объекта.

Планируемый срок ввода в эксплуатацию жилой части объекта – I квартал 2012 года.

Генеральным подрядчиком по строительству объекта является ООО «Строительный континент».

Согласно Указу Президента Республики Беларусь от 15.06.2006 года № 396 для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объекта долевого строительства на условиях настоящей декларации предлагаются квартиры №№ 3, 8, 13, 21, 22, 43, 44, 47, 50, 79, 115, 118, 132, 147, 154, 155, 157, 159, 174, 176, 192, 196, 197, 198 и машино-места.

Стоимость одного квадратного метра квартир составляет 3 000 (три тысячи) долларов США.

Стоимость одного машино-места в гараже-стоянке составляет 40 000 (сорок тысяч) долларов США.

Платежи по договорам создания объекта долевого строительства осуществляются с пересчетом долларового эквивалента в белорусские рубли по курсу, установленному Национальным Банком Республики Беларусь на день оплаты. Стоимость 1 кв.м жилого помещения в долларовом эквиваленте (доллар США), является неизменной до окончания исполнения договора.

Цена, определенная настоящей проектной декларацией на указанные в ней объекты долевого строительства, считается действительной по ним до момента опубликования новой проектной декларации.

Состав общего имущества, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода в эксплуатацию объекта: помещения товарищества собственников, места общего пользования, технические помещения.

Ознакомление дольщиков с объектом долевого строительства и условиями заключения договоров на строительство производится **ООО «ТРАЙПЛ»**, расположенным по адресу: г.Минск, пр-т Победителей, д.51, корп.2, пом.15, тел. (8017) 309 21 47.

НІ ГРОШАЙ, НІ «ФЭСТУ»

У Брэсце па вуліцы Шасейнай грамадзянін Польшчы прыпаркаваў машыну.

Менавіта там да яго падышлі людзі ў форме і папрасілі прад'явіць пасведчанне кіроўцы, а таксама дакументы на груз. Грузу аказалася даволі — каля шасці тысяч пачкаў цыгарэт «Фэст» Гродзенскай тытунёвай фабрыкі, а вось дакументаў — ні квіточка. Таму да высвятлення абставін тавар на суму больш за 13 мільёнаў рублёў у госця горада над Бугам канфіскавалі.

А ў ходзе далейшых аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў устанавілі і прадаўца тых цыгарэт — 45-гадовага брастаўчаніна. Высветлілася, што наш суайчыннік справу паставіў на паток. Толькі за апошні час ад незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці ён атрымаў даход у суме каля 131 мільёна рублёў. Заведзена крымінальная справа.

Яна СВЕТАВА.

ЦЫГАРЭТЫ НЕ ПРАПАДУЦЬ

На аўтадарозе Брэст — Дамачава, каля в. Знаменка, супрацоўнікі міліцыі затрымалі кіроўцу прыватнага прадпрыемства, які на аўтамашыне «Фальксваген-Крафтар» перавозіў 60 500 пачак цыгарэт беларускай вытворчасці.

Дакументаў на тавар коштам болей 144 млн рублёў не было. Цыгарэты і машыну канфіскавалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Уладзімір СЫЧЭЎСКІ:

«Сёння нам неабыякавыя грамадская думка, аўтарытэт работніка міліцыі, мера даверу грамадзян»

У Брэсце з роднай мовай наогул цяжка. Так склалася гістарычна. Брэст-Літоўск на ўскрайку Расійскай імперыі быў найперш горадам крэпасці, ваенным плацдармам. Яшчэ раней гэта абумовіла яго трагічную гісторыю. Таго Брэсця, 1000-годдзе якога мы будзем адзначаць менш чым праз восем гадоў, даўно няма. Яго знеслі, спалілі і зруйнавалі амаль два стагоддзі таму, каб на гэтым месцы ўзвесці крэпасць. З дымам пайшлі многія і многія культурныя набыткі прашчураў. Паступова вырастаў новы горад, які пазней, у савецкія часы стаў самым заходнім памежным горадам Савецкага Саюза. Была дакладная арыентацыя на тое, каб чалавек, які перасек мяжу, адчуў, што ён у СССР. Часткова гэта засталося. Уязджаеш у Брэст з боку Еўрасаюза, і цябе вітаюць рэкламна-інфармацыйныя шчыты, шматлікія шыльды і надпісы па-руску. Заўсёды ўплывала на моўную сітуацыю абласнога цэнтра і ваколіц суседства Польшчы, краіны. Ну і галоўнае, што сённяшняе пакаленне дзелавых людзей, якое вырасла, сфарміравалася на новай эканамічнай хвалі, пазіцыянуе сябе аднолькава: большасць новых крам, кавярняў, рэстаранаў называюцца па-руску альбо на замежных мовах. Новыя бізнэсмены не маюць патрэбы ў сваім, беларускім, не разумеюць, што «фішку», брэнд лепш рабіць найперш са свайго, нацыянальнага. Але каб займець такое разуменне, трэба, відавочна, валодаць пэўным узроўнем выхаванасці, адукаванасці, культуры і духоўнасці. Можна яшчэ ўвесці такую моду, зрабіць сваё прэстыжным. А тыя, хто валодае першым, здольны ажыццявіць другое. І тут важны крок кожнага чалавека, яго пазіцыя, яго ўклад і словам, і справай.

У кантэксце сказанага можа падацца дзіўным выбар героя для інтэрв'ю. Больш за тое, прынята лічыць, што людзі ў пагонах найбольш кансерватыўныя ў плане выкарыстання роднай мовы. Але думаць так аказалася памылкай. І якой жа прыемнай памылкай! Уладзімір Сычэўскі можа выступіць на любым афіцыйным мерапрыемстве па-беларуску. Так было на абласных «Дажынках» сёлета ў Бярозе. Уладзімір Васільевіч павіншаваў працаўнікоў вёскі прыгожым, сакавітым родным словам, што выклікала сапраўднае задавальненне і шчырыя ўсмешкі слухачоў.

Генерал-маёр Уладзімір СЫЧЭЎСКІ ўзначальвае Брэсцкае абласное ўпраўленне ўнутраных спраў трэці год. Раней сустракацца не даводзілася, і, збіраючыся на інтэрв'ю, я думала: мабыць, чалавек мае філалагічную ці блізкую да гэтага адукацыю. Бывае ж так, што ў міліцыю прыходзяць і настаўнікі, і прадстаўнікі іншых прафесій. І гэта аказалася памылкай. Вось што расказаў сам Уладзімір Васільевіч:

— Быў у маёй біяграфіі адрэзачак школьнай працы, але вельмі кароткі. Родам я з Лельчыцкага раёна. Пасля васьмігодкі ў роднай вёсцы скончыў Гродзенскі політэхнічны тэхнікум і атрымаў накіраванне ў Бродніцкую васьмігадовую школу Лунінецкага раёна настаўнікам працы і чарчэння. Адтуль пайшоў у армію. А пасля дэмабілізацыі, пачынаючы з 1981 года, амаль тры дзесяцігоддзі з перапынкам на вучобу заняла служба ў органах міліцыі Гродна і Гродзенскай вобласці. Тут прайшоў шлях ад радавога, старшыны да палкоўніка міліцыі. Усю работу пярвічнага звяна нашай службы — райаддзела — адчуваў уласнымі рукамі, душой і сэрцам. Сем гадоў займаўся следствам, узначальваў крымінальны вышук, працаваў у Свіслацкім, кіраваў Ленінскім райаддзелам.

— Адкуль жа павага і любоў да роднай мовы?

— Ад бацькоў... Ад школьнай настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Марыі Дзмітрыеўны Некрашэвіч. Яна навучыла чуць мілагучнасць роднага слова, разумець прыгажосць і прозы, і паэзіі айчынных класікаў. На гэтай аснове, відаць, пазней прыйшлі патрэба чытання, атрыманне задавальнення ад прачытанага. Ну і вялікае значэнне мела тое, што я вучыўся ў беларускай школе. І цяпер памятаю, як пры паступленні ў тэхнікум здаваў уступны экзамен па матэматыцы і даказваў тэарэму па-беларуску. Памятаю і ўсмешку замілавання на твары выкладчыцы, што прымала экзамен.

Падчас работы ў Гродне ў мяне былі добрыя знаёмыя з ліку выкладчыкаў, якія размаўлялі толькі па-беларуску. Камунікацыі з імі давалі патрэбную практыку для падтрымання, так бы мовіць, моўнага тонусу. Цяпер у Брэсце трошкі адчуваецца недахоп гэтага асяродка.

— Стварыць жа такі асяродак у сваім упраўленні вельмі складана?

— Няпроста. Але мы імкнёмся да гэтага. На сваіх святочных мерапрыемствах, урачыстасцях стараемся, каб гучала беларускае слова. А на далейшую перспектыву ставім даволі смелую задачу — правесці, напрыклад, калегію на роднай мове. У сваім упраўленні мы праводзім у жыццё шэраг унутраных праграм — укараняем здаровы лад жыцця, змагаемся з курэннем. Бо, лічу, калі мы даражым аўтарытэтам, прэстыжам работніка міліцыі, то павінны паказваць прыклад насельніцтву, быць трохі наперадзе. Сёння некурэнне — адна з прыкмет цывілізаванасці. І калі зараз паўсюль вядуцца размовы аб магчымых мерах забароны на дым у грамадскіх месцах, то трэба загадзя рыхтавацца да такой работы. Шлях да культуры, здаровага ладу жыцця часам пралягае цераз прымус. І той, хто спрычыніцца да элементаў прымусу, павінен мець на гэта таксама і маральнае права.

— Калі ўжо гаворка зайшла пра культуру, мараль, то, думаю, вы пагодзіцеся з думкай, што вынікам недахопу культуры, выхаванасці, духоўнасці сталі сацыяльна-крымінальныя з'явы апошняга часу. Іх многа. З самых характэрных: у вёсках цяпер часта крыўдзяць старых. Да адзінокай бабулькі можа зайсці, умоўна кажучы, асацыяльны элемент і адабраць грошы, харчы, проста напалохаць. У маёй роднай вёсцы жанчына сталага веку, у якой сусед адбывае другі тэрмін пакарання, сказала, пасутнасці, страшную рэч: «Каб хоць мне памерці, пакуль ён з турмы выйдзе»... З распаўсюджваннем практыкі атрымання крэдытаў вырас цэлы шэраг крэдытных аферыстаў, якія свядома бяруць пазыкі, не збіраючыся плаціць, падстаўляючы тым самым іншых людзей... Шматлікія фінансавыя аферы суайчыннікаў здзіўляюць разнастайнасцю...

— Вядома, так. Кожны этап сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства мае адметную сацыяльна-крымінальную абстаноўку. І тая з'ява, якую вы абазначылі першай, носіць найбольш агідны характар. Вёска старэе, пажылых людзей у сельскай мясцовасці становіцца больш, а маладых, працаздольных — менш. Старыя, адзінокія ўяўляюць сабой самы безабаронны слой грамадства. І часам пажылыя людзі нават баяцца сказаць, што іх нехта пакрыўдзіў.

Ёсць, вядома, пытанні з тымі, хто вяртаецца з месцаў пазбаўлення волі. Пэўная іх частка зусім не рвецца ўладкоўвацца на працу і здабываць у поце хлеб надзённы. Вышэйназваны кантынгент грамадзян мы трымаем пад асаблівым кантролем, ва ўсіх супрацоўнікаў ёсць на гэты конт адпаведныя інструкцыі. Але галоўная крыніца бяды вёсак, якія старэюць, і не толькі іх — п'янства. Вясковыя п'яніцы, людзі, што, не жадаюць працаваць — першыя аматары ўкрасці, падмануць, адабраць гвалтам. Нават калі такіх адзін- два на вёску — гэта загана. Бывае, накіроўваем «самых актыўных» з такіх людзей на нейкі час у лячэбна-працоўныя прафілакторыі. А наогул сродкаў нямнога, каб ізаляваць чалавека, які атручвае жыццё навакольным. І тут даводзіцца канстатаваць, што заканадаўства не заўсёды паспявае за жыццём. Як і ў астатніх прыкладах, прыведзеных вамі.

А што датычыць недахопу культуры, то гэта ўсё на паверхні. У культурнай традыцыі нашага народа хіба былі калі непавага да старэйшых, прывычка красці, лайдачыць, п'янства, хамства? Ніколі, наадварот, усё гэта асуджалася, высмейвалася, выклікала пагарду. На сваім шляху мы згубілі недзе важныя рэчы. Асабліва ясна адчуваеш, калі сутыкешся з праявамі амаль штодзённай рэчаіснасці: напрыклад, ідзеш па вуліцы, насустрач — такая прыгожая юная пара; але ад іх не вее рамантызмам, а сыплецца мат ва ўсе бакі. Непрыгожа гэта і няправільна.

— Калі згубілі нешта важнае, то павінны шукаць.

— Так, і найперш з дапамогай выхавання. Іншага проста не дадзена. Нярэдка апошнім часам бываю ў моладзевых калектывах. Нядаўна сустракаўся са студэнтамі Баранавіцкага ўніверсітэта, гаварылі з імі і пра ўзмацненне мер адказнасці за многія дзеянні, і пра паслабленні ў заканадаўстве. Падчас стасункаў з моладдзю адчуваеш вынікі стыхійнай інфарматызацыі грамадства. Інтэрнэт мае вялікія перавагі, але дае доступ да той інфармацыі, якую лепш спажываць сфарміраванай асобе, а не зусім юнаму чалавеку, нават падлетку. Адсюль пачынаюцца многія праблемы, каша ў галаве. А ў процівагу гэтаму не назіраецца ўмелай і маштабнай прапаганды культурных, духоўных каштоўнасцяў.

Вось самы апошні прыклад. Сёння ў мяне на прыёме была дзяўчына, якая сказала, што хоча працаваць у міліцыі. А чым абумоўлена такое жаданне, патлумачыць не здолела. Пытаю: што яна зрабіла па выхаванні цяжкіх падлеткаў? Можа, была валанцёрам у справе дапамогі састарэлым ці з'яўляецца актывістам моладзевага атрада па ахове парадку? У адказ — маўчанне. Высветлілася, што і зрабіць заўвагу таму, хто смеціць на вуліцы, грашыць брыдкаслоўем таксама пакуль не асмялелася б. Каб так паводзіць сябе, як я кажу, не абавязкова быць і міліцыянерам, гэта простыя рэчы аказаліся б па сілах студэнту альбо маладому спецыялісту. А калі ўжо хочаш звязаць свой лёс з нашай нялёгкай працай, то трэба мець нейкі ўнутраны стрыжань, калі хочаце, рамантычны парыў, а не толькі жаданне атрымаць стабільную работу і стабільную зарплату.

— Ну, калі ахвотныя ідуць адразу да вас, з кадрамі трэба думаць, праблемы няма?

— Наадварот, праблемы апошнім часам назіраюцца. Па-першае, ідзе значны адток маладых людзей яшчэ на першым этапе — маецца на ўвазе медыцынская камісія. У таго, хто з дзяцінства не вёў здаровы лад жыцця, шанцаў трапіць да нас на службу ўсё менш. Гэта няхай ліквідуюць патэнцыяльныя прэтэндэнты. Па-другое, вялікія патрабаванні да супрацоўніка вымушаюць многіх шукаць нешта лягчэйшае. Бывае, у раёнах адчуваецца дэфіцыт участковых інспектараў. Цяпер людзі аддаюць перавагу той рабоце, якая гарантуе стабільныя выхадныя, нармаваны рабочы дзень. Мы пакуль што забяспечыць гэтага сваім супрацоўнікам не можам. Акрамя таго, развіццё грамадства дыктуе ўзросшыя патрабаванні да чалавека на нашай службе. Сёння нам неабыякавыя грамадская думка, аўтарытэт работніка міліцыі, мера даверу грамадзян. А гэта ўсё даецца штодзённай працай, вялікімі намаганнямі. Мы патрабуем ад супрацоўнікаў нефармальных стасункаў з насельніцтвам. Той жа ўчастковы павінен не толькі заходзіць у школу, калі яму распісаны па графіку дзень інфармавання, а быць там заўсёды, як толькі праходзіць міма. Трэба, каб ён стаў цікавы для педкалектыву і каб яму там было цікава знаходзіцца, размаўляць з вучнямі і, магчыма, бачыць вынік сваіх наведванняў. Гэтак жа і работнікаў Дзяржаўтаінспекцыі трэба, каб мы бачылі не толькі на дарогах, але і ў дварах, дзе поўна машын, дзе транспартныя сродкі запаланілі тратуары і дзіцячыя пляцоўкі. Наіўна думаць, што супрацоўнік ДАІ вырашыць праблему адным сваім з'яўленнем, але шукаць вырашэнне разам з прадстаўнікамі вулічных, дамавых камітэтаў, ЖЭСаў і кааператываў, прапаноўваць варыянты вырашэння — яго справа.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

У ЕЎРАСАЮЗ ТРАПІЦЬ ЦЯПЕР ПРАСЦЕЙ

Ужо ў лютым наступнага года ў жыхароў прыгранічных з Латвіяй населеных пунктаў Беларусі з'явіцца магчымасць значна спрасціць працэдуру афармлення дазволу на выезд у гэтую краіну, але на тэрыторыю не далей, чым 50 кіламетраў. Прычым можна будзе значна зэканоміць пры аплаце аналага візы.

У Віцебску падпісалі пратакол аб абмене пісьмовымі паведамленнямі аб выкананні ўнутрыдзяржаўных працэдур, неабходных для ўступлення ў сілу пагаднення аб спрошчаным парадку ўзаемных паездак жыхароў прыгранічных тэрыторый Беларусі і Латвіі. Пагадненне паміж урадамі аб спрошчаным парадку ўзаемных паездак жыхароў прыгранічных тэрыторый Рэспублікі Беларусь і Латвійскай Рэспублікі было падпісана летась. Цяпер у Віцебску адбыўся працяг афармлення міждзяржаўных працэдур.

У Віцебскім аблвыканкаме пратакол падпісалі надзвычайныя паслы дзвюх рэспублік Аляксандр Герасіменка і Міхаіл Папкоўс.

У выніку ўжо зусім хутка (як чакаецца, з 1 лютага 2012 года) жыхарам беларускага памежжа можна будзе наведваць прыгранічныя тэрыторыі Латвіі ў спрошчаным парадку — без візы, па спецыяльным дазволе. Тэрмін дзеяння апошняга — ад аднаго года да пяці. Кошт дазволу — усяго 20 еўра. Ад выплаты збору на аснове ўзаемнасці могуць вызваляцца пенсіянеры, інваліды і дзеці да 18 гадоў. І ён будзе афармляцца ў консульствах жыхарам, якія жывуць у прыгранічных тэрыторыях не менш чым год з мэтай наведвання родных, месцаў пахавання сваякоў, для удзелу ў культурных, спартыўных і іншых мерапрыемствах.

Як адзначыў пасля цырымоніі падпісання адпаведнага пратакола **пасол Беларусі ў Латвіі Аляксандр ГЕРАСІМЕНКА**, у выніку больш за 250 тысяч чалавек (у тым ліку з беларускага боку больш за 70 тысяч чалавек) змогуць атрымаць дазволы на спрошчанае перасячэнне мяжы. Чатыры латвійскія гарады ўваходзяць у «зону» з «зялёным святлом» для беларусаў — Даўгаўпілс, Краслава, Дагда, Зілупе.

Як падкрэсліў **пасол Латвіі ў Беларусі Міхаіл ПАПКОЎС**, існуе дамова праз месяц абмяняцца спісамі жыхароў прыгранічных тэрыторый. Потым спатрэбіцца час для таго, каб тэхнічна дадаткова аснасціць консульства Латвіі ў Віцебску і Беларусі ў Даўгаўпілсе. Менавіта там жыхары прыгранічных тэрыторый будуць атрымліваць дазвол на бязвізавае перасячэнне мяжы. Дазвол латвійскага боку на ўезд будзе ўкладышам у пашпарт, падобным на візу, што цяпер выдаюць.

Устанаўліваецца і пералік адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Беларусі і Латвіі, які вызначае памежную тэрыторыю. У прыватнасці, з беларускага боку — гэта Браслаў, Верхнядзвінск, Міёры, пасёлак Відзы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»

- Оценка оборудования и транспортных средств
- Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- Независимая строительная экспертиза

Извещает о проведении аукциона по продаже имущества Светлогорского районного потребительского общества

№ лота	Наименование объекта	Адрес объектов продажи	Начальная цена продажи, бел. руб.	Сумма задатка, бел. руб.
1	**Склад №4** Здание склада (инв.№942/С-87545), общая площадь 659 кв.м., расположен на земельном участке общей площадью 0,7897 га	г. Светлогорск, ул. Авиационная,2А	250 452 000	25 045 200

Продавец имущества: Светлогорское РАЙПО. Цена указана с НДС. Условия продажи: без условий, вознаграждение за проведение аукциона 5%, шаг аукциона 5%.
Срок подписания договора купли-продажи — в течение 10 (десяти) рабочих дней после подписания протокола о результатах торгов.
Более подробную информацию об условиях и перечне документов для участия в аукционе можно узнать у организатора торгов ГОУ филиала «Центр «Белтехинвентаризация» по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46 и по тел. 8(0232) 75 06 61, 75 06 63 (факс), WWW. @ BTI.by

Срок подачи заявления, внесения задатка	**До 17-00 09 января 2012 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46
Дата, время, место проведения аукциона	**10 января 2012 г. в 11-00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012105618108 в РД №700 «БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509
Условие продажи	Без условий.
Условие пользования	Объекты продаются в собственность.

Дополнительная информация по тел. (0232) 75 06 61, 75 06 63 (факс).

г.Клецк 12 января 2012 года

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ НА ПРАВО ЗАГОТОВКИ И (ИЛИ) ЗАКУПКИ ВИНОГРАДНОЙ УЛИТКИ

№ лота	Территория, на которой предоставляется право на заготовку и (или) закупку	Предмет аукциона	Условия заготовки и (или) закупки	Цена предмета торгов (аукциона) (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расходы по формированию и регистрации (руб.)
1.	Клецкий район	право на заготовку и (или) закупку виноградной улитки	- предоставление права на заготовку и (или) закупку виноградной улитки сроком на пять лет в объемах менее 10000 кг; - согласно научного обоснования Национальной академии наук Беларуси от 05.2010г. лимит на добычу составляет 9651 кг улиток в год.	700 000	350 000	604 800

1. Аукцион состоится **12 января 2012 г. в 11 часов** в здании Клецкого райисполкома по адресу г.Клецк, пл. Маяковского,10.

2. Для участия в аукционе приглашаются юридические лица и индивидуальные предприниматели.

Участнику необходимо подать соответствующее заявление в Клецкий райисполком.

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; копия свидетельства о государственной регистрации; копия Устава; а также представляются: доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, при подаче документов на участие в аукционе уполномоченные лица представляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Клецк, пл. Маяковского, 10, кабинет 312; последний день приема документов 06 января 2012 г. до 11.00. Заключительная регистрация участников 12 января 2012 г. с 10.00 до 10.45. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет 3642207430706 в ЦБУ № 607 г.Клецк филиала № 620, г.Несвиж ОАО «АСБ Беларусбанк» г.Клецка код 523. Получатель — Клецкий райисполком УНП 600198162.

5. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее, чем двумя участниками, если ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер. Если заявка на участие в аукционе подана только одним участником, право на заготовку (или) закупку предоставляется данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

6. Контактные телефоны в Клецке (8 01793), 55934, 50822, 55254.

РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Кобринский инструментальный завод «СИТОМО»

Лот № 1: объект, расположенный по адресу: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Пролетарская, 133:

№	Наименование	Площадь	Описание	Обременение	Земельный участок	Начальная цена с учетом НДС, руб.
1	Здание клуба с инвентарным номером 123/С-22704	854,2 м²	1955 г.п., фундамент – бетонный, стены и перегородки – кирпичные, перекрытия – железобетонные, крыша – шифер, полы – паркетные, плиточные, проемы – простые, отделка – оштукатурено, отопление, водопровод – стальные трубы, канализация – чугунные трубы, электроснабжение – скрытая проводка, радио, телевидение, вентиляция – естественная.	Арендуется частично 1-й этаж площадью 46,4 м² до 2013 года, площадью 74,7 до 2014 года.	Кадастровый № 124350100002003790, площадью 0,1876 га	**890 119 200**

Лот № 2: объект, расположенный по адресу: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Пролетарская, 181А:

№	Наименование	Площадь по техническому паспорту	Описание	Земельный участок	Начальная цена с учетом НДС, руб.
1	Незавершенная строительством подстанция 110/10 кВ Кобрин-Северо-Западная и заходы ВЛ 110 кВ к ней с инвентарным номером 123/U-28541	177,1 м²	Фундамент – железобетонный, стены – железобетонные панели и кирпич, перегородки - кирпичные, перекрытия – железобетонные панели (конструктивные элементы со 100% готовностью). Общий процент готовности строения по техническому паспорту 58%.	Кадастровый № 124350100002003661, площадью 0,8251 га	**139 352 400**

Аукцион состоится **27.12.2011 в 14.00** по адресу: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Пролетарская, 127.

Задаток в размере **3%** начальной цены лота перечисляется на р/с № 3012232130017 в ГОПЕРУ ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, код 739. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни **с 8.30 до 17.30 по 21.12.2011 включительно** по адресу: Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. Заключительная регистрация участников **27.12.2011 с 13.30 до 14.00** по месту проведения аукциона.

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи. Контактное лицо: Зеленко Валерия Валерьевна 8 (01642) 36 001.

Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8 (017) 227 51 21; 8(044) 700 67 44; 8(033) 352 67 98; e-mail: **ino@tut.by**

КУЛЬТУРА НАВЫВАРАТ,

або Як Саюз беларускіх пісьменнікаў рыхтуецца да справаздачнага з'езда

На некаторых інтэрнэт-сайтах напярэдадні з'езда Саюза беларускіх пісьменнікаў, які павінен адбыцца 10 снежня 2011 г., з'явілася інфармацыя пра тое, што старшыня рэвізійнай камісіі СБП, адзін са старэйшых членаў гэтай творчай арганізацыі Васіль Цімафеевіч Якавенка выключаны з яе складу. Матывам выключэння абвешчана яго членства ў паралельным Саюзе пісьменнікаў Беларусі. У сувязі з гэтым лічым неабходным заявіць наступнае. Прычына выключэння В. Якавенкі з'яўляецца надуманай. Пазбаўленне голасу старшыні рэвізійнай камісіі перад справаздачным з'ездам — з'ява ў жыцці грамадскіх арганізацый беспрэцэдэнтная, і адбылася яна зусім па іншых прычынах.

Васіль Якавенка ўжо амаль паўстагоддзя шчыруе на ніве беларускай літаратуры, з'яўляецца на сённяшні дзень адзіным законна абраным старшынёй рэвізійнай камісіі СБП, якая ўскрыла сур'ёзныя арганізацыйныя і фінансавыя парушэнні ў рабоце кіраўніцтва пісьменніцкай арганізацыі, пра што ў друку ўжо паведамлялася (гл. «ЛіМ» за 24 снежня 2010 г.). Аднак Рада СБП прынцыповай ацэнкі ўскрытым фактам і парушэнням фінансавай дысцыпліны з боку старшыні А. Пашкевіча і яго намеснікаў не дала. Наадварот, спрыяла ім і неаднаразова шантажыравала рэвізійную камісію.

Нам відавочна, што цяпер, перад чарговым справаздачна-выбарчым з'ездам СБП, каб пазбавіць В. Якавенку магчымасці выступіць з крытычным дакладам, старшыня СБП і ягоныя намеснікі дамагліся выключэння вядомага літаратара з пісьменніцкай арганізацыі, на што Статут СБП, уласна, не дае ніякіх падстаў. Пры выключэнні Якавенкі прысутнічалі не ўсе сябры Рады. Такім чынам, грамадству прадэманстравана культура навыварат.

У мутнай вадзе добра лавіць рыбу. Кіраўніцтва Саюза беларускіх пісьменнікаў не раз заяўляла ледзь не пра палітычную арыентацыю арганізацыі, а на справе аказалася ў фінансава-карпаратыўным хаўрусе. На вачах у грамадскасці прайшла прыватызацыя пісьменніцкага аб'яднання, кіраўніцтву на развіццё арганізацыі стала напляваць. У гэтай сувязі звернем увагу толькі на адну акалічнасць: кіраўніцтва СБП не выканала пастанову Рады ад 10.07.2008 г. аб стварэнні новага аб'яднання — правапераемніка Беллітфонду, ліквідаванага Вярхоўным Судом. У выніку маёмасныя прэтэнзіі на сродкі ад продажу Дома творчасці «Іслач» не былі заяўлены, і, з-за нядбайства старшыні СБП, пісьменніцкія грошы пералічылі ў бюджэт. Наша сённяшняя перапіска з Генеральнай пракуратурай і Вярхоўным Судом сведчыць аб тым, што грошы Беллітфонду было магчыма атрымаць. Гэта пытанне правасуддзем не закрыта і сёння.

Але ці толькі матэрыяльнымі стратамі вымяраецца шкода, якую нанеслі старшыня і яго намеснікі ўсім беларускім пісьменнікам? Кіраўніцтва СБП вывезла з Дома літаратара і кінула ў вільготнае памяшканне на Іслачы каля сотні партрэтаў пісьменнікаў, класікаў беларускай і савецкай літаратуры. На трывожныя сігналы адтуль, што карціны (і, апроч іх, 2 тысячы падтопленых кніг) гінуць, — не было ніякай рэакцыі. Занепакоены В. Якавенка, ахвяруючы сваімі сродкамі і часам, вывез адтуль і перадаў па акце Лідскаму дзяржаўнаму музею на рэстаўрацыю і захоўванне партрэты пісьменнікаў, а рэдакцыі «Наша слова» — збуцвелыя кнігі. Невядомы сябрам Саюза беларускіх пісьменнікаў і лёс архіва арганізацыі.

На ўсе недахопы ў дзейнасці кіраўніцтва старшыня рэвізійнай камісіі звяртаў своечасовую ўвагу. Ён і зараз прытрымліваецца прынцыповай пазіцыі, што старэйшая пісьменніцкая арганізацыя павінна стаяць на падмурку дэмакратыі і адкрыта служыць народу. У яго два дзясяткі кніг, творчы грунт і аўтарытэт. Такім літаратарам беларускае грамадства, а тым больш СБП, можа толькі ганарыцца.

Мы звяртаемся да ўсіх сяброў Саюза беларускіх пісьменнікаў уважліва разабрацца ў сітуацыі, аднавіць В. Якавенку ў пісьменніцкай арганізацыі і даць заслужаную ацэнку дзейнасці кіраўніцтва СБП.

А што да Саюза пісьменнікаў Беларусі, які ў 2006 годзе адгалінаваўся ад СБП, то і там шмат годных і таленавітых літаратараў, і яны робяць карысную справу. Таму кіраўніцтву СБП не варта пагарджаць ні імі, ні іхняй пісьменніцкай арганізацыяй, ні літаратарамі, якія, зрэшты, не ўваходзяць ні ў адзін з пісьменніцкіх саюзаў.

Віктар ХУРСІК, пісьменнік, выдавец, сябра Рады Саюза беларускіх пісьменнікаў. Эрнест ЯЛУГІН, пісьменнік, нам. старшыні БЕЛЛІТФОНДУ ў 2006 — 2009 гадах. Аляксей РАГУЛЯ, прафесар культуралогіі, літаратуразнаўца, сябра рэвізійнай камісіі Саюза беларускіх пісьменнікаў.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ, РАСПОЛОЖЕННЫХ ВБЛИЗИ ОЗЕРА СЕЛЯВА.

Организатор аукциона: Холопеничский сельский исполнительный комитет, 222024, г.п. Холопеничи, ул. К. Маркса, д. 5, Крупского района, Минской области

№ лота	Кадастровый номер, адрес земельного участка, номер участка	Целевое назначение	Площадь (га)	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения	Расходы, связанные с изготовлением землеустроительных дел (бел. руб.)	Дата и время проведения аукциона	Окончательный срок приема документов
1	Земельный участок с кадастровым номером 623080701101000033, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Большие Хольневичи, участок № 3	Для строительства и обслуживания жилого дома	0,1468	электричество	756 000	75 600 бел. руб., р/с 3604618111004, код 810 филиал № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» УНП 600176988, код платежа 04901, получатель платежа: Холопеничский сельский исполнительный комитет	472 411	06.01.2012 г. в 15.00	02.01.2012 г. до 17.00
2	Земельный участок с кадастровым номером 623086300901000042, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Большие Хольневичи, участок № 25	Для строительства и обслуживания жилого дома	0,1500	электричество	753 840	75 380 бел. руб., р/с 3604618111004, код 810 филиал № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» УНП 600176988, код платежа 04901, получатель платежа: Холопеничский сельский исполнительный комитет	1 239 934	06.01.2012 г. в 15.00	02.01.2012 г. до 17.00
3	Земельный участок с кадастровым номером 623086300901000041, расположенный по адресу: Минская обл., Крупский р-н, д. Большие Хольневичи, участок № 28	Для строительства и обслуживания жилого дома	0,1575	электричество	791 532	79 150 бел. руб., р/с 3604618111004, код 810 филиал № 612 ОАО «АСБ Беларусбанк» УНП 600176988, код платежа 04901, получатель платежа: Холопеничский сельский исполнительный комитет	1 242 838	06.01.2012 г. в 15.00	02.01.2012 г. до 17.00

1. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют, кроме электроснабжения.

2. Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для строительства одноквартирного жилого дома для проведения аукциона на право заключения договора аренды:

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;
- возместить расходы, связанные с проведением аукциона и подготовкой документации, необходимой для его проведения;
- заключить с Холопеничским сельским исполнительным комитетом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка государственную регистрацию права на земельный участок;
- получить в установленном порядке разрешение отдела по архитектуре и строительству Крупского райисполкома на проведение проектно-изыскательных работ и строительство объекта;
- осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

3. Аукцион состоится по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г.п. Холопеничи, ул. К. Маркса, д. 5, Холопеничский сельисполком.

4. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Минская обл., Крупский р-н, г.п. Холопеничи, ул. К. Маркса, д. 5, Холопеничский сельисполком, кабинет № 6.

5. Для участия в аукционе приглашаются граждане и юридические лица. Гражданин, юридическое лицо должно подать заявление об участии в аукционе и подписать соглашение с организатором аукциона. К заявлению прилагается:

- для гражданина — копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина;
- для представителей гражданина — нотариально удостоверенная доверенность;
- для представителей или уполномоченных должностных лиц юридического лица — доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой. Не допускается начало торгов по начальной цене. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участка трижды и объявляет проданным земельный участок, участника аукциона — победителем.

7. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка, выставляемого на аукцион.

8. Возмещение расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, и расходов по подготовке документации, необходимой для его проведения, производится победителем аукциона.

9. **Контактные телефоны: (8 01796) 53 2 43, 53 2 28.**

Расчыняйма святу дзверы,
Кліча зімні карагод!
З даўніх дзён ўсе людзі вераць:
Будзе шчасным новы год.

Вераць — спраўдзяцца жаданні
Ўсе, што зычым між сабой:
Пад усімі абразамі
Людзі просяць за спакой.

Прыгажуняю вяльможнай
Прыйдзе ёлка у жытло —
Каб зімовай ноччу кожны
Бачыў вечнае святло.

Усміхнемся

Дыялогі ў сеціве.

— Ты хутка дадому едзеш?

— Я думаю, што тады, калі дождж перастане. А то ж я разумны, у мяне 2 парасоны. Адзін у машыне. І другі ў машыне...

☺

Першае, што мне трэба будзе, калі ад бацькоў з'еду, — інтэрнэт. Шукаць, як ежу гатаваць.

☺

— Ну як вы там, пасля ўчарашняга, прачнуліся? Піва ў халадзільніку, салата там жа, буду праз дзве гадзіны. Так, зусім забыла: ката не гладзіць, пальцы ў клетку да пацука не сунуць — дзікія!

— Ужо... :(

☺

Я выдаткавала на цябе лепшыя нервы свайго арганізма!

☺

— Чакаю, калі пачнуцца навагоднія зніжкі.

— Дык пачаліся ўжо. Табе зарплату знізілі на 20%.

☺

Жонка села на дыету — пахудзеў на тры кілаграмы.

Сканворд

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДМКАЗЫ

Па гарызанталі: Скальпель. Кедыч. Адрэна. Шаўк. Тэрм. Ар-рыка. Штрэк. Горн. Кат. Акр. Пост. Цяга. Арк. Дака. Разан. Дэлта-Бунін. Абора. Разан. Дэлта-мат. Іран. Іна. Код. Гатафон. Амур. Турак. Атара. Лад. Атам. Бронтэр.

Па вертыкалі: Гравюлік. Шпрыц. Кара. Банк. Бурка. Агарод. Оптыка. Кар. Рэйд. Сакэ. Кран. Атака. Антык. Хамут. Нож. Кадр. Шэпт. Літ. Дуга. Растан. Млф. Кіяно. Банка. Кі. Хан. Танометр.

Факт

ЛЕПШ ТРЭБА ФІЗІКУ ВЕДАЦЬ

Вучань 8-га класа Побалаўскай сярэдняй школы трапіў у рэанімацыйнае аддзяленне Рагачоўскай бальніцы з папярэднім дыягназам «атручванне ртуццю». Як расказалі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, 13-гадовы хлопец паведаміў, што напярэдадні вымяраў тэмпературу ртутным тэрмометрам і выпадкова выпусціў яго ў імбрычак з кіпенем. Выратавальнікі выказалі меркаванне, што, хутчэй за ўсё, юнак наўмысна «павышаў» тэмпературу ці то над парам, ці то непасрэдна ў кіпені. Справа ў тым, што ртуць пасля моцнага награвання імгненна разрывае шкло. Што, верагодна, і адбылося. Тэрмометр разбіўся, і школьнік выліў змесціва імбрычка ў каналізацыю, але маці пра гэта не паведаміў. Раніцай сям'я піла чай, пасля чаго маці выявіла на дне кропелькі ртуці. Хлапчук быў вымушаны расказаць аб тым, што адбылося напярэдадні. Маці адразу ж звярнулася да медыкаў. Як паведаміў галоўны ўрач Рагачоўскай раённай бальніцы Алег Хількевіч, ніякага атручвання ртуццю ў школьніка няма, ён хворы выключна на вострую рэспіраторную інфекцыю. Ад іншых каментарыяў кіраўнік лячэбнай установы ўстрымаўся.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Сёння

Месяц

Поўня 10 снежня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.13	16.49	7.36
Віцебск —	9.09	16.31	7.22
Магілёў —	9.03	16.39	7.36
Гомель —	8.51	16.43	7.52
Гродна —	9.27	17.05	7.38
Брэст —	9.19	17.14	7.55

Імяніны

Пр. *Кацярыны, Парфірыя, Сямёна.*

К. *Лілії, Марыі, Амбражэя, Марціна, Тодара.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Надвор'е на заўтра



Дзве даты

7 снежня

1862 год — на тэрыторыі Беларусі пракладзена першага чыгуначнага лінія Парэчча—Гродна як частка Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі.

1941 год — японскае авіяноснае злучэнне пад камандаваннем адмірала Ямамота Усіроку нанесла шэраг паслядоўных удараў па амерыканскіх караблях, аэрадромах і берагавых батарэях, размешчаных на ваенна-марской базе Пёрл-Харбар на Гавайскіх астравах. Да 10 гадзін раніцы амерыканскі флот на Ціхім акіяне фактычна перастаў існаваць. Калі да пачатку вайны суадносіны баявой моцы амерыканскага і японскага флотаў былі дзесяць да сямі з паловай, то зараз яны, па меншай меры ў буйных караблях, змяніліся ў карысць японскіх ВМС. Налёт на Пёрл-Харбар паслужыў падставай для ўступлення ЗША ў Другую сусветную вайну.

Цытата дня:

«Чалавек без цвёрдых правіл амаль заўсёды пазбаўлены і характару: будзь у яго характар, ён адчуў бы, як яму неабходныя правілы».

Нікала Шамфор (1741—1794), французскі пісьменнік-мараліст.

РАБІ, ЯК Я

Кажуць, італьянцы пад Новы год маюць звычку пазбаўляцца ад старых рэчаў: проста выкідваюць іх на вуліцу — праз вокны. Так што 31 снежня па тратуарах там лепей не хадзіць: ёсць верагоднасць нешта «злавіць» — на сваю галаву.

Наш люд, як вядома, са старым парываць не хоча. Сябра Задорнава, памятаеце, у сваёй лоджыі адну лыжу трымаў. «Навошта?» — спытаў у яго гумарыст. — «Ды на ўсякі выпадак», — пачуў у адказ.

А ён — ну згадзіцеся — можа ж надарыцца, калі чалавек, напрыклад, без нагі застанецца і на лыжах пакатацца надумае...

Мая знаёмая не такая. Яна вырашыла, як тыя італьянцы, усё непатрэбнае выкінуць. Перабрала, прынамсі, свой гардэроб (атрымаліся аж два мяхі (бульбяныя) лішняга) і хацела выставіць іх на вуліцу — каму трэба, той забярэ...

У апошні момант перадумала: шкада неяк стала, вырашыла, як той дзядзька з лыжай: «А раптам нешта спатрэбіцца?».

Значыць, мяхі тыя трэба недзе прыхаваць? А дзе? Найлепшае месца, напэўна, у бацькоў: яны непадалёку жывуць, ва ўласным доме. Трэба толькі занесці. А вось як? Не, мяшкі не сказаць каб цяжкія. Але ж гарадок невялікі, а жанчына працуе настаўніцай. Не да твару, як быццам, з вялікімі клункамі па вуліцах хадзіць. Таму «аперацыю» па пераносе яна запланавала на позні вечар альбо нават ноч.

І вось яна наступіла. Падхапіла жанчына клункі, узваліла на плечы — пайшла да бацькоўскай хаты. Маршрут прадумала загадзя: хоць і даўжэйшы крыху, але самы бязлюдны, без ліхтароў.

Раз-пораз яна азіралася яшчэ, каб ніхто не ўбачыў.

І праз вуліцу ўжо, лічы, перайшла, на другім баку была... Але перавесці дух не паспела: побач аўтамабіль спыніўся, два міліцыянеры выскачылі.

— Стойце! — крычаць.

Мусіла стаць, не ўцякаць жа ад прадстаўнікоў улады? Тым больш ні сэнсу, ні прычын на тое няма.

— Чые мяхі? — цікавяцца законнікі.

— Мае.

— Што ў іх?

— Старое адзенне, лахманы...

— Куды несяце?

Заўпарцілася было, спытала: якая ім справа? Прыгразілі завезці ў аддзел.

Вось толькі гэтага ёй не хапала! Развязала мяшок, выцягнула верхнюю рэч. Як на тое ліха — куртку, амаль новую!

— Нічога сабе — лахманы?! — згледзеўшы яе, зазначыла міліцыя. — Паказвайце астатняе.

А жанчыне ж крыўдна: божыцца, што рэчы яе, уласныя (гардэроб перабрала), што працуе настаўніцай і таму пераносіць іх ноччу...

Карацей, паразумеліся неяк, адпусцілі кабету. Але ж цяпер яна цвёрда вырашыла, што будзе жыць па-італьянску — гэта значыць, усё непатрэбнае будзе выкідваць. Праз вокны ці як, не ведаю.

Валерый ГАЎРЫШ,

г. Чавусы.

УСІМ ПУДЗІЛАМ ПУДЗІЛА!

Колькі разоў даводзілася чуць ад гараджан, што сяляне лепей жывуць, што ў іх усё сваё. А вось як яно ім даецца, думаць не хочацца. Між тым, у вяскоўцаў клопат на клопаце: вясной усё пасеяць, летам — не раз прапаловаць, жука на бульбе патравіць, ад фітафторы ўраджай зберагчы... Увосень таксама не лягчэй, бо перш чым усё сабраць ды спарадкаваць, трэба з гарода варанню ды дзікіх кабаноў адпудзіць. І калі ў іншых выпадках чалавеку можа дапамагчы хімія, то на гэтых «налётчыкаў» проста ўправы не знайсці! Хіба што пудзілы недзе паставіць у рост чалавека.

Наколькі яны абараняюць, не ведаю, а вось што напужаць могуць...

Неяк у сярэдзіне зімы, па першаснежжы мы з маладым кіроўцам ехалі на легкавушцы дадому. Толькі звярнулі ў лес — насустрач куляй вылятае аўто. Прычым на пад'ездзе яшчэ выключае ўсё — і фары, і габарыты. Так што мы нічагуткі не ўгледзелі — ні колеру машыны, ні маркі, ні нават таго, у які бок прашмыгнула.

— Звар'яцелы, ці што? — паспеў сказаць мой кіроўца і тут жа... даў па тармазах. Крыкнуў: — Там чалавек ляжыць!.. Мусіць, тая сустрэчная збіла?

Пахаладзеўшы ад жаху, мы абагнулі месца здарэння, спыніліся. Побач тут жа спыніліся яшчэ тры машыны. У тым ліку фура з расійскімі нумарамі. Кіроўца яе, мужчына досыць сталага веку, вылез з кабіны, смела, як падалося, рушыў да месца трагедыі. Мы, нясмелыя, не міргаючы сачылі за тым, як ён ідзе, як прысядае над тым, што чарнее на асфальце, як рэзка ўстае... Думалі, каб зняць шапку, а ён — не: адвёў нагу і... садане. Па... нябожчыку?! Мы знямелі.

— Да не человек это! — закрычаў мужчына. — Чучело кто-то бросил!

Камень з душы зваліўся. Хоць не адразу.

Крыху пакурыўшы і пагаманіўшы, кіроўцы, тое, што нагнала на ўсіх столькі жаху, сцягнулі на ўзбочыну. Машыны раз'ехаліся. А вось выпадак з нейчым дурным свавольствам і па сённяшні дзень у памяці. Нашай. Што ўжо казаць пра кіроўцу, які з месца «аварыі» ўцёк?

Ніна БУРКО,

г. Беразіно.

ЮШКА ДЛЯ АДЗІНАЙ

Здалёку пачну...

То збіралася неяк я ў людзі — прычым не ў абы-якія і не абы-куды: у саменькую нашу сталіцу!..

Яе ж (так думала) хоць нечым ды трэба ўразіць! А чым, едучы з Дняпра? Ну вядома ж рыбай, бо колькі ні распавядай, які на смак той жэрах (ухвалены, да слова, самім Караткевічам!) — у роце саладзей не стане...

Прыйшлося матнуцца да блізкага прыяцеля: у Лучыне ён, мусіць, самы знаны рыбак!.. Хоць і іншыя тут не зломкі — умеюць і рыбы злавіць, і юшку зварыць.

Наконт яе завядзёнка ў нас такая: перш-наперш распальваецца вогнішча, каб угарэлася, пакуль рыба наловіцца. Потым яна, свежанькая, «паэтапна» апускаецца ў казан — дзве порцыі драбнаты (для навару), порцыя буйной. Найлепей, вядома ж, язя. Не ведаю, як дзе, а ў нас кажуць: «Што ў багатага ў клеці, тое ў язя ў галаве». І галаву тую разбіраюць да апошняй костачкі...

Што яшчэ робяць, каб юшка смачнейшая была і не ўзнікла непажаданых наступстваў (бо рыба ж — справа далікатная) — ліюць у казан гарэлку...

То рыбак не без рыбы: разжылася я на лешчыка, на сома, на двухкілаграмовага шчупака і, што асабліва радасна было, на такога ж жэраха (у нас яго «бялёснай» завуць. І Караткевіч так называў)!

На радасцях пасядзелі з прыяцелем — пагутарылі. Ён, між іншым, гісторыю сваёй жаніцьбы распавёў.

Некалі, значыць, моладзь у нас, як кажуць цяпер, «тусавалася», сваімі раёнамі: асобна «шляханцы», асобна «канчане», «слабадскія», «зароўшчынскія»...

Прыяцель жа мой — з «дняпроўскіх». І ў той вечар яны, чалавек пад трыццаць хлопцаў і дзяўчат, на Гары збіраліся, на высокім беразе Дняпра. Зладзілі там вогнішча, хуценька паднялі рыбы, сталі варыць юшку. Як і належыць, напрыканцы «абясшкодзілі» яе (гарэлкі ўлілі — не пашкадаваўшы...).

А прыяцелю дзяўчына адна падабалася. Ён да яе, — ну як у вядомай песні: «...и так, и этак, со словами и без слов»... Яна ж да яго... Ніяк.

Іншы пры такім раскладзе мо і адступіўся б, а гэты... І хацеў бы — дык рады не дасць. Як магнітам прыцягнула і не адпускае: побач трымаецца, слугуе ёй на гэнай Гары, дагаджае: згодна з рытуалам — «грамульку» гарэлкі (болей дзяўчаты тады не пілі), чарпачок юшкі... А трэба сказаць, што атрымалася яна — ну проста «адпад»! Дабаўкі? Ды з дарагою душой! Яшчэ крыху? Ды калі ласачка!...

Мусіць, праўду кажуць: не бывае непрыгожых... хлопцаў, бывае мала гарэлкі ў... юшцы. Бо той маладзён, што яе падліваў, падаўся дзяўчыне такім цікавым, такім прыгожым і разумным... Усе астатнія — побач не стаялі!..

У той вечар ён праводзіў яе дадому. І вось што цікава: да той юшкі, можа, тысячу слоў пяшчотных сказаў — вынік нулявы быў. А вось пасля (з той грамулькай ды «кілаграмулькай», што ў юшку ўлілі) — ну такі ён ёй любы стаў, што ў хуткім часе вяселлейка згулялі!

Трэба зазначыць, што жывуць з таго часу — «як ціхае лета» (так у нас кажуць): ён сапраўдны мужчына і гаспадар, яна — сама дабрыня і гасціннасць. Двое сыноў у іх — прыгожых. І ва ўсіх адносінах! Адзін ужо атрымаў адукацыю і падарыў бацькам першую ўнучку. Другі — яшчэ вучыцца. І ў вольны ад заняткаў час ловіць рыбу...

Каб некалі, можа, зладзіць юшку.

Для той, што стане адзінай.

Соф'я КУСЯНКОВА,

в. Лучын, Рагачоўскі раён.

ЧАЛАВЕК З ПАДПОЛЛЯ

Адразу пасля вайны ў нашу вёску прыбіўся хлопец, Іван — прыгожы, усмешлівы, ды яшчэ і з галавой, з рукамі...

Многія дзеўкі сохлі па ім. Але ж ён, як і належыць, выбраў адну — маленькую, зграбненькую прыгажуню Сонечку. Згулялі яны вяселле, пабудавалі хату, нарадзілі дзяцей. Ганарылася Сонечка сваім Іванам: добрым мужам ён стаў, добрым бацькам. І ў брыгадзірах ужо хадзіў. Але ж з гадамі...

Праўду кажуць: палезла чалавеку сівізна ў бараду, а чорт — у галаву: перастаў кіраваць сабою, клюнуў на жаночую ўвагу — стаў захаджваць да ўдавіцы Ліпачкі. Праўда, цішком, як лічыў, крадком. Аднак у вёсцы хіба тое ўтоіш?

Дазналася Сонечка пра мужаву здраду. Вядома ж, нудзіцца стала, аднак мужа ні разу не ўпікнула: выгляд рабіла, што верыць усім яго казкам пра затрымкі ў начальства, на працы ды пра чаркі з сябрамі.

Але ж тут неяк прыязджаюць дамоў ужо падрослыя іх сыны. Бачаць, вочы ў маці на мокрым месцы, а бацькі дома няма — не начаваў.

Усе трое выйшлі яны на вуліцу, пастаялі там, пагаварылі ды рушылі да той удавы.

На шчасце, яна іх здалёку згледзела, крыкнула Івану:

— Хавайся! Твае хлопцы ідуць.

Той галавою круціць — куды хаваць?

Яна люк у падлозе на сябе раз — і штурхель яго ў падполле...

Закрыла следам і нават дываноч на масніцы ўскінула.

А хлопцы на парозе ўжо, кажуць:

— Добрай раніцы, цётка Алімпіяда. Ці не тут наш бацька?

— Не... Тут нікога няма, — адказвае тая.

— Але ж людзі ў вёсцы кажуць, што заходзіць ён. І нават начуе, — зазначыў большы Іванаў сын.

— Хлусяць, — падціснула губы жанчына. — Ведама ж: на ўдаву і лапаць брэша... Няпраўда ўсё!

— І тое, што вы чарку бераце? — удакладніў Іванаў малодшы, убачыўшы на стале два кілішкі.

— Гэта бывае... Часам, — не адпіралася цётка.

— І курыць ужо сталі? — папыталіся сыны, убачыўшы ў попельніцы гару недакуркаў.

— Бывае, хлопчыкі... Куру — зрэдку... Яно ж ад гора, ад адзіноты — вы не ведаеце — яшчэ і не тое зробіш...

— Нават у скокі кінешся? — усміхнуся трэці з сыноў, убачыўшы скамечаны дыванок на тым люку.

— Ну, — уздыхнула, зачырванеўшыся, Ліпа.

— Ну то прабачце нас. Мусіць, дарэмна мы людзям паверылі?

Хлопцы колькі хвілін пасядзелі яшчэ ў хаце, пастаялі каля парога, паглядзелі на вешалку, дзе вісела бацькава тужурка, але ж да пошукаў яго самога апускацца не сталі. Адвіталіся, рушылі дадому.

Небяспека, як быццам, мінула: Ліпа адкрыла люк у падполле, Іване, ледзьве жывы, выпаўз.

Што ён перажыў там, што перадумаў, можна толькі здагадвацца, бо болей яго Сонечка ніколі не плакала. Дарогу да Алімпіяды ён забыў. Як, дарэчы, і да іншых жанчын, што гатовы былі адчыніць яму дзверы.

Дзіна ДУБАДЗЕЛАВА,

в. Леніна, Добрушскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

У ПІНСКУ ГАРЭЛА ПІЛАРАМА, У СМАРГОНІ — ЦЭХ

За адзін дзень падраздзяленням МНС давялося ліквідаваць пажары ў будынках, якія не эксплуатаваліся. Такія здарэнні адбыліся ў Пінску і Смаргоні.

Напачатку пра пажар у будынку піларамы ААТ «Пінскі камбінат будаўнічай індустрыі» пажарным паведаміў відавочца. Адбылося гэта а палове пятай гадзіны вечара. Частка даху будынка была ахопленая агнём, калі першыя падраздзяленні МНС прыбылі на месца. Полымя знішчыла дах на плошчы 20 квадратных метраў, драўляны насціл на плошчы 60 «квадратаў», пашкодзіла распіловачны станок. Будынак не быў электрафікаваны, не эксплуатаваўся з 2007 года. Мяркуецца, што пажар адбыўся з-за парушэння проціпажарных патрабаванняў пры правядзенні агнявых работ: рабочыя прадпрыемства рэзалі трубы аўтагенам.

А амаль у 21 гадзіну па лініі «101» патэлефанаваў вартаўнік Смаргонскага камбіната бытавога абслугоўвання. Ён распавёў пра пажар у дрэваапрацоўчым цэху. Аднапавярховы будынак 1958 года пабудовы, як і ў першым выпадку, не эксплуатаваўся з 2007 года. Тэхналагічнага абсталявання ў ім не было. Калі пажарныя прыбылі на месца, унутры цэха гарэла пілаванне на плошчы 20 квадратных метраў, на плошчы 30 «квадратаў» — дах і перакрыцці. Мяркуецца, што пажар адбыўся з-за кароткага замыкання сілавога транзітнага кабеля ў электрашчыце. На шчасце, у абодвух выпадках ніхто не пацярпеў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СЛУЖБОВЫ САБАКА ГАРЭЛКУ ЗНАЙШОЎ

У Браслаўскі раённы аддзел унутраных спраў паведамілі, што а дзевятай гадзіне вечара ў гандлёвай зале крамы мужчына з прылаўка ўкраў скрынку гарэлкі агульным коштам больш за 270 тысяч рублёў. Міліцыянеры раённага аддзела Дэпартамента аховы з прымяненнем службовага сабакі «выйшлі на след» злодзея. Аказалася, што выпіць на халяву пажадаў грамадзянін 1964 года нараджэння. Ды не паспеў. Украдзеная гарэлка канфіскавана. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АБЯРЭГ І ЛЕКАВЫ СРОДАК

18-19 студзеня ўся вада, якая нас акружае і жывіць, раптам становіцца «пасярэбранай» настолькі, што можа захоўваць свае якасці на працягу ўсяго года. А некаторыя людзі сцвярджаюць, што «ярданьскую» ваду можна спажываць нават на працягу трох гадоў.

- Асвячонай вадой можна было «адпаіць» смяротна хворых людзей, вылечыць шматлікія хваробы, асабліва энергетычныя — сурокі, падзіў, пярэпалах.
- Ёю асвячалі хату і ўсе гаспадарчыя пабудовы, выкарыстоўвалі падчас закладвання падмурка новага дома.
- Дзяўчаты варажылі на ёй, каб даведацца аб сваёй будучыні.
- Святую ваду выкарыстоўвалі падчас сямейна-родавых абрадаў. Яе дабаўлялі ў купель падчас першага рытуальнага купання дзіцяці; жанчына-парадзіха крапіла ёю грудзі перад першым кармленнем нованароджанага.
- Святой вадой пырскалі на маладых перад тым, як адправіць іх пад вянец; сват абавязкова асвячаў «ярданьскай» вадой месца за сталом, дзе будуць сядзець маладыя на працягу ўсяго вяселля.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Дарагую і любую **Алену Іосіфаўну ТАРАСЕВІЧ** з Мінска віншуем **з юбілеем**!

Жадаем табе, родная, моцнага здароўя, шчасця, бадзёрага настрою, сямейнага дабрабыту. А таксама

Не ведаць стомленасці, быць патрэбнай
На працы, і ў сям'і, і сваякам.
Ззяць, як высокай пробы срэбра
І непадуладнай быць сваім гадам.

Матуля, муж, дзеці, унукі і ўся вялікая радня.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пра сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 5838. Нумар падпісаны ў 19.30 6 снежня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12